

Зборнік гэты прашу лічыць працягам той шчырай размовы з жыццём, з Табою, дарагі чытач, якую і я пачаў задоўга да з'яўлення сваёй першай кнігі.

Некалькі новых старонак роздуму, хвалявання, якія і радасна і трывожна паведамляюць другому...

Замалёўкі дзіцячага свету, уключаныя ў зборнік не без пэўнага вагання, гэта жменька тых «пырскаў сонца», якія хочацца і браць сабе, і аддаваць сябрам, як нейкі цудадзейны сродак няспыннага абнаўлення душы самай высокай і сама чыстай паэзіяй.

Янка Брыль

ПРАЦЯГ РАЗМОВЫ

АПАВЯДАННІ,
ЗАМАЛЁЎКІ,
НАРЫСЫ

Дзяржаўнае выдавецтва БССР
Рэдакцыя мастацкай літаратуры
Мінск. 1962

1

СЦЕЖКА-ДАРОЖКА

Ц. Г. Дуднікаву

Снег толькі што пайшоў, ціхі і спорны, калі яна пачыналася, белая сцежка. Пачаў яе слядамі сваіх ботаў гаспадар. Сляды тыя трымаліся нядоўга, іх зацярушвала дрыгатлівая, густая мякката, што безупынна і ласкава асядала на зямлю. Зайшоўшы ад хлява ў гумно, гаспадар вяртаўся адтуль, нёс каню, зноў сцелючы на снезе след. Потым пайшоў яшчэ раз, прынесці карове, і зноў вяртаўся, а след яго ніяк не рабіўся сцежкаю.

Толькі падвечар, калі той снег, нарэшце, нацешыўся, гаспадар зноў двойчы прашнураваў з хлява ў гумно і назад, і ўжо тады яна, сцежка, стала прыкметная.

Гаспадар быў малады. Калі ён ішоў з гумна, на гэта праз акно іх хаты глядзелі яго старая маці і маленькая дачка. Дзяўчынка ў ніцяных лапціках стаяла на лаве

і, перавешваючыся цераз бабуліну руку, час ад часу ўпіралася лобікам у запацелую шыбу. І ўсё гудзела штосьці, весела і заклапочана. Старая слухала, як пад рукой яе тукае маленькае сэрца, і гаварыла:

— А вунь, Любачка, наш бацька ідзе! А вунь!..

Нявестка сядзела на прасніцы, трохі воддаль ад таго акна. Але яна і так усё бачыла — што ў хаце, што і за акном. Бачыла, чула і ціха ўсміхалася. І ўсё, нягледзячы на прыцемак, завіхалася прасці, нібы толькі што ў смак увайшла.

Калі сын старое, Шурка Іванішын, быў малады, дык нявестка Жэня — зусім маладзенькая. Яна прыйшла ў гэтую хату два гады таму назад, яшчэ, здаецца, па-дзіцячаму румянай дзяўчынкай, і вельмі саромелася свякрові...

Пра Іваніху нават і ў Жэнінай, няблізкай вёсцы гаварылі, што баба яна — суровая. Рана, яшчэ ў тую, «мікалаеўскую», вайну аўдавеўшы, сама і гаспадарыла баба, сама і дзяцей гадавала, адмовіўшыся ад двух ці ажно трох прымакоў. І дачок тым часам абедзвюх па-людску выдала, і сына ажаніла, найменшага. А сама, глядзі, яшчэ і цяпер справілася б і не з адной, і не з адным — і за кроснамі, і за плугам. Толькі

што здароўя не хапіла на ўвесь век — ужо гадоў некалькі накульгвала Іваніха ад расшырэння вен, і чым далей, тым горш. Ды цяпер ужо ёй што — хочаш, дык трохі тупай па хаце, а не, дык цёплай печы пільнуйся. Ды на табе, як усім добрым людзям, найлепшы падарунак на старасць — унучку.

Жэня спачатку так саромелася і сапраўды суровай з выгляду Іваніхі, што прынясе тыя разы вядро вады, паставіць, а сама апусціць рукі ды пытаецца:

— А што цяпер рабіць?

— Сядзь, ткаля, ды пасядзі, што ж ты будзеш рабіць,— гаварыла старая.

І маладзічка, бывала, сапраўды прысядзе на лаве і пасядзіць. Нядоўга. Бо зноў работа нейкая знойдзецца. Зробіць і тое, і зноў пытаецца:

— А што цяпер рабіць?

Але патроху прывыкла Жэня да чужое хаты, дзе пачалося яе патаемнае, сарамлівае шчасце, дзе прыйшлі пасля салодкая трывога чакання, страшная ноч пакут і Любачка, без якое — ну, невядома проста, як яна раней і жыла!.. Прывыкла і да свякрові. Бо яна толькі так, пакуль яе добра не ведаеш, здаецца злоснаю. Рабілі яны ў хаце ўсё звычайна

удзвех, і свякроў паказвала нявестцы многае, чаго яе не паспела навучыць маці. Праўда, пакажа, а як не хутка пяроймеш, дык і пабурчыць, не без таго. Аднак, калі яна, Жэня, пачала хадзіць Любачкай, калі ёй многае пачало здавацца цяжэйшым, старая часцей і неяк інačай стала гаварыць ёй:

— Ціха, дзеткі мае, памалей. А гэта — і зусім ужо не для цябе.— І яна прыкрыквала на Шурку: — Эй ты, бацька! Вады пайдзі прынясі. Два вядры.

А выйдзе ён, дык яна нават і такое:

— Ты глядзі цяпер,— кажа,— асцерагайся. А яму, здаравілу такому, нічога не зробіцца. Ён і цабрамі вады той мог бы прынесці!.. Мужыку, дзеткі, не трэба лішне патураць, а то прывучыш, дык і будзе за цябе хавацца. Хопіць бабе і так. За два вякі і то ўсяго не пераробіш...

Так спакваля ды непрыкметна пачалася іх дружба. Калі ж нарадзілася Любачка і свякроў узялася вучыць маладую матулю, як і купаць, і спавіваць, і карміць, і лячыць іх непадзельнае шчасце, Жэня ўжо не толькі па закону называла Іваніху найдаражэйшым словам — мама, а часам нават ледзь-ледзь не таксама шчыра, як і родную маці, што жыла, дарэчы, за сем кіламетраў

і, абкідаўшыся дзетварой, прыходзіла не вельмі часта.

Яшчэ, здаецца, больш непрыкметна, чым дружба са свякроўю, прыйшло да Жэні другое — жаночая сталасць. Ды ўжо не спаквалю, як тая дружба, а пасля пераломнай, вялікай у яе жыцці падзеі. З нараджэннем Любачкі ў душы маладзіцы адбылося нешта такое, што назусім узаконіла яе пераход у мужаву хату, што дало ёй поўнае права лічыць сябе, нягледзячы на няпоўныя дваццаць гадоў, гаспадыняй.

Кахаць свайго Шурку яна і цяпер кахала не менш, вядома, чым раней, аднак — ужо трошкі інакш. Нітка ўжо не проста ішла за іголкай — яна адчула, што і іголка ад яе цяпер нідзе не дзенецца. І ўжо часам можна было пачуць, як нітка патузвала:

— Ну і што там з гэтай кнігай рассеўся? Дроў сушэйшых пайдзі прынясі!..

І чым далей, тым больш упэўнена.

Шурка, праўда, быў не з тых мужчын, што лёгка паддаюцца. Ён мог і паслухацца лішні раз, і пасмяяцца, пакуль гэта ў Жэні выглядала пацешна ды справядліва; аднак, калі яна, асмялеўшы, дазваляла сабе другі раз вякнуць зусім лішняе — ён ёй напамінаў пра розніцу ў правах і абавязках ніткі і іголкі. Разоў колькі яны ўжо і пасварылі-

ся трохі, нават і не гаварылі па некалькі дзён. Затое мірыцца было вельмі добра!.. Словам, жылі пакуль што, як добрыя людзі.

Адчуўшы сталасць, Жэня зірнула трохі іншым вокам і на свякроў. Маладзіца ўбачыла, што яна амаль зусім не баіцца Іваніхі, толькі шануе яе і нават, здаецца, любіць. А ўсё ж хацелася б, з кожным днём больш, самой быць гаспадыняй печы, хаты, нават гаспадаркі...

Ды Іваніха, хоць і ў гадах ужо, і нямоглая, сама яшчэ трымала лейцы — коратка і моцна.

І Жэня адчувала гэта даволі часта, толькі ў далёкай мары бачачы сябе самую поўнай гаспадыняй... І ў думках нават, вядома, не носячы якога-небудзь ліха супроць бабулі свае Любачкі, Шуркавай мамы і добрай, хоць і суровай, збоку гледзячы, жанчыны.

Усё было б зрэшты — божа мой! — гэтак добра ў іх хаце, каб не гэтая праклятая вайна...

Праўда, яны яе яшчэ не бачылі, як другія. Шурку ўзяць у Чырвоную Армію не паспелі. Як толькі аб’явілі, што вайна, мужчыны і хлопцы з іх Клёніч пайшлі ў ваенкамат, адтуль — на станцыю. Але яе ўжо

там разбамбілі, і немцы вось-вось, і парадку не было ніякага, і ўсе вярнуліся дахаты. Немцы ішлі ажно некалькі дзён, але Клянічы, хоць і блізенька ад гасцінца, уцалелі. І самі пакуль што жывыя.

Гора таму, чые пайшлі перад вайной у армію, неўзабаве пасля таго, як стала і тут савецкая ўлада. А некаторыя хлопцы яшчэ і з панскага войска назад не прыйшлі. Другія людзі плачуць, не ведаючы пра сваіх: ці жывыя яшчэ, ці ўжо не — хто даўно, а хто толькі што...

У мястэчку, дзе быў сельсавет, і ў раённым горадзе — падумаць толькі страхоцце! — яшчэ з восені пастралялі ўсіх яўрэяў. І з Ганчароў, і з Горак, і з Капуснікаў пабралі тых, што былі пры панах падпольшчыкамі, а потым актывістамі. І мужчын ды хлопцаў пабралі, і дзяўчат, і жанчын ад маленькіх дзяцей. Пахапалі знячэўку і, кажуць, нават і не стралялі іх, а галовы ім шаблямі seклі. Вучыліся паліцаі, як гэта робіцца...

Многа ўжо іх развялося, сабакаў!.. Спачатку злыдні ўсякія самі да немцаў пайшлі, а пасля пачалі і іншых браць — сілаю.

І падумаць нават страшна, што і да Шуркі могуць прычапіцца...

...Учора толькі выпаў снег, а сёння ўжо

мужчын з усіх Клёніч пагналі ў лес, па дровы для паліцэйскай камендатуры. Наляцелі, ліха на іх, цэлаю зграяй. Солтыс яшчэ з вечара заказаў, і Шурка ўжо запрагаў каля хлява, калі іх двух зайшло ў расчыненыя вароты. Адзін нейкі чужы, незнаёмы. Мусіць, з байцоў, што тут пааставаліся пры адступленні, бо гаворыць ён чыста па-руску. А другі — з Капуснікаў, Тхорыкі на іх кажуць. Пустальга ды зладзюга. Сам першы ў тую паліцыю пабег, ды такі ж ката рэзнік зрабіўся, што і знаёмыя ўжо баяцца стрэць яго, і ўсе навокал праклінаюць. Калі яны ўзышлі на двор, Шурка ўжо якраз запрог і ехаў насустрач.

— Тпру! — сустрэў яго Тхорык.— Гатоў?

— Гатоў,— кажа Шурык, спыніўшыся.

А той глядзіць і не ведае, да чаго прычапіцца. Знайшоў.

— Якая пуга ў яго, паглядзі,— кажа свайму напарніку. І да Шуркі:— Ану, пакажы!

Той даў, вядома, а гэты — каб ён да вечара галоўкай налажыў! — лясь, лясь пугай па Шурку, пасля па кані. І з саней не даў злезці, у хату зайсці... З пугай у руцэ — так і пайшоў на іншыя двары, раго-

чучы з тым сваім памагатым, а можа, чорт іх ведае, і начальнікам.

Плакалі Жэня з мамай і гаварылі доўга, прадучы... Адна пацеха — Любачка шчабятала ім сваё «ня-ня-ня!» ды ўсміхалася, стоячы на лаве ў стойцы. Што ты хочаш — малое, нічога не ведае. А потым бабуля накарміла яе кашай і палажыла ў калыску. Дый сама прылегла на печы, бо нешта ёй зранку яшчэ недабрылася. Яна там сціхла, бедная, адразу, а гэтая бяссонніца яшчэ доўга букала з-пад хусцінкі. Заснула потым, і матуля перастала калыхаць.

Прадзе і думае — невясёлую думу...

А дзень за акном такі сёння ціхі ды чысты! Снег учарашні ляжаў на голлі яблыні, на штакетах гародчыка, на страсе хлява, на ўсім-усенькім — колькі скінуць вокам. А сонца — ужо на поўдні — зацягнута лёгкімі хмаркамі, нібы той Любін тварык хусткай...

Яна падумала так і ўсміхнулася. Потым устала з прасніцы і схілілася над калыскай. Спіць сабе іхняя гаспадынька!.. Усе ёй служаць, як пані якой, уся хата. Не вытрывала Жэня — асцярожненька сцягнула хустку і залюбавалася. Не падзяліць ім з Шуркам, што тут чыё: чые вочы, чый нос... Броўцы якія харошыя, як у самога!.. А губ-

намі як цмакае благоцце, і праз сон... Жэня адчула сваё вялікае шчасце пад цёплай цяснотай яшчэ дзявочага станіка. «Хутка прачнецца»,— падумала пра малую. А сонца, як на тое, выглянула з павалокі хмар і засвяціла ў хату праз яшчэ не замёрзлыя шыбы. Жэня нават спалохалася, што малое, чаго добрага, чхне ды прачнецца. Накрыла тварык хусткай і гайданула калыску. Пастаяла трошкі, а тады павярнулася да акна.

Ды ўжо не села на прасніцу. Поўдзень. Сонца напомніла. Трэба пайсці даць карове.

Ціхенька апранулася і, не скрыпнуўшы дзвярыма, выйшла з хаты.

На зіхатлівай белі агарода сцежка была ўжо добра прыкметная. Бацька не толькі вытупаў яе за вечар ды за раніцу, але і сена трошкі нацерушыў, і саломін са тры згубілася. Адна вунь з коласам. Мусіць, зярняты ў ім асталіся, бо вераб'і шчапіліся сварыцца, хто з іх першы той колас знайшоў...

Жэня ўсміхнулася, бліснуўшы на сонца белымі зубамі. Успомнілася ёй тое, што ўспамінаецца цяпер хутчэй за ўсё і наймілей — дачушка.

Баба спявае малой немаведама колькі

тых песень. Не раз падумаеш: дзе яны толькі ў яе, такой суровай з выгляду, і бяруцца?.. Сама Жэня таксама ж, здаецца, памятае іх многа. І свае спявае, і бабуліны, а ўсё ж здаецца — малавата іх. Не тое, каб мала, а неяк хочацца спяваць яшчэ і сваё... Можа, не столькі таму, што хочацца, а хутчэй па той прычыне, што трэба. І дзіцяці трэба, каб спала ці забаўлялася ціха, дый сама ты ласкавае слова ў душы не ўтрымаеш. Вось і цяпер ужо яно просіцца — пра верабейкаў на снезе, пра залаты каласок ды пра сонейка... Так пляцецца нешта і, як уток у аснову, кладзецца словамі ў любыя гукі якой-небудзь песні — то знаёмай, а то і не. Калі пяеш — не разбіраешся, тады яно выходзіць люба ўсё...

З такімі думкамі, з такою светлай радасцю ў душы ішла яна, румяная ды спраўная, па белай неглыбокай сцежцы.

Падышла да гуменных варот, выняла затычку са скабы і адчыніла скрыпучую, асеўшую вераю.

Спачатку па вачах яе жахнула цемрай, потым Жэня, яшчэ не ступіўшы на ток, разгледзелася збольшага, зірнула ўбок і, каб змагла, дык ахнула б ад страху...

Не крыкнула і не рванулася назад, і потым, калі акрыяла трохі ды раздумалася,

вельмі рада была, што сталася іменна так. Ціха і непрыкметна, не падазрона, калі хто і бачыў, яна зноў зачыніла скрыпучую — ліха ёй! — вераю гуменных варот, дрыжачымі рукамі заткнула паленцам скабу і пайшла, як толькі сіла мага стараючыся не спяшацца.

Колькі свету перавярнулася ў яе душы за гэтыя хвіліны! Колькі яна ўспомніла і колькі зразумела цяпер, убачыўшы яго!..

Гэта быў ён — той самы баец.

...Па-рознаму, хто як, ішлі яны ўлетку на ўсход. Немцы ўжо чорнаю хмарай прагрукаталі па гасцінцы — і матацыклы, і танкі, і аўтамашыны з салдатнёй,— а нашы ўсё яшчэ адступалі. І на машынах сям-там, палявымі дарогамі, а то ўсё больш пехатою, па збажыне. Адны ўжо з голымі рукамі, нават босыя ці пераапрануўшыся ў якое-небудзь лахмоцце, а іншыя — хоць таксама ж другі ледзь на нагах трымаецца — з вінтоўкай у руках і зубы, здаецца, сцяўшы ад злосці...

Не забудзецца Жэня ніколі пра тую палутарку з фікусам...

Ці сам той нейкі начальнічак ведаў, як уцякаць, ці шафёр яго быў хітры, але перлі яны не гасцінцам, а па клёніцкім загуменні. Не толькі сам ды дзеці ў кузаве, але і

шафа з люстрам, і клункі, і фікус... Вось так, бывае, чалавек дурнее на пажары: гарыць усё, а ён імчыць з хаты, каб як найдалей ад агню, якія-небудзь, скажам, ходзікі, што ўжо і не цікаюць нават тры ці чатыры гады... Жонка яго ў кабіне, а сам ён — страшны чалавек — сядзеў пад сваім фікусам.

А за Тадорыным гумном ляжаў на траве баец. Падбіўся, бедны, і паранены, рука на перавязі. І маладзенькі ж яшчэ, вочы пад лоб паўпадалі, чорны-цёмны ад пылу і стомы, а вінтоўка ў руцэ. Убачыў машыну — устрапянуўся, але пазнаў, што свае. Адкуль тая сіла ўзялася — устаў, падняў руку з вінтоўкай: «Стой!» А тыя нібы і не чуюць. Тады баец вінтоўку цераз галаву, за плечы, і, як толькі машына параўнялася з ім, учапіўся рукою за борт...

Божа мой! І не думала Жэня, што свой, што савецкі ды можа такое зрабіць... Начальнічак з-пад фікуса ўдарыў нечым па руцэ на канце барта, баец пусціўся, спатыкнуўся і ўпаў!.. А машына паперла далей.

Жэня была тады з Любачкай на руках, карову на прыгуменні прыпасвала. Ужо і не думала, што хлопца таго калі ўбачыць. Бо ён устаў, пастаяў і паплёўся... Зрэшты,

колькі людзей у тыя дні перавярнулася...

Адвячоркам тады неяк раптам аціхла трохі — ні машын не чуваць, ні самалётаў, ні гармат. Мужчыны выйшлі на вуліцу, і — Шурка пасля расказваў — Зміцер Несын пачаў перад усімі зноў па-свойму пасміхацца. Акрыяў! А то ўсё баяўся калгасаў, за поле сваё шырокае дрыжаў.

— Ну што,— кажа,— пайшлі бальшавічкі, адкуль прыйшлі. Толькі,— кажа,— дзякуй богу, трохі скарэй! Хэ-хэ-хэ!..

Маўчаць мужчыны. Чалавек іх з пяць там, Шурка казаў, было. І нейкі баец яшчэ, у Несынавых неданосках, нібыта ён і не салдат. Заключоным, кажа, быў у лагеры, за нейкую сваю «праўду» пакутаваў. Новы пан, Зміцер, пасміхаецца, а новы парабак патакае — чорт яго ведае, так сабе ці папраўдзе...

А тут, Шурка кажа, ідзе з канца вёскі баец з рукой на перавязі. Адтуль, куды ўцякалі. І без вінтоўкі. Падышоў, павітаўся:

— Добры вечар, таварышы. Можна прысесці?

Хто сядзеў, дык тыя рассунуліся на лаўцы, і ён прысеў.

Маўчаць усе. А потым той, пераапрану-

ты, нібы яго хто за язык пацягнуў, пытаецца:

— Ну што, адваяваўся?

Баец, відаць, па мове здагадаўся, што той — не мясцовы. Але змаўчаў яму.

Зміцер Несын — ён стаяў — паглядзеў на байцову руку, на ўсяго яго, потым на боты і пасміхнуўся, разумненькі:

— Хэ-хэ-хэ!.. Цікава, браце, хто з вас кашы раней папросіць — ты ці яны?..

Маўчаць усе — і баец, і мужчыны. І нікому ж, вядома, такое не смешна.

А потым той, пераапрануты, пачаў:

— Вось так і драпаем, хто дзе — «на земле, в небесах и на море...». Хутчэй бы ўжо толькі канчалася ды дахаты...

Баец паглядзеў на яго — доўга так — і спытаўся:

— Ты хто?

— Я не з тваіх, ты не бойся,— адказвае той.— Я, дружа, з тых, што дагэтуль маўчалі.

— Дык як жа ты,— кажа баец,— мог падумаць, сука, што нехта здолее верх над намі ўзяць, над савецкімі? Можа твой Гітлер?

Тут ужо і Зміцер умяшаўся са сваімі смешкамі.

— Цябе цяпер,— кажа,— таварышок агі-

татар, толькі на Гітлера і выпускаць. Ты б яму даў!..

Зноў ніхто не смяецца. Нават і той, пераапрануты.

Баец падняўся.

І толькі ён хацеў нешта сказаць ці проста пайсці адгэтуль, Шурка спытаўся:

— Вы можа есці хочаце, таварыш? Дык хадзем да нас.

Той паглядзеў на Шурку, і яны пайшлі.

І ён сядзеў у іх за сталом, гэты хлопец, прагна сёрбаў капусту, раз-поразу кладучы лыжку на стол, каб узяцца той самай рукою за лусту. Еў і расказваў, што сам ён ажно з Дону, што недзе там, у станіцы ягонай, і хата, і родныя ёсць. Гаварыў ён — як свой са сваімі. І адно толькі слова, здаецца, было яму вымавіць найцяжэй. Ужо калі ён дзякаваў старой ды назваў яе тым словам, толькі неяк па-свойму — «маманя», нібы спатыкнуўся на яго, асекся і, адвярнуўшыся, памаўчаў...

Зайшоў чалавек, накармілі, пайшоў...

Не першы быў ён тады, ой, не першы ў іх хаце!..

Не толькі яны, Іванішыны, але многія, можа нават — без таго Несына — усе ў Кленічах двойчы ці тройчы за той страшны тыдзень пяклі хлеб, і зранку, і ўдзень

варылі чыгунамі бульбу, даставалі з кубельцаў прыпасеную на касавіцу і жніво скараміну. Не лічыліся людзі ні з чым для сваіх, і кармілі, і на дарогу давалі.

Не дзіва было, што і гэтага накарміла старая Іваніха, што і яшчэ адзін нечы сын — не з Масквы, не з Урала, дык з Дону — назваў яе святым для ўсіх і ўсюды словам. Не дзіва, што і пашапталіся яны тады, баец і Шурка, пра нешта, выйшаўшы з хаты... Спытала пасля ў свайго начная зязюля: «Пра што вы там гаварылі?» А ён па-чужому неяк адсек: «Спі лепш, а то старою будзеш без пары...» Што ж, і пра гэтую крыўду забылася б, і не дзіва. І памятала б, можа, пра тую толькі палутарку з фікусам, пра руку, што сарвалася з барта, калі па ёй ударылі, пра худога смуглявага хлопца, якому цяжка было ўтрымаць у той здаровай руцэ нават лыжку з капустай...

Ды ён не стаў успамінам, ён — тут!..

Калі яна заўважыла яго, ён спаў у прыстаранку іхняга гумна, на саломе, каля акенца, што высякаюць нізка над зямлёю для вала ад малатарні.

Спаў ён у Шуркавым доўгім кажусе, лежачы на левым баку і тварам да акенца. Галава яго ўбінтавана была, відаць, ручні-

ком, і смуглы твар выглядаў з-пад белага, як з-пад хусткі, калі яе ў спякоту завяжаш нізка, да брывей. Рукамі — ужо абедзвюма і таксама ў Шуркавых, ёю звязаных, рукавіцах — баец абнімаў вінтоўку. Толькі валёнкі былі на ім не іхнія. І кніга, якую ён, пакуль заснуў, чытаў,— таксама, здаецца, чужая...

Не прачнуўся ён ні ад скрыпу дзвярэй, ні ад святла, што хлынула сюды з аснежанага, сонечнага двара.

А яна не крыкнула — ні ад страху спачатку, ні ад здзіўлення і здагадкі — пасля.

Жэня не толькі пазнала байца — яна і зразумела адразу, хто ён цяпер. Больш таго — маладзіца адразу здагадалася пра многае, пра што апошнімі днямі ніяк не магла даўмецца. Яна зразумела, чаму і пра што свякроў з Шуркам шапталіся ўпотай ад яе; чаму старая пачала нядаўна варыць у большых гаршках і яны, тою самаю сям - ёй, пачалі ўсё да звання з'ядаць; чаму Шурка пачаў хадзіць па сена не з рэзгінамі, а з дзяругай.

Жэня ішла па сцежцы з пустымі рукамі, рэзгіны пакінуўшы ў гумне — для большай, як ёй здалося, асцярогі ад ліхога вока. Ішла, і ў душы яе варочаўся з месца на месца вялізны свет, у якім нішто ды ніяк не

магло спыніцца, супакоіцца... Тут было і тое, што яна нечакана ўбачыла, і што ўспомніла, і што адчувала — і жах, і жаль, і крыўда!..

За думкай, што яны хаваюць партызана, сам паказаўся выскалены ў рогаце Тхорыкаў рот, і ў руках нелюдзя замест пугі была ўся ў крыві — шабля... Усе... Усе!.. І Любачка!.. Божа мой, тут разарвацца мала ад жалю і жаху!..

А потым з'явілася думка другая: не, не адны яны памагаюць такім, што пайшлі супроць нелюдзяў! Вось і валёнкі хтосьці даў... Дый не адзін жа ён такі, што ўжо і немцаў запыняе на дарогах, і паліцаяў трымае ў страху. І ўсе ж яны па людзях хаваюцца, і нашы хлопцы з імі ходзяць...

Няхай, скажам, Шурка хавае яго, ён мужчына, а то ж і свякроў. І яна, відаць, нешта думае, калі не баіцца.

Тхорык з'яўляўся перад вачыма зноў — ужо без шаблі, а з пугай... Няўжо ж усім такое трэба перамоўчваць? «А твой?..» — успомніла пра Шурку. Не, ён змаўчаў — цяпер ёй ясна,— каб вывесці іх, паліцаяў, з двара. А ён ім яшчэ не даруе!..

Загула, запыліла ў памяці тая палутарка... Хіхікнуў, усім пакуль што задаволены, Несын...

«Бо няўжо ж і нам быць з такімі заадно?.. Няўжо і табе было б не страшна, мамачка, як і ёй, маёй свякрові?.. Няўжо адна ты, Жэнька, такая палахлівая?.. Ой, не!..»

Яна ішла, звычайная наша вясковая маладзіца, па сцежцы, якую можна было б у той дзень убачыць на кожным гародзе, з хлява ды ў гумно, ішла, і нікому было не відно, што рабілася ў яшчэ адной душы, бязлітасна ўдаранай жыццём.

Суровая, горкая, страшная, як ніколі дагэтуль, і небывала, да болю радасная, гордая сталасць сыходзіла на душу маладзенькай маці. І, разам з тым, яна была яшчэ ў вялікім чалавечым утрапенні. Жэнька баялася, жудасна баялася нават думкі пра тое, да чаго ўсё гэта можа іх давесці. Але яна ўжо ведала, што ўсё роўна будзе разам з мужам і свякроўю, разам з усімі добрымі людзьмі. І ўжо ёй крыўдна было, што і ён, яе Шурка, і маці — абое хаваліся ад яе, як ад малое ці, яшчэ горш, як ад чужое... Самім бы ім паспытаць, як гэта крыўдна!.. Але ж не, і яна ім не скажа, што ўжо ведае ўсё! Не скажа, і выгляду нават не падасць. Няхай сабе шэпчуцца, няхай сабе думаюць, што яна... Ён, ён — асабліва, той, што «лю-

біць яе больш за ўвесь свет», што «толькі з ёю хоча дружыць»!..

І тут уся яе крыўда і злосць — ці то пажаночы толькі, ці і па-дзіцячы яшчэ — пачала набліжацца на вочы слязою. Яна не плакала, не. Але ж хапіла б, здаецца, каб хто-небудзь з іх, муж ці свякроў, сустрэў яе, дакрануўся да яе не то што словам, а нават позіркам — і сэрца Жэньчына не стрывала б...

Ніхто, аднак, не сустрэў яе ні на сцежцы, ні на дварэ. І яна вярталася ў хату з адною думкай: «Няхай жа свякроў, калі гэтак, не ведае, што я хадзіла ў гумно, што я хацела даць карове... І з ім, з Шуркам, таксама паглядзім...»

Старая і Любачка спалі.

Жэня распранулася і, пакуль зноў сесці на прасніцу, стала каля грубкі.

Смяюцца толькі з Лустача, падумала, што п'яніца, а грубку ён зрабіў ім добрую. Паўкошыка торфу — і вось яшчэ з учарашняга цёплая. Добранька так пастаяць, залажыўшы рукі, грэючыся ўся — і целам, як той казаў, і душою. Хоць замурлыч вазьмі, як кошка на комінку...

Маладзіца, відаць, усміхнулася б нават, каб не тое, што ёй вось толькі што, за парогам, хацелася плакаць. Нават і губу пры-

кусвала, пакуль распранулася ў кухні, і, ужо стоячы каля грубкі, вочы заплюшчвала, каб супакоіцца.

Яшчэ больш па-ранейшаму ціхім ды любым, звычайным — амаль як у тую зіму да вайны — здалося ёй усё на нейкі момант, калі на печы старая заварушылася, асцярожна кашлянула і села.

— Ах, мая долечка! — сказала яна.— Знайшла хіба свята!.. А карове — каторая пара — не давана... Жэнька!

— Ну!

— Карове не давала?

— Не.

Больш, відаць, маладзіца не змагла б сказаць. Але ўжо ад дотыку чужога слова да яе душы — не заплакала. Проста ўзяла ды села прасці.

— І добра, дзеткі, што не давала... Пайду я, ткалй, сама ёй дам. А ты глядзі — малая ўстане ды цыцкі папросіць...

«Гавары, гавары сабе, хітранькая,— думала нявестка.— Лічыце сабе, і ты, і ён...»

Яна зноў прыкусіла губу, перастала нават і думаць. Не, яна не заплача, на злосць!..

Пакуль старая тупала ў кухні, ужо з дарэмнай, нават смешнай для Жэні асцярогай дастаючы з печы гаршчок, адліваючы

капусты ў гаршчочак, укручваючы яго, лусту хлеба і лыжку ў тую дзяружку — больш ад чужога вока, чым дзеля таго, каб не астыла яда,— пакуль яна апранала кажушок, прачнулася Любачка.

А пакуль старая ішла па дварэ ды па сцежцы, пакуль яна корпалася ў гумне, прычыніўшы за сабою дзверы (таксама нібы незнарок!), малая паспела і нацешыцца ля маміных грудзей, і папрасіцца на лаву, глядзець у акно.

І вось — па сцежцы на першым снезе ідзе яна, суровая і ўжо нямоглая Іваніха, ідзе, накульгвае, нясе дзяругу сена і стараецца, каб нават і не падумаў хто-небудзь, што ёй цяжка...

І няўжо ж ты, дурная Жэнька, думаеш, што гэта так сабе, а не ад жаласці да цябе яна вось так ажно горбіцца — нясе яе, сваю мацярынскую таямніцу?..

Свякроў ідзе, а нявестка з малою глядзіць у акно.

Дзяўчынка ў ніцяных лапціках стаіць на лаве і, перавешваючыся цераз маміну руку, час ад часу ўпіраецца лобікам у халаднаватую шыбу. І ўсё гудзе штосьці сваё, па-ранейшаму весела і заклапочана.

А мама слухае, як пад рукой яе квола тукае маленькае сэрца, і маме хочацца ёй

сказаць: «А вунь дзе, бачыш, як яна, баба, ідзе?» І песня, просценькая, цёпленькая песня «са свае галавы», просіцца на язык. Там былі б словы пра белую сцежку, пра сонейка і залаты каласок, за які пасварыліся два вераб'і, пра малую блакітнавокую Любачку, якую любяць усе — і мама, і тата, і наша бабуля...

Ды слоў не будзе, ніякіх, бо Жэня баіцца, што як толькі яна акажацца, дык і заплача.

А слёз тут не трэба.

Трэба сілы ды сілы.

І дружбы, Шурка — каб разам ісці на ўсё.

ЦІ УСЁ СКАЗАНА?..

Школьніцай Ганя насіла пошту. З сельсавета, дзе была іх сямігодка, у родную вёску, за шэсць з палавінаю кіламетраў. Пісьмы, газеты, павесткі — часамі поўная торба. І ў мароз, і ў разводдзе — то адубелая наскрозь, то мокрая па калені.

Дома была яна гаспадыняй ледзь не з сямі гадоў: маці памерла, а бацька другі раз не ажаніўся. З-за яе і малодшай сястрычкі, каб не прывесці ў хату мачыхі. Ганя пачула пра гэта рана, зразумела — таксама хутка.

Жыць было цяжка, вучыцца не вельмі лягчэй, аднак школу яна закончыла амаль з аднымі пяцёркамі.

Не быўшы ні разу ў сваім раённым палескім мястэчку, дзяўчына паехала адразу ў Мінск, дзе паступіла ў медыцынскі тэхнікум.

На пятнаццатым годзе была яна высокая, худзенькая і сарамлівая — аж занадта. Хадзіла ў брызентавых тапачках, у бумазеевай кофце і ў спадніцы, унізе абшы-

тай істужкамі, а ў запасе была ў яе яшчэ адна даматканая кашуля, цётчынай работы, і ватоўка. Жыла ў інтэрнаце, харчавалася самастойна. Стыпендыі плацілі семдзесят рублёў, з чаго яна кожны месяц адну-дзве, а то і тры дзесяткі пасылала дахаты...

На другім курсе палепшала: знайшла работу, днём вучылася, увечары дзяжурыла ў вайсковай бальніцы пры тэлефоне; там і кармілі яе, і прыадзелася трохі. Але не змянілася Ганя,— памятала дзяўчынка і тое, што трэба было памятаць пра самую сябе і пра бацьку, і пра сястру ў далёкай, роднай і няшчодрай хаце.

Калі пачалася вайна,— хто б мог падумаць пра гэта! — ціхая, непрыкметная студэнтачка... усцешылася ў душы, што вось і настаў ён, нарэшце, час подзвігаў... Аднак горад зусім нечакана, незразумела хутка занялі фашысты. А яна, таксама нечакана, пачала неўзабаве працаваць прыбіральшчыцай у адной з трох у горадзе клінік,— якраз у той, дзе лячылі параненых немцаў.

І пачала рыхтавацца да подзвігу. Адна, без дружбы і кіраўніцтва. У сваю прахадную каморку ў мяшчанскім драўляным асабняку на ўскраіне, у свой, зроблены татам, куфэрачак яна насіла медыкаменты,

якія — у парадку барацьбы — крала ў ворагаў. Знайшла гранату, чатыры абоймы патронаў... Каб перайсці з усім гэтым туды, да партызан. І не вельмі хавалася ад гаспадыні: свае ж людзі, савецкія!..

Арыштавалі Ганю напрадвесні.

У гестапа яна як сказала спачатку, што ўсё рабіла адна, так і стаяла на гэтым. Яе катавалі, як многіх з іх перапоўненай камеры, а пасля, разам з многімі, павезлі на расстрэл. Але, у выніку гаспадарчых меркаванняў, не расстралялі разам са старымі ды нямоглымі, а ў групе маладых адправілі ў Нямеччыну.

Тысяча дзён яе вясны прайшла ў канцлагеры, з рыдлёўкай і kіркай, у голадзе, холадзе, нялюдскіх здзеках, у штогадзінным чаканні смерці...

Улетку першага мірнага года Ганя вярнулася ў разбураны Мінск. Яна не помсціла той гаспадыні, нават і не шукала яе. І ўжо не марыла пра подзвігі. Час быў такі, што пра пакуты ў няволі — лепш было памаўчаць. Нават пра гераічныя спробы ўцякаць, нават пра мужнасць тых, што і на самым дне фашысцкага пекла — перад сабой і для другіх — былі і заставаліся сапраўднымі людзьмі... І яна маўчала,— не таму толькі, што ўсё ж такі баялася той

блізарука-цьмянай, зацапанай усемагутна-бруднымі пальцамі лупы, якая не сыходзіла з акупацыйных ды замежных старонак яе біяграфіі,— маўчала Ганя больш па той прычыне, што не было, на думку яе, чым хваліцца... Хоць і ў Мінскай турме, і ў цэлы тыдзень забітым таварным вагоне, і за лагерным дротам імя яе вымаўлялася многімі з нейкай палёгкай у сэрцы...

Пайшлі гады, яна стала студэнткай мед-інстытута, пасля — урачом.

Мусіць, я мала ведаю пра яе, каб пісаць?..

Можа я мала люблю цябе, мілы наш чалавек?..

Ды я чытаў калісьці ў аднаго з самых родных і мудрых пісьменнікаў штосьці прыблізна такое:

«Усё, што ўражае розум і сэрца,— трэба запісваць».

І я запісваю, што бачыў сам, адзін, чаго ніхто за мяне не запіша. Няхай гэта будзе пакуль што... ну, проста першы накід да яе партрэта.

...Румяная дваццацігадовая рагатушка, праводзячы госцю, пазнавата і нявопытна саскочыла з вагоннай падножкі. Вагон быў апошні, яна засталася жывая, толькі без ног і правай рукі.

Гэта страшна наогул, асабліва ж — калі яно здараецца з малым або з жанчынай.

І многа сілы патрэбна, многа чалавечнасці, каб пацяшаць такога пакутніка, паднімаць яго з самага краю магілы — не толькі па абавязку прафесіі.

Ганя, якая цяпер называецца доктар і Ганна Пятроўна, умее рабіць гэта наўздзіў нястомна і шчыра. Белы колер халата і шапачкі — колер пяшчоты, палёгкі, надзеі — вельмі ж неяк ідзе да яе вялікіх, чорных, зачаста журботных вачэй, да яе прастадушна шырокай усмешкі, да слоў — такіх сардэчных і такіх звычайных, нават казённых у вуснах каго-небудзь іншага:

«Ну, як жа мы, хворая, сёння?..»

Казалі, што Ганна Пятроўна,— да ўсіх уважлівая і ласкавая,— найбольш усё ж такі прысядала каля ложка няшчаснай дзяўчыны і гаварыла з ёю найцішэй...

Ведаю я гэта — як хворы з суседняй, мужчынскай палаты.

Як хворы... А як мужчына, як чалавек і старэйшы таварыш, я думаў і думаю часта пра яшчэ адну таямнічую недарэчнасць жыцця: ну, дзе ён ходзіць і што ён марудзіць — той, каму так радасна было б назаўсёды, на ўсё жыццё падзяліцца шчас-

цем з гэтай харошай, яшчэ ўсё самотнай дзяўчынай?..

У палаце было нас дванаццаць. Нават больш, бо за месяц, пакуль я хварэў, людзі мяняліся, палата прапусціла іх звыш дваццаці. Усе мы часта і, вядома, добра гаварылі пра Ганю. Ды я адчуваў, што ўсё гэта — далёка не тое... Не тымі, шэрымі былі і нашы, бясспрэчна шчырыя, падрыхтаваныя загадзя словы падзякі, якія мы гаварылі ёй пры выпадку кожны па-свойму.

І таму я, ужо выпісаны, ідучы дахаты, з асаблівым, шмат маладзейшым за мяне хваляваннем пастукаў у дзверы яе кабінета.

Ганя была адна, і я захваляваўся яшчэ больш... Здавалася — тут і скажу ёй штосьці сапраўднае, штосьці ад тых маіх думак...

— Вось бачыце, Павел Міхайлавіч, як усё добра? Як я рада за вас! — гаварыла яна, падаючы мне сваю вузкую, моцную руку. І звычайныя словы яе былі, як заўсёды, асветлены, сагрэты шчырасцю чорных, вялікіх вачэй і шырокай усмешкі.

Я ўжо гатовы быў пачаць... Ну, з самых простых слоў, як і яна, ды тут пачуўся стук у дзверы.

— Прашу!

Яны адчыніліся. Іх адчыніла цётка Лена,

пажылая нянька; па-свойму ціха і спрытна яна прапусціла наперад каляску, сама адступіўшы за дзверы, на калідор.

На калясцы — адна, левай рукою калываючы рычажок,— у кабінет уехала тая румяная зноў, зноў рагатушка... без ног і правай рукі.

У бальніцу мяне прывезлі месяцы два ці больш пасля яе. Тады ўжо,— бо і нашы і іхнія дзверы былі адчынены на калідор,— мы часта чулі яе вясёлы, звонкі голас і сакавіты, здаецца, нават румяны смех. Гэтыя голас і смех прымалі самы звычайны, памаладому бесклапотны ўдзел у дзявочых, не вельмі глыбокіх размовах. І гэта яшчэ больш, да немай і глыбокай жудасці падкрэслівала ўсю яе трагедыю...

— Ганна Пятроўна, добры вам дзянёк! — звонка прывіталася дзяўчына.— Я на хвілiначку да вас. Каб толькі развітацца... і сказаць...

Левай рукою, яшчэ ўсё не вельмі спрытна, яна схапіла і сціснула правую Ганіну далонь,— вузкую, моцную і бязлітасна добрую руку хірурга, вышэй, пад беллю халата памечаную пяцізначным лагерным нумарам. І ў той жа момант, і для самой сябе, відаць, нечакана прыпала да рукі губамі і слязьмі...

Тут была цэлая бездань маладога, няўцешнага гора; тут было шмат, адразу вельмі шмат пачуццяў — тых, з якімі адгэтуль выходзілі многія... Усё — не так!.. Тут было тое, што я ўбачыў на вяку сваім упершыню... У нашым свеце так цалуюць толькі рукі маці.

Уражаная Ганя,— наша высокая, строгая Ганна Пятроўна,— прысела, прыкленчыла побач з каляскай і парывіста абняла рагатушку...

У гэты момант я якраз адварочваўся да акна.

— Галубка... любая... Доктар!.. Вы мне вярнулі жыццё... Каб не вы...

— Ну, не трэба... Ну, ціха... Ну, вось і не трэба... Усё.

Потым зашамацелі шыны каляскі. Гэта — амаль нячутна. Затое ў дзвярах каляска стукнула залішне моцна. Зачыніліся, нібы ўздыхнуўшы, дзверы. Ганя быстра і лёгка зайшла за свой стол і прысела на крэсле.

А я не мог адразу адарвацца ад акна. Хоць за ім была проста восень, трохі дрэваў з апошнім лісцём і нізенькі зялёны плот, за якім — проста вуліца...

І ўсё было, мне здавалася, сказана.

ТУГА

1

Калі праўду сказаць, дык і тут было часам нядрэнна.

Перш за ўсё, тут было вельмі многа вады, і яна называлася — мора. Глядзіш з самага берагу, седзячы на пяску, глядзіш з высокага абрыву, са сцежкі ў шорсткай траве — а яно ўсё бясконца мора ды мора!..

Пясок гарачы, і мама сцеле для Юркі шырокі, калматы ручнік. Горача вельмі і зверху, бо сонца тут пячэ ўвесь дзень. Тата знайшоў чатыры кіёчкі, прыносіць іх сюды, утыкае ў пясок і зверху нацягвае прасціну, якая тады называецца — тэнт.

Спачатку Юрка баяўся мора і не лез у яго. Ён то ляжаў пад тэнтам, то ішоў на самы бераг і шпурляў у мора каменьчыкі. А іх тут таксама вельмі многа. І яны называюцца — галька. У тое, другое лета, калі Юрка з мамай і татам жылі ў лесе над рэчкай, каменьчыкаў было куды менш. Там іх тата збіраў для Юркі і ўсё знаходзіў мала. А цяпер — кідай, кідай, ажно

рука забаліць!.. І так — то пад тэнтам ляжы, то гальку кідай. І сёння, і ўчора, і ўжо даўно, даўно!.. І тата смяяўся:

— Эх ты, курыца! Трэці дзень на курорце, а ўсё сядзіш ды глядзіш.

Ды вось тата ўзяў Юрку на рукі, занёс у мора і, колькі малы не прасіўся, паставіў яго ў ваду па саменькія грудзі. Юрка яшчэ ўсё то крычаў, то дрыжаў, то пачынаў смяяцца, а вада як плюхне на яго — і ў рот, і ў вочы, і на валасы!.. Ды такая ж салёная, страшная!..

Ну, так было раней, калі Юрка баяўся мора. А цяпер ужо мама баіцца, каб ён не лез. І аднаму купацца Юрку не даюць,— і тады, калі ціха, і тады, калі на бераг коціцца з шумам адна за адною вада, якая ў той час называецца — хваля.

— Сёння, сынок, хваля вялікая, ты купацца не будзеш. Ты — харошы, і ты не будзеш нават прасіцца.

Праўда, харошым тут быць вельмі сумна, але ж і з мамай трэба дружыць. Тату добра — ён купаецца і тады, калі тая хваля аж надта шуміць і хвошча па беразе, нават тады, калі мама і яго — такога вялікага! — просіць, каб не купаўся.

У той дзень Юрка прыдумаў нештачка вельмі вясёлае. Ён браў сваё блакітнае вяд-

ро з намаляваным на баку вялізным жоўтым яблыкам і ішоў да самага берагу. Берагу, зрэшты, цяпер не было. Хваля за хваляй так шумна і так злосна каціліся на гальку і пясок, што бераг усё ўцякаў — быў то бліжэй, то далёка... Хваля адкоціцца, і толькі пена, як з мыла, усмоктваецца ў гальку і пясок. А ты бяжыш следам за берагам, каб чарпануць вады. І толькі ты сагнешся — хваля зноў як пляснe, і бераг твой пабег, пабег, а ты ўжо стаіш у вадзе. І ты з вады ўцякай, бо хваля другая таксама — як пляснe!.. Мама ўсё яшчэ баіцца, а то і крычыць нешта, хоць што яна крычыць — не чутно, бо відаць толькі, як яе рот раскрываецца. Затое тата не крычыць. Ён нават так сядзіць ды так павернецца бокам, што нібы цябе і не бачыць... У гэтым іменна ўвесь смак гульні. Юрка падкрадаўся да таты з вядзерцам вады ды зняча ўку на спіну як плюх-не! — тата ажно падскочыць і закрычыць. Як жа гэта прыемна Юрку і як жа тут нарагочашся! І можна яшчэ і яшчэ раз, бо тата будзе кожны раз так сядзець, што нібыта ён нічога і не бачыць...

Вось і ўсё, што вясёлае.

Праўда, было аднойчы вельмі весела ў кіно.

Першы раз, калі Юрку ўзялі туды, ён спачатку глядзеў, потым драмаў, а тады і зусім заснуў у таты на каленях. І мама сказала, што лепш ужо яна сама не пойдзе ў кіно, але ж і дзіцяці марнаваць не будзе. Але і назаўтра пайшла, бо карціна, казалі, вельмі ж цікавая.

Кіно тут не такое, як у іх, у Мінску, а проста на дварэ. Цёця ўпушчае туды праз брамку. І за брамкай лаўкі стаяць, навокал высокі плот, а столі няма. На сцяне расцягнута палатно, якое і тут называецца — экран. Дзе левая ручка — там плот і дрэвы, а дзе правая ручка — там плот і, пад абрывам, мора. Яно так далёка ўнізе, што адгэтуль нават і не чутно, як шуміць. Толькі месяц высока над морам, а на моры доўгая, бліскучая дарожка. Пакуль пачнецца кіно, навокал сакочуць конікі, якія тут называюцца — цыкады. А ўжо калі залапоча рухавік, калі на экране пакажуцца людзі і заіграе музыка — тады чуваць толькі кіно. Але яно зусім не вясёлае, бо гэта ж не Бураціна і не Беласнежка, а толькі ўсё для вялікіх. Усё нешта гавораць, гавораць... І сумна.

Ды вось раз на экране паказаўся сабака... Вялікі, вялікі! І чорны. І ён як загаўкае!.. А тады за плотам, з таго боку, дзе

пад абрывам мора,— таксама нешта як загаўкае!.. Ужо не з экрана, а нейкі жывы сабака, што, відаць, сядзеў дагэтуль ціхенька ды глядзеў кіно. І ўсе дзядзі і цёці зарагаталі. І Юрка так рагатаў, і так хацелася пра гэта гаварыць, што мама ажно зазлавала...

І Юрку ўжо не бяруць у кіно. Кладуць яго спаць, а самі ідуць. І ён калі адразу засне, а калі дык ляжыць і думае.

Сёння, напрыклад, думае.

2

У слоўніку трохгадовага чалавека слова туга пакуль што не значылася. Аднак душу яго — хоць неназваная яшчэ і неўсвядомленая — яна ўжо наведвала.

Адчуванне гэтае, лепш сказаць — цэлы комплекс вобразаў і звязаных з імі пачуццяў пачаўся ад брэху — таго, з экрана і на экран.

Здаравенны, чорны кіно-сабака і той, з-за плота, яшчэ не вядомы, брэхам сваім напомнілі Юрку далёкага, добрага друга, ад якога хлопчык спачатку доўга ехаў машынай, а потым высока-высока ляцеў самалётам...

Юрка забраўся ажно сюды, дзе мора, а Шарык застаўся там, у цёцінай вёсцы, на ланцугу.

Цёці Верын сабака быў вельмі добры, але нецікавы і нават смешны з выгляду: пярэсты, палавіна галавы белая, палавіна чорная наўскасяк, як быццам ён завязаў нейкай лапінай падбітае вока і ўсё падвільвае хвастом ад сораму. І зусім не кругленькі, хоць і называецца Шарык.

Можа, каб Юрка баяўся яго, як ён баяўся спачатку мора, дык самі б яны і не пасябравалі. Але ж Юрка не вельмі баіцца! Ён не баяўся яшчэ і ў тое, другое лета, калі яны жылі ў лесе над рэчкай, і калі там было многа-многа індыкоў, а ён аднойчы сам зайшоў да іх, у загарадзь, і ўсё крычаў, як паравоз, каб яны балбаталі... І Шарыка ён не пабаяўся, а назаўтра пасля таго, як да цёці прыехаў, сам падышоў да цюцькі і пагладзіў. Цюцька ляжаў у будцы, палажыўшы сваю пярэстую галаву на парожак, і ціха пазіраў на двор, дзе быў якраз поўны парадак. Калі маленькі чалавек, што спаў і еў сёння ў іхняй хаце, павёў рукою па яго лабаціне, Шарык заплюшчыў вочы і ціха зашастаў хвастом па саломе.

А быў ён, Шарык, не з ціхіх. Брахаў вельмі многа і вельмі ахвотна, то злосна,

то весела несучы службу, на думку самога — зусім неабходную ў гаспадарцы.

Брахаў ён нават на жоўтага, карнавухага ката Базыля, абы той трапіў яму на вока. Хоць Базыль і сам быў не лайдак які-небудзь, а сур'ёзны работнік, стары ўжо і, можа, больш за Шарыка паважаны ў хаце,— ён добра ловіць мышэй і вось ужо адзінаццаць год мармыча казкі цёцінай Іры, з якой яны, цёця Вера казала, і нарадзіліся ў адну зіму. Так што Базыль не вельмі баяўся Шарыкавага брэху, хоць, само сабою, блізка каля будкі не хадзіў.

Найбольш і наймацней брахаў Шарык тады, калі Іра выганяла з хлява свінню і трое парасят, каб удваіх з Юркам гнаць іх на пасту.

А трэба сказаць, што цёці Верына Ірачка вельмі вясёлая, і Юрка любіць яе. Яна і гуляе з ім, і свіней яны разам пасуць, і казкі яму вечарамі расказвае. У Іры балела вока, і цяпер яна носіць акуляры, як старая бабка. І ўсё бегае, шмыгае ды смяецца. А сама малая ды худзенькая. Дык Кіркаў тата выдумаў, што яна — мыш на пенсіі.

— Ты, мыш на пенсіі, што ты ўсё толькі маўчыш ды гыкаеш? Ну, скажы: ма-ма,

та-та, ка-ры-та... А што, і не ўмееш гаварыць! Смяешся толькі: гы ды гы.

У адказ Ірачка не толькі рабіла сваё «гы», але і смяялася ціхім ды такім жа смяшлівым смехам, што ты глядзіш на яе дый сам засмяешся.

Маўчала Ірачка толькі з вялікімі. А так яна вельмі добра ездзіла верхам на іхняй свінні. Разбяжыцца, падскочыць, крыкне «эп!», перавесіцца жыватом, перакіне нагу і сядзе. «Ану,— крычыць,— садзіся, Юрка, на прычэп!..» Вялізная белая свіння, якая — мама пяці падсвінкаў і называецца Каруля, бяжыць, трасе вушамі, рохкае — аж за брамку, на вуліцу. За ёю следам — парсючкі і Юрка.

А Шарык ажно ланцуг са сцяны вырывае — так ірвецца і брэша ім наўздагон.

Мілы, харошы цюцька! І лапа твая, відаць, яшчэ не паправілася...

Захварэлі Шарык з Юркам у адзін дзень. Але Юрка паправіўся першы. Калі цёця Вера сказала, што сёння ўжо можна ісці гуляць, ён узяў з шафкі ў кухні лустачку хлеба і пабег у будку. Бо нехта дрэнны кіем ці каменем перабіў іхняму Шарыку пярэднюю правую лапу. І Шарык ужо не гаўкаў, як раней, а толькі хныкаў, гледзячы на госця, і ціха, памалу шастаў хва-

стом па саломе. А Юрка ўжо не тузаў яго аберуч за вушы і не абнімаў, ні ціснуў за шыю, а ціха залез у будку і таксама лёг. І лапы хворай не чапаў, нават пагладзіць яе баяўся.

— Еш хлеб,— гаварыў ён.— Еш. Ён смачны.

І цюцька, хоць не галодны, узяў у зубы лустачку і не па-свойму, не прагна, як раней, а проста нібы толькі ветліва пачаў жаваць...

Таксама, як той брэх з-за плота напомніў Юрку Шарыка, лустачка хлеба прывяла, адкрыла ў памяці другі малюнак.

Старая Шутка, цёці Верына авечка з крывым, смешна сагнутым рогам...

Трэба сказаць таксама, што ў цёці Веры ўсе працавалі. Цёця і дома рабіла, і ў поле хадзіла штодня. Іра і свіней пасвіла, і двор падмятала, і мыла падлогу, і Юрку карміла, калі яны толькі ўдваіх былі дома. Шарык гаўкаў і днём і ноччу, пільнуючы хату і сад. А кот Базыль лавіў мышэй, толькі зрэдку лежачы на «кашэчай гары». Так цёця Вера называла іх вялікую, заўсёды цёплую печ.

Працаваў і Юрка. З цёцяй Верай ён хадзіў часамі «ў калгас» — лён палоць, сушыць сена, куды яны ездзілі з другімі цё-

цямі на грузавой машыне. З Ірай ён пасвіў свіней. Але галоўнай Юркавай работай лічылася ў хаце адно — заганяць увечары авец.

Калі яны, авечкі з усёй вёскі, узняўшы пыл, бэкаючы, вярталіся з пашы, трэба было паспець адчыніць брамку, выбегчы на вуліцу, адлучыць ад чарады свае і загнаць іх у двор. Гэта, зрэшты, было няцяжка. Шутка ішла дахаты сама, ведучы за сабою сям'ю: барана Шмэрку, авечачку Дусю і маленькіх, яшчэ безымянных блізнят. Апроч таго, што яна была авечая мама і сама пазнавала свой двор, старая Шутка ведала яшчэ і тое, што Юрка сустрэне яе не так сабе. Як змоўшчыкі, яны амаль штовечара заходзілі з ім за вугал хаты, ён даставаў з кішэні лустачку хлеба, моцна трымаў яе ў працягнутай руцэ, а авечка адкусвала і старанна, ціха жавала, ах як пацешна варушачы чорнай, наздратай і казытлівай, калі дакранешся, мызачкай!..

У Шуткі дык малая мызачка, а вось у Кветкі, цёцінай каровы,— вялікая, халаднавата-вільготная пыса...

Бо мы забыліся сказаць пра яшчэ адну Юркаву з цёцяй работу,— яны штовечара разам даілі карову.

Пакуль цёця Вера, прысеўшы на малень-

кім зэдліку, даіла сваю бакастую ды вымістую Кветку, пакуль малако ўсё дзюрчала ў даёнку, Юрка стаяў перад каровай і то правай, то левай ручкай гладзіў яе па пысе. А Кветка то ўсё жавала сваю жвайку, то пакідала жаваць і ўздыхала, і з вялікіх ноздраў яе на Юркаву руку цёпла дыхаў шырокі, ласкавы струмень паветра. Ручка міжвольна ўздрыгвала і хлопец ціхенька, удзячна смяяўся.

Мілая, добрая Кветка!..

Кот Базыль быў гарушчы, ён еў, што папала, не перабіраючы, хлеб — хлеб, бульба — бульба... Аднак і ён любіў пагрэць сваю старасць тым цёплым Кветчыным малаком, што называецца — сырадой. Базыль хлябтаў са свайго чарапка пад лаваю, а Юрка і Ірачка сядзелі за сталом. І сырадой з хлебам быў такі смачны! Яны яго пілі ды закусвалі па поўніцы, і над губою то ў аднаго, то ў другога рабіліся белыя вусы. І гэта было так смешна! Над цёці Верыным сталом гарэла ў вялікім белым шары электрычная лямпа. Акно было адчынена, і на шырокім падаконніку маленькі радыёрэпрадуктар так весела граў, што ажно сам падскакваў. Ажно лісце за акном, на яблыні, варушылася!.. А цёця Вера казала:

— Ну, я яшчэ падлію. Колькі ж ты з'еў — менш за ката.

І Юрка еў «больш за ўсіх» — поўную шклянку і яшчэ амаль поўную шклянку, і цэлую лусту, як Шутка!..

А пасля яны з Ірай лажыліся спаць. Бралі з сабою Базыля, і ён ім мармытаў сваю казку — адну і тую ж, аднак, такую цікавую, цёплую, сонную... Але адразу ім не спалася, і яны рабілі свой «схованы домік» — накрываліся прасцінай з галавою і там ужо або шапталіся, або хіхікалі. Пакуль цёця Вера не скажа:

— Ну, спаць, рагатуны. А то людзі ўсю ноч разбяруць. Чуеце, вунь як ціха?..

І праўда, ціха было. Толькі чуваць, як у трэцяй за імі хаце,— а Юрка ведае: гэта ў Ласёвага Ванькі,— яшчэ ўсё гаворыць радыё. Або яшчэ, вясною, як толькі Юрка прыехаў сюды, жабы кумкалі на балоце, за цёці Верынай капустай. Часамі загудзе на вёсцы ці на дарозе машына. І гэтак хочацца крыкнуць, што гэта — дзядзі Алёшава, таго, што Юрка з ім ездзіў на сенажаць!.. Часамі з клуба на тым канцы вёскі доўга чуваць былі песні і музыка. А то гудзеў у полі трактар, блізка ці недзе далей. І конікі ўсё сакаталі. Ды часам Шарык

гаўкне на некага ці на нешта, ці так сабе, прабягаючы ціхенька вакол хаты...

Любы сон неўзаметку залазіў у іхні з Ірачкай «схованы домік».

«А лапка яго, відаць, ужо не баліць»,— думае Юрка, адзін у далёкім-далёкім пакоі. Там, каля мора, куды трэба высока, высока ляцець самалётам.

Але, нарэшце, ён засынае.

3

І сон прыходзіць з вясёлымі, поўнымі сонца і шчасця карцінамі.

Вось яны едуць у цёці Верыну вёску. Тата сядзіць за рулём, побач з ім мама, а на каленях у мамы — Юрка. І ён глядзіць ды глядзіць у акно. Але ўжо змяркаецца, і тата ўключыў фары. Як гэта добра! Спачатку мігціць калоссе абапал вузкай дарогі, а тады пачынаецца грэбля і паша, дзе ўжо нікога няма: ні дзяцей, ні свіней, ні гусей... А потым з мосціка нешта белае — як шыбане! — і пабегла, пабегла да гумнаў...

— Ага, твой Базыль,— кажа тата.

І Юрка крычыць:

— Гэта ён сустракаў мяне! Ён сустракаў!..

І вось яны павярнулі, нарэшце, у вуліцу,

вось ужо цёціна хата, і брамка, і яблыні. Вось ужо Юрка бяжыць туды,— сам, адзін, без машыны і таты, і мамы! — бяжыць і бачыць, што цёця Вера ідзе і смяецца, што Ірачка бяжыць і таксама смяецца... Гэта ён, гэта Базыль наказаў!..

— Я прыехаў! Я зноў прыехаў да вас! — крычыць Юрка. І ён смяецца, і плача ад радасці...

Тата і мама яшчэ ўсё не прыйшлі з кіно. Ніхто не бачыў, як Юрка прачнуўся, шчасліва заплаканы. Але і сам ён яшчэ не вярнуўся ў свой белы, пусты пакой, з цыкадамі за адкрытым акном,— ён толькі пaплямкаў губамі, падкурчыў ножкі і зноў паляцеў у краіну духмяных рамонкаў, сасновых сцен ды бясконцай і цёплай, басаnож абтупанай зеляніны...

У цёці Верыным хляве жывуць сабе карова Кветка, старая Шутка са сваёю сям'ёй і свіння Каруля з падсвінкамі.

Думаеце, што гэта і ўсё?

А другая палавіна хлява называецца адрынай. Там ляжыць сена і салома. Там, уверсе, пад лацінамі, гнёзды ластавак. І ластавяняткі ўсё пішчаць, а іхнія мамы і таты носяць ім мошак. А часамі там, недзе ў куточку, знясецца курыца, і тады ўжо на ўвесь свет кудахкае.

І ўсё?

Ого!.. Юрка таксама думаў спачатку, што ўсё.

А тут з-пад цёці Верынай адрынкі на траву выйшла — глядзіце! — вожыкава мама, а за ёю тры маленькія важаняткі. Па вялікім для іх, па сапраўдным рамонкавым лесе яны — адно за адным, а мама спераду — прабіраюцца да жоўценькага збаночнага чарапка, у якім — малако. І малако такое смачнае, такое сырадоістае, што ў Юркі ажно язык засвярбеў. Зараз во, зараз будзеце хлябтаць!..

А Юрка — паглядзіць.

— Ну, ну, хутчэй! Хутчэй! — нагінаецца ён над імі, падышоўшы зусім блізенька.

І вожычыха скручваецца клубком. А за ёю скручваюцца клубочкамі і малыя.

«Ну што ж, я пачакаю»,— думае Юрка і лажыцца ў цёплым ад сонца, духмяным рамонку.

Падпёр шчокі загарэлымі кулачкамі і маўчыць, чакае.

Ах, як добра, што Шарык дрэмле ў будцы і нічога не бачыць! А то пачаў бы брахаць і напалохаў бы вожыкаў. Добра, што і Базыля тут няма, а то ён выхлябтаў бы малако. Добра, што і нікога пакуль што ня-

ма, што так ціхенька, светла. Яны вось-вось раскрыюцца. Важаняткава мама расшчапіць трохі свой вельмі калючы клубок, цікне праз шчыліну і ўбачыць, што гэта толькі хлопчык Юрка ляжыць. А ён жа хоча толькі паглядзець...

«Ідзіце, ідзіце,— думае Юрка,— не бойцеся, тут жа нікога няма...»

Ды раптам чуецца Іраччын голас:

— Юрка-а! Ідзі свіней пагонім! Юрачка-а!..

Ён хоча адмахнуцца ад яе, але нешта дужае-дужае, цёплае-цёплае абнімае яго і — ніяк не махнеш. Ён хоча крыкнуць: «Ну цябе, гані адна!», ён намагаецца, і крык ягоны вылятае з вуснаў ужо не там...

Гэта мама яго абнімае, гаворачы:

— Юра, Юрачка, уставай! Што ж гэта сёння ты так заспаўся?

А ён крычыць:

— Сама гані сваіх свіней! Сама!..

— Сама пагоніць! — смяецца мама.— Глядзі — разышоўся...

І Юрка прачынаецца канчаткова.

— Трэба снедаць ісці, сынок. Усе ўжо даўно пайшлі. А мы з табой спазняемся.

Памытага, адзетага, але яшчэ ўсё надзьмутага Юрку за ручку вядуць у сталовую. Там з яго бесцырымонна здымаюць

цюбецейку, садзяць за стол і пачынаюць карміць.

Цёця Паліна Іванаўна, якая называецца сястра-гаспадыня, спачатку то ідзе, то спыняецца каля другіх сталоў, а потым падыходзіць і да іх.

— Добрай раніцы,— кажа яна.— Ну, і чаго ж мы такія сумненькія? Як жа мы спалі? У гэтым заездзе, разумееце, амаль зусім няма дзяцей. Вось толькі ваш ды прафесара Маркава, Аляксандра Паўлавіча, Вова. Ды Вовачка, разумееце, прыхварэў ангінкай і пакуль што на пасцельным рэжыме. А так бы яны гулялі разам. Вовачка таксама, як і Юра, вельмі прыстойны хлопчык...

Цёця сястра-гаспадыня і сама вельмі прыстойная. У чысценькім, хрумсткім халаце, поўная, ходзіць салідна, нібы плыве, і гаворыць ласкава, роўненька.

І ўсё тут вельмі прыстойна — пальмы ў кадках, сталы пад беласнежнымі накрухмаленымі абрусамі, дзядзі і цёці, што вітаюцца па пяць разоў на дзень. І мама не крычыць на Юрку, як дома, а толькі ўсё шэпча ціхенька, прыстойна:

— Еш! Божа мой, еш ты!..

І ў тую раніцу ўсе тут, вядома, вельмі здзівіліся, калі такі мілы ды ціхі хлопчык,

седзячы з мамай і татам, раптам крыкнуў на ўсю сталовую:

— Я тут ждохну ў вас! Я хачу да цёці Веры!

ЗОРКА НА СПРАЖЦЫ

Двор абгароджаны высачэзнымі сценамі трох дамоў. Для дарослых яны — проста пяціпавярховыя. А паспрабуйце зірнуць на іх знізу, ад саменькай зямлі!..

Для дарослых адкрыта дарога і ў той пад'езд, праз які выходзяць на адну вуліцу, і ў тыя вароты, праз якія сюды заходзяць з другой вуліцы машыны. А малым — ну, тым малым, што гуляюць ужо без бабулі ці мамы,— малым на вуліцу з двара выходзіць забаронена.

Праўда, і тут, на іхнім двары, вельмі многа цікавага. І гаражы, і дрэвы, і горба пяску каля плота, і два сабакі: Лайка з чырвонага дома і Шарык — таго Алёшкі, што Гарыкаў старэйшы брат і называецца Другагоднік.

Ды што ж, калі час цяпер такі, што ўжо не лета, і ўжо не восень, і яшчэ не зіма. І ў пяску ўжо не пагуляеш, і лістоў, нават жоўтых, на дрэвах няма, і снег ніяк не ідзе.

А самае найгоршае... Не, гэта самае най-

лепшае!.. Словам — гэта музыка, што чуецца адтуль, дзе за высачэзнымі сценамі трох дамоў ёсць плошча і помнік, а на плошчы стаяць або ходзяць салдаты. Гэта — ваенны аркестр, і ён рыхтуецца да кастрычніцкага параду.

Ах, як добра таму, каго ўжо аднаго пускаюць і на вуліцу, і на плошчу. Ён там убачыць не толькі салдатаў у шэрых шынялях і шэрых вушанках, не толькі іх бліскучыя, галасістыя трубы. Калі над плошчай грымне радасны марш, дык на скверы з дрэў гулліва цярушыцца першы іней, а белы дзядок, што ледзь, здаецца, тэпае тратуарам, і той пачынае ў такт пастукваць кіёчкам.

Добра таму, хто ўжо вырас!

Зрэшты, вялікім лічыць сябе — прыемна кожнаму. Нават і хлопчык з чырвонага дома — у чорнай шубцы, з якой асабліва прыкметна выраслі яго тонкія ножкі ў сініх абцяслых штоніках і рукі, што заўсёды без рукавіц,— нават і ён лічыць сябе вялікім. Так і гаворыць часта: «Калі я быў яшчэ малы...» А самому чацвёрты месяц на пяты год!..

Асабліва зручна яму лічыць сябе дарослым побач з кругленькім трохгадовым жэўжыкам у цёплым паліто і з румянымі шчоч-

камі, што не ўмяшчаюцца ў цыгейкавай шапцы, калі яна завязана пад падбародкам.

Гэта сябры. Яны заўсёды разам.

Той дзядзя Толя, што Святланін тата і жыве ў адным пад'ездзе з Шарыкам, калі ідзе дахаты ці на вуліцу, заўсёды спыніцца каля іх і скажа меншаму:

— Здароў, Саша!

— Я не Сяся.

— А хто ж ты?

— Я Міся.

А большы, не чакаючы:

— Ён Міша, а я, дзядзя, Юрка.

— Ну, — здзіўляецца дзядзя Толя.— Харошыя вы хлопцы, калі аб'ектыўна сказаць. І абодва.

Яшчэ і руку падасць аднаму і другому. І такую вялізную, дужую, цёплую!..

На двор гэты, з трох дамоў, збіраецца, вядома, шмат і хлопчыкаў і дзяўчатак. Але сёння Юрка і Міша выйшлі чамусьці раней за ўсіх.

Па праву большага гульню і сёння прыдумаў Юрка.

— Ты будзеш кракадзілам,— сказаў ён Мішку.— Ты стань на ручкі і на ножкі і рабі роцікам так: хап! хап! гырр!.. А я буду цыклоп, як у кіно, і я буду на цябе нападаць...

Мішка згадзіўся. Але, стаўшы на карачкі, раптам уздумаў, што ён не кракадзіл, а коська... Нават заржаў тоненька — от дзівак!..

Слова за слова, і дайшло да сваркі. А потым Юрка піхнуў Мішку, той упаў на жывот і заплакаў, а сам больш спалохаўся і — наўцёкі. Ды зачапіўся неяк і пляснуўся, не дабегшы да ганка. Рукі яшчэ нічога, пабаляць ды ўсё, але калені — ох!.. Не толькі занылі, але і мокрыя... І што скажа мама, калі і ўчора яна сушыла яго порткі на радыятары, і ўчора, і пазаўчора сварылася! І Юрка заплакаў таксама.

За сценамі недзе грымяць вясёлыя трубы, а два дзівакі равуць дуэтам — адзін стоячы, а другі яшчэ ўсё на жываце.

Ды тут на ганку з'явіўся нейкі незнаёмы дзядзька.

— А гэта што за эпапея, га? — спытаўся ён гучна і грозна.

Малыя сціхлі і ўталопіліся на яго.

Мішка нават устаў.

Яны яшчэ не ведалі, што гэта дзядзька Лапша, водаправодчык, які працуе ў кацельнай на другім двары. Загуляўшыся, яны не заўважылі, як ён прайшоў па двары, спусціўся ў кацельную іхняга дома і вый-

шаў зноў на ганак. І ім не ясна было, адкуль такі з'явіўся — злосны і чужы!..

А для дзядзькі Лапіны ўсё цяпер выглядала і ясна і проста. Ён толькі што выпіў. А не дабраўшы меры, замкнуў сваю «фабрыку» на завалу і прыйшоў сюды, да сябра і калегі, водаправодчыка Кіпеня. Пабалакаць думаў ці можа яшчэ што-небудзь... А тут і ў Кіпеня «фабрыка» на замку. Помпы толькі шумяць за дзвярыма. Сарвалася. А назад спяшацца няма чаго — можа хутка надыдзе?..

Дзядзька гэты толькі адразу напалохаў хлопчыкаў. А потым аказалася, што ён вельмі добры. І ручкі ім абцёр, і слёзы Мішку выцер кіпцем і гаворыць:

— У вас, браткі, без паўлітра не разбярэшся, хто вінаваты, а хто не. Ну, ты не плач... Які ж з цябе пасля гэтага можа быць кракадзіл?.. А музыка, хлопцы, якая! Чуеце? О!..

Ён нават заспяваў, размахваючы рукою:

Вьется, вьется знамя полковое,
Командиры впереди,
Солдаты, в путь!..

— Хар-рошая музыка, хлопцы!.. У нас, на партызанскім парадзе,— сказаў ён, сядаючы на асфальце каля сцяны,— марш

ігралі, праўда, не такі. Трам-та-ра-ра, трам-та-рам!.. Такая, браткі мае, эпапея!.. Вось вы пабіліся, засмэркаліся, і толькі. А ў нас бывала — не дай і не прывядзі!.. Ты ведаеш, адзін з другім, што такое блакада?

Юрась і Мішка стаялі побач, глядзелі на дзядзьку, як зачараваныя. І маўчалі.

— Ды адкуль вам, браточкі, ведаць пра тую блакаду!.. А мы ляжым напрадвесні. У сорак трэцім. Балота, лес. Холад, голад. Навокал немцы. Грошай — ні капейкі... Цьфу!..

Ён памаўчаў.

— Там яшчэ нічога,— пачаў пасля.— Адтуль мы вырваліся. Не ўсе, праўда... Але мне на той раз пашанцавала. Затое другі раз мяне джыганула сюды вось. О, так я ляжаў...

Дзядзька прылёг на сухім каля сцяны асфальце і паказаў:

— Ляжу. А потым толькі хацеў ірвануцца ў перабежку, толькі, шануючы вас, казённую частку падняў, а куля — дзык!.. А другая ў руку! А трэцяя вось тут, у грудзі!.. Рэшата! Эпапея! Вось, браткі, што такое фашысты і што такое вайна!..

Дзядзька як лёг, так і астаўся ляжаць на сухім. Толькі на бок павярнуўся. І галаву рукою падпёр.

— А цяпер,— сказаў ён,— музыка табе іграе, кроў маладая кіпіць, і хоць бы хны... Тры разы ўрадам адзначаны. А сам папсаваўся ўшчэнт... Драмануць, пакуль той Кіпень прыйдзе, ці што?.. Ну, маладыя людзі, прашу хвілін пятнаццаць цішыні...

Дзядзька заплюшчыў вочы.

Хлопчыкі пастаялі трохі, а потым Юрка, зусім-зусім забыўшыся пра сварку, узяў Мішку за руку, адвёў да плоціка і шапнуў малому ў самую шчочку:

— Ты тут стой і глядзі... На вось гэтую палку! І стой ды глядзі. А я хутка вярнуся...

А сам пабег у той пад'езд, што на вуліцу.

...Цёця Зоя Пятроўна, тая, што Юркава мама! На гэты раз не карайце вы свайго хлопчыка, што ён забыўся на ўсе забароны і абяцанні і сам пайшоў на вуліцу!.. Зрэшты, трэба, вядома, і паўшчуваць, бо да мэты яго — ажно два скрыжаванні, дзе мноства машын. Толькі ж любіце яго яшчэ больш — за смеласць, за чулае сэрца...

Юрка ідзе на плошчу, на голас салдацкіх труб.

Шчасліва перабраўшыся цераз адно скрыжаванне, ён пайшоў да другога. Дарослыя кажуць, што гэтай дарогі — адзін толькі квартал. А колькі ж тут цікавага!

І магазін, дзе прадаюцца кніжкі, кубікі, каляровыя алоўкі. І дзіцячае кіно, дзе ён глядзеў учора з Анькай пра цыклопа і кракадзіла. І сквер з фантанам, дзе вясною зялёныя каменныя жабы зноў будуць пырскацца з рота вадою. А вунь, на рагу, улетку цёця прадае марожанае... І хутка будзе другое скрыжаванне, за якім — салдаты.

Але тут...

Ох, так, не ўсё ў жыцці збываецца!..

На тратуары перад Юркам стаяў Святланін тата, дзядзя Толя.

— А ты, браток, куды? — спытаўся ён.— Куды ж гэта ты адзін?

— Там... фашысты дзядзю пакрыўдзілі... Дзядзя харошы, а яны яго кулямі пастралялі! І ён ляжыць...

— Дзе ляжыць? Што ты выдумаў?

— Я не выдумаў. Ён — партызан. Ён праганяў іх, а яны...

— Э, браток, нічога мы з табою тут... Пайшлі на месца злачынства. Вядзі!

Юрка згадзіўся. Калі яго ручка, азяблая без рукавіцы, апынулася ў дужай, цёплай руцэ дзядзі Толі, ён канчаткова адчуў, што справядлівасць хутка пераможа. І без салдат. Бо дзядзя Толя сам вялікі!..

Аднак на дварэ іх чакала поўнае расчараванне.

Дзядзькі таго ўжо не было.

І Мішка ўжо не стаяў каля плоціка, а ішоў сабе па сцежцы. Нават і без кіёчка.

— Ну?— спытаўся дзядзя Толя, пусціўшы Юркаву руку.— Як ты мне, браток, усё гэта растлумачыш? Дзе твой дзядзя і дзе фашысты?

Юрка стаяў разгублены.

А Мішка стаіць і ўсміхаецца.

— Што, румяны? — спытаўся ў яго дзядзя Толя.— Як жа ты, браце-салдаце, на варце стаяў? Дзе ж ты падзеў таго дзядзьку?

І Мішка расказаў:

— Пгысёў дгугі дзядзя... дзядзя з кацельні і зябгаў дзядзю... Дзядзі пайсі туды!

Ен паказаў рукавічкай на дзверы ў падвал іхняга дома.

— Усё ясна,— сказаў дзядзя Толя.— У Кіпеня госць. А ты тут, Юрка, трывогу ўзняў.

Ды Юрка ўжо адышоў ад разгубленасці.

— А фашысты ж дзядзю пакрыўдзілі!..

— Ды гэта, браток, было ўжо даўно. І трэба думаць, што больш не паўторыцца.

— А дзядзя той харошы. Ён партызан! І ён герой!..

— Ну, так ужо і герой?

— У яго, дзядзя Толя, зорка на спражцы! Во тут. І вялікая! І Мішка, дзядзя Толя, бачыў!..

Дзядзя Толя дастаў з кішэні паліто папяросны карабок і запалкі.

Ах, як гэта добра — быць вялікім!..

Пакуль ён вымаў з карабка папяросу, а потым запальваў запалку, прыкурваў, зацягваўся — за сценамі дома, далёка на плошчы, вясёлым маршам грымелі трубы, а тут за рухамі ягоных рук хадзілі дзве пары вочак. Цікаўных, зайздросных, захопленых!..

— Ну, арлы! — сказаў дзядзя Толя.— Як бы там ні было, а вы, беручы аб'ектыўна, таксама героі. Абараняць пакрыўджаных — гэта па-нашаму. І гуляйце сабе. Пад музыку. Вы хлопцы дружныя, і гэта вельмі добра. Я пайшоў.

А ён не ведае, дзядзя Толя, што Юрась і Мішка нават трохі пабіліся...

Ну, і няхай не ведае ніхто.

— Я больш не буду, Мішка, цыклопам,— сказаў старэйшы.— А ты не будзь кракадзілам. Дай мне ручку! Хадзем пад гараж — я табе нештачка пакажу!..

ПАД ГОМАН ВОГНІШЧА

Званочкі

Спачатку бывае разлука, сяды-тады намёкі ў пісьмах, асабліва бліжэй да вясны, ну, а потым, нарэшце, сустрэча. Вельмі грунтоўны, урачысты прагляд і ўсебаковае абмеркаванне блёснаў, жылак, кручкоў; нарыхтоўка прадуктаў і неабходных для юшкі спецыяў; перааблачэнне ў вопратку, што зробіць нас значна бліжэйшымі да прыроды... І вось — выходзім. З цэлымі калчанамі рознакаліберных, складных вудзільнаў, навярблюджаныя рукзакамі, з выгляду вельмі сур'ёзныя, нават важныя і заўсёды, вядома, з салодкай, амаль дзіцячай надзеяй у сэрцы...

Было ў маёй вёсцы калісьці такое, што самы, здаецца, неадпаведны для гэтай справы чалавек, падсухі і злосны бацька вялікай, беднай і працавітай сям'і зусім нечакана, наўздзіў суседзям захапіўся вудамі. Хоць бы ўжо, на добры лад, шчупацкімі, а то возьме, як блазен, два дубцы,

банaчку чарвякоў, некалькі вараных бульбін ці лусту нячэрствага хлеба і — загуменнай дарогай — пашпарыў да рэчкі. Рыбы тае, вядома, мала хто бачыў, а вось як ён, дзядзька Рыгор, апраўдваўся — старэйшыя памятаюць і сёння. Нават не толькі старэйшыя, але і ўсе рыбакі нашай вёскі гадоў ужо з трыццаць пацяшаюцца пры няўдачы:

— Не інцярэсна, брат, як злапаеш, а інцярэсна, як яна бярэцца!..

Так пацяшаюць сябе, зразумела, у канцы рыбалкі. Ну, а спачатку... -

Ды, зрэшты, бліжэй да справы.

Пагодлівым чэрвеньскім адвячоркам, на старым рэйсавым кацеры «Партызан», прайшлі мы кіламетраў з трыццаць па Бярозе, уверх ад Бабруйска, і капітаны высадзілі нас на дзікім беразе'— па нашай просьбе.

Тут яно, як казаў у дарозе Андрэй, і пачнецца.

Аднак сцямнела нам і напуста і вельмі хутка. Не толькі не злавіўшы нічога, але і не наляпаўшыся ў ахвоту блясной, мы ўспомнілі пра начлег. Усё — наперадзе!.. Пайшлі па росным лузе ў недалёкі лес.

Неўзабаве весела гарэў сушняк, скварчала і капала на ражончыках сала, была чарка і добрая гутарка, на ўзводзе той мужчынскай шчырасці, што бывае нячаста, хутчэй за ўсё — пад натхненнем... Потым Андрэй мой захроп, а я пачаў дзяжурыць.

Над лесам — поўны, таямнічы месяц. Смейцеся, калі смешна, а мне заўсёды хочацца спяваць, калі гляджу на месяц у самоце — я і ён... Цяпер я нават сігналю яму агнём. І вогнішча маё трашчыць жывым сасновым трэскам. Падкінеш галіну, другую, полымя нападзе на ігліцу, і шум ягонай прагнасці адразу нагадвае грукат далёкага грому. За цэнтрам свету — за вогнішчам — чуваць навокал іншыя гукі жыцця. На дальніх подступах бездапаможна ныюць камары — амаль што не чутно. Аднастайна, па-графаманску назойліва торгае драч. Самаздаволена, перакормлена крэкчуць жабы. З вечара за ракою даволі доўга чуваць было натужлівае, з перапынкамі, рохканне аўтамабільнага матора: грузавік змагаўся недзе з гразкаю лагчынай. Пасля, апоўначы, па рацэ прайшоў апошні параход, нястомна, мерна працуючы пліцамі, над самым берагам ведучы вясёлы пункцір аконных агеньчыкаў, якім таксама не спіцца...

Не спалася мне, прызнацца, трохі і ад таго, што я неяк дзіўна, бескантрольна пабойваўся, што і лес, чаго добрага, можа загарэцца, калі пакінуць вогнішча адно, што і надысці хто-небудзь можа на сонных ды насмяяцца... А больш дык не спаў я таму, што думаў.

Не глыбока. Я і наогул не ведаю, калі гэта іменна думкі бываюць глыбокія. Проста ўспаміналася тое самае не ўпершыню. Як гэта некаторыя кажуць: «Давай пагуляем у карты, або хоць да Алеся сходзім, пабалакаем — усё час пройдзе хутчэй...» А я вось канчаю чацвёрты дзесятак і ўсё адчуваю, што час ідзе, што ён бяжыць бязлітасна хутка. І страшнавата ўжо бывае, і шкада, што ўбачана і зроблена так мала!.. І хочацца спяваць пад ціхім, чыстым небам, у самоце. Хутчэй за ўсё — тую простую і глыбокую, як і само жыццё, песню пра адзіноту на крамяністым шляху...

На Бярозу пайшлі мы, вядома, да сонца.

Над лесам — той самы месяц, толькі збялелы. Па роснай траве, ад лесу — цёмная сцежка нашага следу. Барвяны вялізны круг сонца за дрэвамі. Прыгожая, ласкавая — і верыцца, што не скупая,— рэчка...

Ды тут, як кажуць, жыццё ўнесла папраўку ў наш паэтычны, амаль малітоўны

настрой. Дзікую, варварскую папраўку! Чортведама адкуль узяўшыся, спачатку пачулася тахканне матора, а потым глухія падводныя выбухі. Які там спінінг цяпер і які там настрой!.. Калі яны, гады,— шэсць чалавек на службовым кацеры з цынічнай тут назвай «Прагрэс»,— параўняліся з намі, мы пачалі гаворку... Ды што ж, у нас было адно толькі справядлівае грамадзянскае абурэнне, а ў браканьераў — грубая сіла, сучасная тэхніка і поўная, вызваленая ад усякіх там маральных тонкасцей, недасягальнасць на шырокай, глыбокай вадзе. Гырканyўшы нам напаследак штосьці накшталт «вось стаіце, дык стойце!», яны тут жа, за паваротам, вухнулі новы зарад. І далей... І зноў... Хочаш цяпер — ідзі ўгору, хочаш — уніз па плыні: шчасце будзе адно.

Так мы і прахадзілі да паўдня, злавіўшы на двух адну рыбіну...

Юшка, аднак, была. Гарэла сапраўднае вогнішча, на гаку, ствараючы ўражанне ўдачы, пахла смажанай цыбуляй, гарачым салам і, калі добра прынюхацца, нават і рыбай. У салдацкім Андрэевым кацялку, адзін на прасторы, то нырaў, то ўсплываў у кіпені, разам з кавалкамі бульбы, бяльмасты акунёк... У адчаі і смутку мы дапілі

сваю «Белавежскую горкую», павесялеўшы,— пакупаліся, і я заснуў. Пад дубам, на густой, халаднаватай і духмянай аўчыне мурагу.

І сніўся мне,— нібыта за думкі начныя і сумную раніцу,— радасны сон.

Вось я — той самы, што быў у дваццаць год. Учора забраў з сенажаці апошняе сена, вечарам здорава пакупаўся, спаў на сене, але не заспаў, хоць і нядзеля. Бо я ўставаў пісаць, і, божа мой, як мне пісалася ўсю раніцу, якое гэта будзе добрае — ад самай залатой зямлі да самых белых воблакаў — апавяданне!..

Спёка стаіць над спелым жытам, над пакошамі паплавоў, над палосамі цёмна-зялёнай, папярэшчанай белымі кветкамі бульбы... А я, па гладкай сцежцы ў трыпутніку, еду на ціхім, гонкім веласіпедзе і ўжо цалую, заплюшчыўшы вочы, у думках цалую гарачыя губы маёй нядаўна знойдзенай, ні з кім, ні з чым не параўнанай радасці. І ўсё навокал — маё, і ўсё яшчэ наперадзе, і я зраблю так многа добрага, цудоўнага — о, я зраблю напэўна!..

І хоць нікога навокал няма, хоць ніхто не ідзе, не стаіць на маёй дарожцы, я націскаю на лапку бліскучага званка, і ён, як жаваранак, прачнуўшыся, сярэбрана цві-

рынькае ў спакойным, каласістым жыце. Яшчэ, і яшчэ, і яшчэ раз!..

І ўжо іх многа, такіх званочкаў навокал, нібыта нават яны ліловa-сінія і пахнуць, як у казцы. І ўсё звіняць, шчасліва і настойліва звіняць!..

І я, нарэшце, расплюшчваю вочы.

Паварочваюся на спіну, гляджу на дубовае шэрае голле, у нерухомы лісцяны гушчар. Успамінаю, як маці мяне, яшчэ маладзейшага, чым у сне, пасылала на суседскі двор — папрасіць ды наабломваць з іхняга дуба лісту ў агуркі. Саліць іх будзем, дык трэба, каб былі аж да вясны крамяныя. Успамінаю Гогаля. Такога іменна, якім я жыў у тыя дні: з бясконцым, невычэрпным і, як спелыя яблыкі, сакавіта-смачным смехам.

«Прекрасные жита по дороге! восхитительные!.. Странно, что перепела до сих пор нейдут под дудочку...»

А потым успамінаецца і тое ў Гогаля, чаго я калісьці не мог зразумець так глыбока, так горка, як сёння, з дыстанцыі часу.

«О моя юность! О моя свежесть!..» —
з уздыхам шапчу я, і словы гэтыя да самай глыбіні душы становяцца, як ніколі раней, маімі.

Ды што гэта — я ўжо не сплю, а званочкі яшчэ ўсё звіняць?

Саджуся. Заўважаю, што побач са мною спіць Андрэй; паходныя нашы манаткі — у поўным развале ляжаць на траве;- сонца добра схіліла з паўдня; вогнішча на пяску даўно, відаць, асела попелам, а побач з ім — нямыты кацялок і костачкі ад марнага, але па-брацку падзеленага ўлову...

Няхай жыве тым часам проза! Андрэй са смакам пахрапвае, лежачы на спіне. Кляплю яго па жываце і, разбудзіўшы, гавару:

— Ну што, «не інцярэсна, як злапаеш»? Уставай, брат, паслухай. І што за музыка! Андэрсенаўшчына на яве.

Мы закурваем, седзячы на траве, і смак духмянага, церпкага дыму вяртае нас яшчэ больш да сапраўднасці.

А яны ўсё звіняць!..

Ужо не толькі я, а і Андрэй іх чуе.

— Пайшлі на ўзгорак,— кажа ён.— Паглядзім.

Узыходзім, і тут нам становіцца яснай уся тая музыка.

На цэлым табуне рознамасных коней, хто проста верхам, хто бокам, а хто і на мяшэчку з сенам — шырокім фронтам — едуць, едуць, едуць цыганы. Адны мужчыны. Кожны ў ботах, хоць сам усё роўна

не паголены. А ў кожнага каня — пад шыяю званок...

Дык што ж гэта, калі падумаць, за праява?

Тут табе хутка сорак год пасля перамогі пралетарскай рэвалюцыі, тут табе навокал — «хоть три года скачи» — калгасна-індустрыяльны сацыялізм, хто не працуе — той не есць, а яны, лайдакі скалазубыя, нібы пазіруюць для самай шырокаэкраннай, самай каляровай і эпічнай кінакарціны з мінулага. На ўласных конях, добра такі незаконна адпасвеных, топчуць сабе незаконна ды ў белы дзень грамадскую сенажаць і — хоць бы што! Чарнамазыя, барадатыя і безбародыя, кучаравыя і ў кепках, дай божа — кавалі, а то дык канакрады, карцёжнікі ці проста так сабе, свабодныя мастакі на ўтрыманні сваіх языкаста-рукастых варажбітак. Едуць вось, бесклапотна смяюцца і хмельна гамоняць. Сытыя коні то нагінаюцца раз-поразу да высокай травы, то туляць вушы, скаляць зубы і паіўкваюць адзін на аднаго, то проста ідуць кудысьці, руплiва, нават весела ідуць... І небывала, можа, зусім небывала ў гэтых мясцінах таленькаюць, шчасліва перазвоньваюцца, гутараць маленькія званочкі...

— Коней, мусіць, паіць,— азваўся нарэшце Андрэй.— Там жа вунь брод за вербамі.

Ён нечакана засмяяўся.

— Ты чаго?

— Ходзяць немцы і абіваюць бераг лесу.

— Ну?..

— А гэта, брат, у блакаду... Немцы і іх, цыганоў, ганялі па пушчы. Хацелі вынішчыць, нібыта — як партызанскіх памочнікаў. Мы тады неяк на жалезку прабіраліся, выкручваліся ад карнікаў, і напаткалі цэлы цыганскі табар. «Адкуль ідзяце?» — «З-пад Рудні»,— кажа самы аброслы бэчка[1], важак. «А што там чуваць?» — «Ходзяць немцы і абіваюць бераг лесу». І стаў гэты выраз у нашым атрадзе крылатым. Не прынясе, скажам, разведка талковых звестак, так і смяюцца з яе: «Што, абіваюць немцы бераг лесу?..» І тол мы з тых дзён называлі цыганскім мылам.

— Чаму?

— Ды неяк яны былі да нас прыбіліся зноў. Абадраныя, галодныя — адно страхоцце!..

Барыс наш якраз баранчыка разбіраў,

[1] Бэчка — бацька ў цыганскім вымаўленні.

дык цыганяты накінуліся на трыбухі, давай ірваць рукамі ды глытаць. А рукі тыя, відаць, ад роду нямытыя. Барыс даў ім мяса. Кінуць кавалак у агонь ды, доўга не чакаючы, хапаюць — проста рукамі з прысаку — у рот!.. Накармілі мы іх і з сабою далі. А самі паехалі, здаецца, гарнізон у Тарычы граміць. Дык яны ў наш лагер падкраліся — там быў адзін вартавы, разявака,— ды ўсё пакралі. І тол. Бо думалі, што гэта мыла... Памочнічкі! Не дараслі яны, каб памагаць, хоць каму-небудзь. Нагогул, брат, каню цыганскаму пад хвост такая вольніц.а!..

— Ну, а цяпер — куды яны цяпер? Дзеля чаго ім гэты звон?..

Крыху пазней, ад сустрэчнага чалавека, мы даведаліся, што недалёка адгэтуль, на ўзлессі, другі ўжо дзень шумела цыганскае вяселле. І гэта мужчыны-вясельнікі проста ехалі да ракі.

Аднак і ад гэтага тлумачэння, і ад цвярозай Андрэевай праўды справа не стала звычайнай.

Вось ужо колькі гадоў мінула, і цыганы ўжо нібыта не валочацца, зноў прывыкаюць да аселага, працоўнага жыцця,— а яно часамі возьме ды вернецца зноў... Што — яно? Ды луг у квецені, сыты табун і зва-

ночкі. Безліч маленькіх, сардэчных званочкаў!..

І такое табе (для скептыкаў — такі нават анахранізм) злагоджвае рыбацкую няўдачу.

Зрэшты, рыбак з мяне, нават і мякка кажучы, не вельмі ўдалы. Мне таксама куды больш «інцярэсна, як яна бярэцца». А не бярэцца, дык ёсць уражанні, думкі, сустрэчы. Іх заўсёды хапае. І яны, калі праўду казаць, даражэй мне за ўсё. Бо ў мяне часамі нібы і зайздрасці рыбацкай няма. Вось і цяпер — магу нават прызнацца, што таго бярозаўскага акунька злавіў, вядома ж, не я...

Шчодрая Ясельда

Мясціна гэтая была заўважана яшчэ з акна аўтобуса.

Бясконцыя палескія лугі; шырокая, спакойная рака, аблямаваная алешнікам і лазняком; высокі, доўгі, няскончаны мост; хата дарожнага майстра, да якое з насыпу за мостам сыходзіць трэба па крутой сцяжыне, потырч, весела.

Была субота, вечарэла, рабочыя пайшлі ўжо з маста,— нікога нідзе ні душы. Толькі над хатай дарожніка, яшчэ больш пад-

крэсліваючы гаючую цішыню і пустыннасць, сціпла дыміўся комін.

Аднак тады спыніцца тут мы не маглі. Вогнішча наша загаманіла над велічна ціхай Ясельдай толькі на трэці дзень.

...З зялёнага ляснога гарадка сюды прыехалі з намі два маладыя настаўнікі, Генадзь і Мікола.

Планавалася рыба і юшка. На рыбу была ў нас надзея, зранку — нават упэўненасць, два спінінгі і чатыры вуды. На юшку хлопцы ўзялі сваю халасцяцкую каструлю, скавараду і некалькі бульбін. Соль, цыбуля, перац і ліст ляжалі ў адным з нашых рукзакоў. Ну, а вада, вядома, там, дзе і рыба.

Чуў я аднойчы на Сажы, як пасажыры параходзіка, мінаючы плыты, гукалі плытнікам: «Дзядзька-а, можа вады даць?!» А тыя нават галавы не паварочвалі — такая сумота была, здаецца, на доўгіх, павольных «лавах» бярвенняў...

Нам таксама хапала вады. Вады, зеляніны і сонца. Спёка стаяла ўвесь дзень на саменькай мяжы вялікай навальніцы. Навокал, нізка над даляглядам, як быццам хмурылася, пагруквала, таямніча і насцярожана, а дождж усё не ішоў. І рыба не хацела брацца ні на блёсны, ні на нажыўку.

Упэўненасць наша была растрачана хутчэй, надзея — больш павольна. І не было каму гукнуць з другога берагу ці з лодкі:

— Дзядзька-а, а можа рыбы даць?!

А юшка была нам вельмі патрэбна. Бо не маглі ж мы так сабе адправіць гэтых мілых, дружных юнакоў, што аддалі нам столькі ўвагі дома, правялі нас сёння ажно сюды... І вядома ж, як толькі з-за сітняку да нас падсунуліся на чоўне два мясцовыя рыбакі, што правяралі гэты бераг трыгубіцай, мы, амаль не змаўляючыся, дружна пайшлі на ганьбу... Словам, абед быў рыбацкі.

Тады ўжо, добра такі падвечар, з адносна лёгкім сэрцам адпусцілі мы з Андрэем нашых гасцей на аўтобус, а самі заселі ў завоіне з вудамі.

І іменна тады, як на злосць, пачала брацца рыба. Плоткі. На хлеб.

Блаславёнае люстра спакойнай, глыбокай вады. Самаробны, з гусінага пяра, або блакітна-белы, куплены паплавок. Яго трывожнае, хвалюючае торканне. Рашучы момант падсечкі і — вяршыня рыбацкай радасці — жывое супраціўленне!.. Як добра, што ўсё гэта так свежа і здарава хвалюе цябе ад самага пастушынага маленства, дае так многа ціхай радасці, нават і не пытаю-

чы: сапраўдны ты рыбак ці проста пэцкаль?! І рэчка, і неба, і гуллівы, несціханы шчэбет птушак ці самавіты, высокі гул самалёта, ідылічны покліч пастушынай трубы ці голас заўсёды чамусьці няўпэўненага і хрыпатага піянерскага горна — усё цяпер напоўнена вялікім і глыбокім сэнсам, радасным рытмам вечна маладой бадзёрасці, зноў і бясконца свежай прыгажосцю.

Час ад часу з кручкоў у глыбокую траву лажыліся шалпатлівыя плоткі.

А штосьці ўсё нам замінала... Пад вялікім лазовым кустам, справа ад нашай завоіны, штосьці ўсё плюхацела, булькала, фыркала... Ну, што за чорт?! Андрэй асцярожна палез у куст, моўчкі пароў у той шолам сухой галінай, паціскаў плячыма, круціў галавою. Пасля пад узгоркам, на якім я сядзеў, пачулася шорганне. Нехта поўз пада мною, шалпочучы нечым сухім. Потым той нехта аціх. І я чакаў яго амаль з кашэчай насцярожанасцю. Зноў шалпочацца!.. Ціха. Андрэй сядзіць зноў ля вуды. І вось пад кустам той самы нехта зноў пачынае сваю работу — нібы пялёнкі палошча, а потым нібы купаецца, плавае ціха і весела, лішне не плёхаючы, намагаючыся не засмяяцца з недаўмення насцярожаных рыбакоў.

— Выдра,— сказаў нарэшце Андрэй.

«Не лічачы заапаркавых клетак, мне толькі раз давялося бачыць яе жывую і амаль што зблізку. Я ляжаў у траве, задумана гледзячы на раку; каля аеру стаяла на прывязі лодка; і вось на лодку яна выбегла, відаць, упэўненая, што нікога няма. Прабегла краем борта да самага носа і ціха, не па-бабрынаму ціха нырнула.

Ёсць нешта незвычайна прыемнае, нават радаснае ў такім вось маўклівым сузіранні. Так падкрадаўся я калісьці, юнаком, да кулікоў на бродзе. Нават апавяданне пра гэтае шчасце пачаў. Яно прапала ў вайну, і я ўспамінаю яго, міжвольна і даволі часта, з нейкім салодкім сумам, нібыта штосьці беззваротна дарагое...

Паказацца — ну, гэтай раскошы выдра нам не дала. Дый нас яна, відаць, не бачыла. Бо не сціхла пад кустам да самай ночы. І здорава абрыдла нам, нягледзячы на ўсю яе экзотыку.

А плоткі браліся, не зважаючы на выдрынае плюхаценне. Да самага змяркання браліся, пакуль і гэтае шчасце нас не здаволіла. Выпатрашыўшы свой, сёння зусім нечакана багаты, улоў, мы разлажылі яго на роснай траве і накрылі мокрым аерам — да раніцы.

З начлегам таксама пашанцавала. Недалёка ад нашай багатай завоіны мы яшчэ днём заўважылі месца нядаўняй, хутчэй за ўсё піянерскай, стаянкі — два логавішчы з сухога ўжо аеру ды галля і цэлая горба алешніку, не спаленая добрымі людзьмі за ноч. Адно логавішча мы пакінулі, а другое, расцерабіўшы, падцягнулі да горбы ламачча. Зашугала вясёлае, фантастычна прыгожае вогнішча.

Зноў была добрая гутарка. Зноў было непустое маўчанне. І радасць пазнавання — свету і людзей.

...Амаль на кожным дварэ сохне бясконцае павуцінне рыбацкіх сетак. Амаль на кожным хляве ці на хаце — буслянка. Бусляняты, раскрыўшы яшчэ не чырвоныя дзюбы, разморана, бездапаможна хекаюць ад спёкі, а бусла, здаецца, можна, прыўстаўшы на пальчыкі, пагладзіць рукою: і гнёзды нізка, і бусел тут — ледзь не хатняя птушка.

У гэтай лясной, лугавой, балотна-пясчанай, як можна падумаць, патрыярхальшчыне радасным дзівам выглядае звычайнае: новая школа-адзінаццацігодка. Малады энергічны дырэктар паказвае нам класы,

кабінеты і майстэрні. І мне здаецца, што яму і нялёгка і радасна змагацца з жаданнем хоць намякнуць як-небудзь, што ён не прыйшоў сюды з інстытута на гатовенькае... Але ён і намёку не робіць. Выходзім на двор. Загарэлы, у блакітнай майцы і ў саламяна-залатым капелюшы гаспадар адчыняе гараж, з немалою затратай свае зайздроснай энергіі заводзіць стары грузавік, садзіцца за руль, бярэ ў кабіну Андрэя, і вось — па шырокай пясчанай вясковай вуліцы — мы ўлятаем у лес.

Пасля ўчарашняга дажджу, прыгрэты руплівым з самага ранку сонцам, лес хмельна пахне прэласцю і жывіцай. Голле гарэзліва намагаецца сцябаць нас па тварах, але мы нагінаемся ў час і ахвотна — Генадзь, Мікола і я. Цёплы духмяны вецер фурчыць у вушах, малодзіць шчокі і весела плюшчыць вочы.

Лес пераходзіць у поле, лясная духмянасць змяняецца хлебнай. Якое добрае жыта! Як роўна падняліся на тарфяніках каноплі! Пахадзіць бы ў іх гушчары так праз месяц, калі яны ўзнімуцца казачным лесам, падыхаць бы тады іх водарам... За тарфянікамі — лугі, перасечаныя ўпоперак нашай грэблі вадзяною стралой канала. Што тут за прагля была калісьці? Зноў пачынаец-

ца лес. А вунь і вёска, таксама з буслamі ды сеткамі.

Тут мы спыняемся каля святочнай чарады мужчын, дырэктар наш па-свойму хутка дамаўляецца з матарыстам, той забягае ў хату, пасля лезе да нас у кузаў, і вось мы едзем зноў, да возера.

Бывалы грузавік сціпла становіцца ў цяньку — як быццам гэта не ён так хвацка прымчаў нас сюды. На беразе, каля доўгіх падмосткаў, прывязаны чатыры вялікія лодкі.

Матарыста завуць Раман. Гэта маладжавы, азёмкаватай дужасці мужчына ў гумовых ботах і ў скураной шапцы. Ён адмыкае свой «склад», проста будку з аполкаў, удвох з дырэктарам яны выносяць і прыладжваюць матор. Адпіхаем лодку на глыбейшае, сядаем. Капітан наш гаворыць нешта, узмахваючы рукой, але мы ўжо не чуем яго з-за грукату...

Маторы добра слухаюць палешукоў!.. Гэтая думка весела прыходзіць да мяне ўжо на поўным ходу, на люстраным і цёплым, здаецца, бязмежным прасторы.

Вогнішча наша раскошна гамоніць на лузе над ціхай і шчодрай Ясельдай. Не ціх-

нуць птушкі ў зарасніку. Настойліва лютуюць камары. У паднябессі час ад часу прамармыча самалёт.

Холадна было б нам тут, у зялёнай і мокрай пустыні, пад касмічным бяздоннем,— холадна і журботна!.. Ды ў нас ёсць вогнішча, і мы — у гутарцы — не здзіўляемся, чаму гэта наш далёкі, у злубянелыя скуры ахутаны продак мог пакланяцца, як першаму богу, агню. У нас ёсць дружба, і мы то грэемся словам, то дружна маўчым, кожны па-свойму, але не самотна. У нас ёсць родная зямля і роднае жыццё, і мы то гаворым пра гэта, то думаем, кожны сабе і канкрэтна,— успамінаючы новую, свежую прыгожасць і мясцін, і людзей.

Я ўспамінаю возера. Больш — вячэрняе і начное.

Раман прыехаў па нас на востраў вечарам, калі ўжо заходзіла сонца і залацістая дарожка здавалася на даляглядзе выпуклай, нібы барвяны шар цягнуў яе да сябе, як магнітам. Падбадзёраны чаркай і юшкай, не вельмі гаваркі дагэтуль матарыст ажыў. Павесялеў нават яго стары матор. А ўсё ж да статка на супрацьлеглым беразе, па даярак і малако, мы дабіраліся доўга.

Сонца зайшло, і дарожка на вадзе, як палатно на поплаве ў руках румянай дзяўчыны, згарнулася, сабралася ў зару. Зрэшты, ужо і чырвань зары пачала набірацца блакіту і блекнуць. А ўсё ж на фоне яе, чым бліжэй мы падплывалі, тым выразней вырысоўваўся лагодны ўзгорак палявога берагу, дрэвы, кусты, адзінокая хата з трыма агеньчыкамі-вокнамі і сілуэты кароў.

Да прычалу, па водмелі, мы ішлі на малых абаротах, а потым з шастом. Перш чым бразгат бітонаў, жаночыя галасы і звон тугіх струменяў у вёдры, пачуўся нам дзявочы смех і плёскат. Дзяўчаты купаліся зусім, здаецца, побач. Змрок, гусцейшы ў засені дрэў, замяняў ім купальнікі, пра што можна было здагадацца па смеху ды какетліваму вохканню над саменькай вадою.

Дырэктар і Андрэй затрымаліся каля хаты з гаспадаром. Генадзь, Мікола і я пайшлі за Раманам у хату, адкуль чуваць былі галасы і музыка.

Гэта маладзейшыя даяркі, хто справіўся раней і не пайшоў купацца, круцілі патэфон. Сустрэлі яны нас прыязна. Паставіўшы ў кут рукзакі і брызентавыя футаралы з вудзільнамі, не толькі без шапак, але і босыя, мы паселі паміж дзяўчат на лаве. Пачалася гутарка.

— Работа, кажытэ, цяжкая? То нам жэ ны прывыкаты. Толькі страшна бывае ўночы, як віцёр завывае, а гозыра — ой, мацёнько! — так разгайдаецца, а Раманаў маторчык, няма на яго ліха, закрэхча, запырхае і заглохнэ... Ну ты, пырыстань, Раман!.. Бо палучыш па руках. Нешта ты сённі расхрабрыўся... Хлопцаў у нашым сяле нэма. То ў арміі, то ў горад пораз'язжалыся, розумныкы... Там весялей, ого!..

Гаварыла гэта мая суседка па лаве, дзяўчына ўжо, нават па гутарцы пазнаў бы, сталая, якой куды зручней было б не скардзіцца разам з іншымі, а быць спакойнай і шчаслівай маладзіцай. Вось як гэтая, чарнавокая, што мяняе пласцінкі і толькі ціха глядзіць.

Самая маладзенькая з іхняй пяцёркі, Ганначка, днямі закончыла сем класаў. Тварык — амаль дзіцячы, а хустка, як у дарослых, завязана «пад бараду». Дый па ўсім поваpаце гэтага падлетка відаць, што вельмі ж ёй не цярпіцца стаць дзеўкай. Гатовая спяваць, танцаваць ці проста так вось слухаць патэфон і час ад часу самой прыкінуць слова да гутаркі, яна ўрачыста сядзіць на лаве, мілая сваім учарашнім маленствам.

Гаспадынін сынок, распоены сырадоем,

мардаты і шчабятлівы Сярожка амаль не сходзіць з дзявочых каленяў. Цёці гэтыя і казычуць яго, і цалуюць, і гушкаюць... З чаргі ён прыйшоўся і Ганначцы. І калі пястунок сеў у яе на каленях, ледзь не роўны з самою «цёцяй», Раману гэта здалося настолькі пацешным, што ён спытаўся, стоячы сярод хаты:

— А шчо, і ты ўжэ, Ганулё, хочыш маты люлі-люлі?

— От вы, дзядзько, якый!..— засаромелася малая. Яна тузанулася, босы Сярожка, як кот, гупнуў з каленяў на падлогу, а нянька абражана павярнулася бокам, капрызна падцяўшы румяныя губкі. Ды гэтага і не заўважыў, здаецца, ніхто, і сама яна хутка забылася і пра сорам, і пра злосць на смешнага сёння дзядзьку Рамана.

Бо ён прычапіўся ўжо да другое.

З цёмнай кухні ў хату ўвайшла высокая, бравая дзеўка гадоў дваццаці, задорна паўнагрудая, з харошай усмешкай на крыху запоўных губах. Мокрыя, светлыя валасы пад стракатай хусцінкай; ватоўка расшпілена на сіняй, у белы буйны гарошак, сукенцы; моцныя, стройныя ногі ў бліскучых, толькі што з вады, гумовых ботах.

— Купалысь, Наталачка? — пакланіўся наш матарыст.

— А ўжэ ж, Раманачка! — адказала дзяўчына бадзёрым, малайцаватым голасам.

— А плэчыкы так без мяне і ны змылі?

— Вой, дывысь!.. Зараз унукі будуць, а він... Ану, куды лезеш з рукамы?

— Колы ж бо я, Наталачка, толькі пабачу вашу чудэсну маладу красу, так бедныя гочы мoі...

— Вой, дывысь., якія яны ў цябе пузырыстыі, гочы!

— То, можа, хоць полячку? Посля купання вам...

— А вы, дідусю, нэ ўпадэтэ?..

Падражніўшыся трохі, Раман і Наталка ўзяліся за рукі, далоньмі пад локці, і, як толькі з пласцінкі пачулася полька, пайшлі.

Наш ахмялелы капітан тоўкся медзведзявата, хоць і відаць было, што калісьці, у свой час, ён мог. А Наталчыны светлыя вочы і поўныя губы ўсміхаліся так, нібы яна вось-вось і скажа: «Булы б кавалеры — сыдзіў бы ты, дзядычку, тыхо ў кутку дай ны рыпаўся бі..» Ні ватоўка, ні боты — нішто не магло перашкодзіць ёй быць маладой і прыгожай. Румянец выступіў на

шчоках, вочы загарэліся... Яны, дзяўчына і дзядзька, не кружыліся ў польцы, а на мясцовы лад то наступалі адзін на аднаго, то адступалі, на змену выбіваючы зусім, на жаль, не гулкімі абцасамі чачотку, манерна, з выклікам ківаліся ў бакі, ускідвалі галовамі, пасля кружыліся, а тады наступалі зноў... Раман, як мага стараючыся не адстаць ад свае былое танцорскае славы, ўсё ж такі сутуліўся. Затое Наталка хадзіла — адна любата!.. У іхнім тупаце ды гомане мне зноў пачуўся ціхі плёскат вады на азёрнай водмелі, гарэзлівы — цяпер я ведаю — яе смяшок у вячэрнім сутонні... Уяўляліся нават ласкавыя, з халадочкам, дотыкі кужэльнага ручніка да гарачых, апешчаных цёплымі хвалямі сарамлівых і гордых дзявочых грудзей...

— Вой, ныхай на цябе!.. Більш нэ можу...— нарэшце засмяялася Наталка. І так, здаецца, у час. Бо ўжо не толькі задыхаўся храбры на слове Раман, але і сам гаротнік-патэфон стаміўся...

Полымя наша вурчыць на пэўнай, супроцьпажарнай, адлегласці ад нас і грэе найбольш само сябе. Нават і на сухім аеры ды хлудзе, нават і ў ботах, адзетаму ды

пад плашчом — даволі такі холадна. Ад камароў ты накрываешся з галавою, зларадна слухаючы ў цёмнай духаце, як яны ваяўніча гудуць, таўкучыся над недаступнай спажывай.

А думкі, як растрывожаны рой, ніяк не хочуць угаманіцца...

Было бяскрайняе зорнае неба, а пад ім — спакойная і цёплая вада, таксама без канца і краю. Дзве вялікія лодкі, звязаныя насамі, цяжка нагружаныя людзьмі і бітонамі малака, ішлі, здавалася, проста кудысьці, у нейкі да лёгкай жудасці радасны, ахутаны сардэчнай журбою свет. Глухавата, але бадзёра тахкаў стары рабацяга-матор. І песня была пад высокімі зорамі — песня таксама бяскрайняя!..

Была яна таму, што без яе нам не хапала б чагосьці вялікага, вельмі істотнага ў нашым жыцці. Яна зліваласся з тым, чым мы цяпер жылі, як зліваецца калыханка з гудзеннем малога ці з любым бляскам яго бясонных вачэй, як зліваецца жніўная песня з гарачым шэптам калосся, а песня кахання — з тамлівай слодыччу і горкім сумам першых пачуццяў...

І словы былі ў гэтай песні, ды можна

было і без іх. І не таму, што — невядомыя — іх цяжка лавіць на ляту і вязаць у адно: да гэтай дужай, крылатай, душэўнай мелодыі прасіліся новыя, непаўторна свежыя словы, якія толькі тут ды толькі сёння маглі і з'явіцца.

Генка і я адны сядзелі на карме той лодкі, што з бітонамі. А побач з намі, крыху наўскасяк, плыла, нібы на экране, другая лодка — з песняю. Зачараваныя, мы слухалі, і я, як блізкія, пазнаваў у хоры два галасы: грудное, мяккае кантральта і пяшчотны, нясмелы званочак. Гэта Наталка — і тут без намагання першая — і сумавала, і рада была, што жыве. Гэта Ганначка з захапленнем у вялікіх дзіцячых вачах вітала радасць нялёгкай, хвалюючай сталасці. Гэта ўсе яны, вольна адчуўшы свае працавітыя рукі, песняй казалі цудоўнаму, роднаму свету, як яшчэ многа патрэбна ім чалавечага шчасця!..

Хацелася спяваць, і мы падхоплівалі іх запеў; хацелася маўчаць, і я маўчаў пад песню, у задуме...

Пакуль я любаваўся танцамі, гаспадархутаранец расказаў на дварэ Андрэю, што тут, дзе цяпер пасецца калгасны статак, на гэтай заазёрнай паўвыспе стаялі спрадвеку дзве людныя вёскі. Улетку сорак трэцяга

года фашысты-карнікі спалілі іх разам з людзьмі.

Газета пісала, расказваў дзядзька, што два галоўныя вылюдкі былі нядаўна апазнаны ажно ў Латвіі і там асуджаны на смерць. І з гэтага калгаса ездзілі пяцёх туды, на суд, за сведак.

«Ды што, таварышу, з тое іх, нелюдзяў, сабачыя смэрты!.. Хыба ж тут выйдзе однэ на однэ?..»

Чалавек гэты, яшчэ як салдат польскай арміі, увосень трыццаць дзевятага года трапіў у нямецкі палон і толькі ўлетку сорак пятага вярнуўся. Пабудаваўся тут, на родным котлішчы, адзін за дзве вёскі, сям'ю нажыў, а ўсё ж душа крычыць часамі, ноччу найбольш, як падбіты жураўель — па бацьку старым, па братах, па суседзях, па родным з маленства свеце...

«Такыі, таварышу, раны не хочуць гаіцца...»

З вясны да восені вы гамоніце тут, дзяўчаты і маладзіцы з трэцяй, без жыхароў калісьці спаленай фашыстамі, партызанскай вёскі. Працуюць нястомныя рукі, гудзе падлога пад гумовымі абцасамі, звініць апоўначы песня пад гул бяссоннага калгаснага матора. І весела вам, і нялёгка, і сумна бывае... На досвітку — ці дождж на во-

зеры, ці вецер — едзеце сюды, днём — яшчэ раз, увечары вяртаецеся дахаты часцей за ўсё добра-такі прыцемкам, а праз дзве-тры гадзіны — ні свет, ні зара — зноў у лодку... Калі мы памагалі вам насіць з берагу поўныя бітоны малака, я рад быў, праўду кажучы, што гэта — уначы, што не відно было, як нават я, мужчына і няўломак, а хістаўся. А вы ж іх носіце, таксама на плячы, ды тройчы ў дзень, ды штодня!.. За выключэннем хіба толькі Ганначкі, якой вы пакуль што не даяце насіць адной. За партызанскае і франтавое ліхалецце, крывавую працу і непаказную мужнасць вашых бацькоў, за ваша маленства са слёзным дымам зямлянак і нялюдскім голадам — вы вартыя не толькі таго, што маеце...

І сапраўды — няхай бы ўжо і сёння час не ішоў так хутка, і маладосць няхай бы не ўцякала пад хрыпатае вяканне затузанага патэфона ў самотнай хаце за возерам, з адным «кавалерам», што і сямейны даўно, і вясёлы толькі тады, калі вып'е... Бачыў я старым вокам, як вы цікавалі на нашых Генку і Міколу. Ды адзін з іх тым часам жанаты, а ў другога ўжо ёсць дзяўчына. Да таго ж яшчэ хлопцы і сарамлівыя, ці што. Колькі я іх ні штурхаў, так і не асме-

ліліся хоць на які-небудзь вальс. А вы, чаго добрага, думалі, можа, што куды тут вам, даяркам з глухога, беднага калгаса, да іх, гарадскіх ды вучоных…

Хто на каго цікаваў, а бялявая Наталка — на чарнявага Генку. І мне міжвольна, не зусім дарэчы, успаміналася адна някрасаўская песня. Ды ты ж не такая, як тая, што ў песні, і ён — не карнет, гэты сціплы, задуманы прыгажун. Ён — свой, цяперашні, наш вясковы настаўнік, ваенны сірата, якога вывучыла куды больш дзяржава, чым маці, бальнічная санітарка. Ён яшчэ, Генка, і паэт, лепш кажучы — ён хоча і рыхтуецца ім стаць. Вось і цяпер ён думае, як гэта ўсё ахапіць — і гэту ноч, і песню… А ты спяваеш, ты верхаводзіш, Наталка, і не думаеш нават, што голас твой і твой мілы дзявочы задор пойдуць следам за ім, што ён не зможа іх насіць адзін…

Зорнае неба плыве ды плыве, а возера наша, на жаль, упіраецца ў бераг. Каля Раманавага «складу» нас чакаюць два грузавікі — школьны воддаль, калгасны бліжэй. З асалодай бродзячы па цёплай вадзе, бадзёра гнучыся пад бітонамі, мы памагаем дзяўчатам перагрузіць удой у кузаў трохтонкі. І яны нам — дзівачкі вясёлыя — «шчыранька дзякуюць»…

Каб вы падохлі, рыбацкія камары!.. А ноч якая доўгая — нават і ў чэрвені — калі не спіцца!.. Ану, вазьму сябе ў рукі, захрапу, як Андрэй!.. Падцягаю калені ледзь не да самага носа, яшчэ раз папраўляю на сабе кітайскі лёганькі плашч, намагаюся думаць пра штосьці цёплае, санлівае... Але дзе там! Лапаткі ажно ўздрыгваюць ад зябкасці, а зубы вось-вось увойдуць у зусім музычны, у цымбальны, чорт вазьмі, настрой. Цярпі, рыбак, уранні не пакаешся!..

Добрыя хлопцы — Генадзь і Мікола. Асабліва, як мне здаецца, Генка. А дружаць яны, паэт з матэматыкам, так, што, збоку гледзячы,— весела. Калі напрадвесні паэтава Зося нарадзіла першынца і неўзабаве паехала з ім да бабулі,— матэматык узяў свой халасцяцкі чамадан і прыйшоў з інтэрната да «аўдавелага» Г енкі. «Бо сумна...» Зрэшты, і гэтага, магчыма, не сказаў. З маўклівых ён, Мікола, з тых нават, што здаюцца сухаватымі,— хоць зрэдку і замармыча якую-небудзь мелодыю, а то і ўсміхнецца, заўсёды разумна і шчыра.

Зосіна фота Генка нам паказваў. Гляджу, і здаецца, што здымалася яна — ужо

мамай. Бачыш, як губы зведзены, колькі рашучасці ў вачах. «Я, сам ведаеш, і кахаю цябе, я і пакорная, але прабач, голубе,— ёсць у мяне ўжо і тое, за што, калі хочаш, мы зможам і пасварыцца, за што я і пабурчу, няхай сабе, па-твойму, і непаэтычна...»

— Маладзец,— кажу я Генку, і шкадую, што няма яшчэ здымка сына, што я іх з мамай на гэты раз не пабачу.

Мне і цяпер вось хочацца ўявіць Генкавага наследніка, параўнаць яго, скажам, з маім... Ты цяпер недзе спіш сабе, залатабровы мой ды чарнавокі!.. А Генку я люблю даўно, хоць ведаю толькі тры дні. Бо я калісьці, пішучы, уяўляў такога вось студэнта і паэта і думаў, баючыся, што ён — маё ўяўленне. А ён вось жывы. Праўда, Генка ўжо стаў са студэнта настаўнікам, але затое ён куды лепшы за тое маё ўяўленне аб ім, хоць вершы яго і «навелы» яшчэ слабаватыя. Пакуль што. Учора ноччу, калі мы, развітаўшыся з даяркамі, Раманам і дырэктарам, селі на калгасны грузавік з бітонамі і патрэсліся лесам ды полем у зялёны гарадок, мы з Генкам гаварылі пра нашу любімую справу.

Між іншым і пра такое:

— Чуў — да дзяўчат гэтых прыязджалі

летась «пысьмэннікы з газэты»? Запісвалі многа, здымалі, абяцалі надрукаваць. Хлопцы, кажуць, яшчэ маладыя. І вось ужо год у газеце нічога няма. Наколькі я памятаю, няма, не было і ў часопісах. Падманулі «пысьмэннікы». А чаму, як ты думаеш?

— Надой нізкаваты. Хваліць няма за што, біць — пакуль што таксама. От сабе, проста жыццё «без характэрных рысаў сучаснасці». Калі тыя хлопцы і захапіліся чым, дык знайшоўся старэйшы, паправіў.

— Ну, а папраўдзе?

— Вы самі бачылі — людзі цудоўныя. Боязна робіцца: як напісаць пра іх дастойна?..

«Напішаш, Генка,— думаю я цяпер,— напішаш, чыстая душа, толькі самім сабою будзь, не палохайся нізкіх надояў, а заўважай перш за ўсё чалавека. І не вучыся цвёрдай сухасці ды слізкай гнуткасці ў таго, хто доўга ілгаў і ўсё аддаў той баязлівай ці карыслівай мане. Усю душу сваю, нібы торбу пустую, дзіравую, выпетрыў, а пісаць яшчэ хоча і сёння. Ды не проста пісаць, а па прывычцы — вучыць...»

— Чорт бы вас нечага камарыны пабраў!..— Думкі мае абрывае Андрэеў ра-

шучы бас.— Ты спіш? Світае. Давай будзем грэцца.

І праўда — днее. Зацягнула, як быццам на дождж. Суцэльная матавасць і халодная, нерухомая ртуць — і хмары, і вада, і раса, якою ўкрыта ўсё, за выключэннем хіба толькі вогнішча. Мы падмацоўваем яго з бясконцага запасу сухога аеру і галля. Агонь — няхай жывуць піянеры!— усцешана бухае ўгару і пачынае з азартнай прагнасцю трушчыць сушняк, А мы стаім і ўдзячна грэемся, як старыя, нямоглыя пілігрымы, працягваючы да полымя ледзь не дрыжачыя рукі.

Ды вось сігнал трывогі — пляхае першы шчупак.

— Але ж, брат, і вялікі! — зусім упэўнена здзіўляецца Андрэй.— Пайшлі!

І я ўжо чую, а потым яшчэ і яшчэ раз — усплёскі зусім незвычайнай, хвалюючай сілы. Бяром... Дзе там!..— хапаем халодныя, росныя спінінгі і, пакінуўшы гаманлівую чырвань, спяшаемся туды, вышэй па плыні, дзе мясціна, як гаварылася ўчора, найлепшая...

Пэўна ж, за нейкім трэцім закідам Андрэй бярэ!.. Сяледчыка, праўда, а ўсё ж... Ну, а ў мяне, трасца ёй, «барада»!.. Белая жылка «нуль і сем» — знарок жа, зара-

за! — чортведама чаго, заблыталася так, што і хочучы не зробіш... Ды, збоку гледзячы, я гарачуся не надта. Я ўспамінаю нават тую хітрую свякроў, якая так вось вывучала маладую нявестку — як яна ніткі разблытвае, што ў яе за натура. Што ж, калі ты ўжо, ціхмана-патайная Ясельда, такая свякроў для мяне... Цьфу! Не свякроў, а цешча... Мачыха нават. Але пачакай. Так. І вось так. Ну і ўсё! А цяпер мы не пойдзем следам за дзедам — няхай сабе ён адзін шаломіць раку ў той бок — мы рушым уніз, дзе таксама мясціна. Ану!..

Хлопчыкі, хто мне паверыць, што, дальбог жа, з першага закіду!.. Спачатку быў штуршок, які ашуквае амаль таксама, як ламачына ці доўгі зялёны хвост багавіння. Але за ім, за няпэўным штуршком, хвалюючым прадвеснікам перамогі, пачулася супраціўленне!.. Ён — таямнічы і, напэўна ж, агромністы ён — спачатку туга, упарта паводжваў у бакі, а потым, нябось, паказаўся. Павярнуўшыся бокам, сагнуўшыся дугой, светла-зялёны ў кропачку, а ўсё ж такі ішоў!.. І гупнуўся на бераг, у траву, акропленую ртуццю.

...Сустрэчы, уражанні, роздум... Цудоўна ўсё гэта, непараўнана.

Аднак нядрэнна таксама, калі яна, ры-

ба, не толькі «бярэцца»... Стаіш ты, скажам, каля вогнішча ды грэешся ўжо не адным агнём, але і думкай, што вось і ў цябе тым часам, які ты там ні рыбак, а ўсё ж у беразе, у той вунь, зусім звычайнай дагэтуль завоінцы пад лазовым кусцікам, стаіць на прывязі, як жарабец, во такі во шчупак!..

Быстры Нёман

Калі ўжо чалавек узяўся за таптуху, дык надзене, вядома, і вопратку адпаведную: самую ні на што не патрэбную старызну — порткі, ватоўку, шапку, якія потым і сохнуць на плоце, і зімуюць недзе разам з сеткай.

А мы з Андрэем, як выпадковыя сёння таптушнікі, лазім па-гарадскому — у трусах ды ў майках, з непакрытай галавою. І вада на нас цурчыць з паднятай сеткі не надта прыемна, і ногі мы даволі грунтоўна паабдзіралі ў асацэ ды карчэўі, і камары ўжо намі пачалі цікавіцца бліжэй...

На беразе, за аерам стаіць трэці наш кампаньён — трыццацігадовы, здаравенны Юра, прыгажун з амаль дзіцячай усмешкай дабраты і нібы вінаватасці. У адной руцэ ў яго неразлучная папяроса, у дру-

гой — звычайная авоська з неспакойнай дробнарыбіцай.

— А ўсё-такі,— гаворыць ён,— хараство тут якое, хлопцы, у вас! І рака, і луг, і лес...

Мы не спяшаемся з адказам, мы занятыя. Якраз Андрэй заходзіць, падводзіць свой бок таптухі да аеру, мы топчам ад зелля ў сетку, а тады — самы цудоўны момант! — паднімаем. І зноў, хоць сціпла, але ўсё ж пацвярджаецца ўпартая народная праўда: «Рыба, браток, у Нёмане ёсць!» Гэтым разам у нас — не шалпатушкі-плоткі, не акунькі ці яршы, а сам ягомасць Шчупаковіч! Адцэджаны ў кулі, ён — зялёнай маланкай — замітусіўся па багавінні, па ніцяных клетачках, пакуль не квэкнуў у мокрай і прагнай руцэ. Толькі шпурнуўшы яго на бераг ды апусціўшы сетку ў ваду, Андрэй адказаў:

— Хараство, браце Юрка. Зрэшты, так мы яго і рабілі, каб хораша... Сюды, сюды... Лявей. Пад гэты вось падазроны аерчык...

Нам ані крышку не холадна. І трэба было б гэтаму здзіўляцца,— позні вечар, палавіна жніўня,— але мы не здзіўляемся. Мы тут прымаем і цяпло і рыбу, як ад бацькі... Лезем па самыя ноздры ў ваду,

здымаючы між іншым назол-камароў, падводзім, топчам, вымаем, кідаем на бераг— прагныя і шчаслівыя хоць цяпер, пасля няўдачлівага дня са спінінгам.

Не заўважаем, што і цямнее сёння не ў час, што і пагруквае з усіх бакоў... Ідзём мы ўздоўж другога ад прывалу берагу, супраць вады, думаючы вось-вось вярнуцца на шырокі плёс, дзе ў водарасці нашаломім, вядома ж, нямала і плотак і шчупачкоў... Гэта не толькі надзея, а нават упэўненасць.

Ды тут пачынаецца дажджавая прыстрэлка.

— Канец, відаць, ці яшчэ мо паходзім? — без ценю панікі ў голасе пытаецца з-за аеру наш сухапутны энтузіяст.

— Не, брат, усё ж такі канец!

І мы, тры Ярмакі, плывём — адзін з узнятай авоськай, а двух цягнучы сетку — наўскасяк, на свой бераг, смеючыся пад буйнымі кроплямі, што ўжо малоцяць па вадзе і па нашых галовах зусім па-дажджавому густа, спорна.

«А ён і праўда — быстры Нёман»,— думаю весела і з міжвольнай трывогай...

Пад шчодрым, энергічным ліўнем далятаем да нашай палянкі.

Сядзім у «Пабедзе», закрыўшы вокны і

ветракі, і гэты наш, з усіх бакоў ашклёны, домік грыбам прыгорбіўся пад несусветным патопам. Маланкі ўжо не проста бліскаюць, а бесперапынку зыбаюцца ды зыбаюцца — у вокнах, у лесе, над лесам — бясконцым, таямнічым, ледзь не жудасным агнём. Бязлітасная, ураганная артпадрыхтоўка грому!..

Ну, пра гэтую ночку гаворка будзе, бясспрэчна, асобая! Як пра люты мароз і завею ў маім маленстве, калі суседскі конь прыйшоў ноччу з дровамі адзін, а самога дзядзьку Васіля толькі ўранні знайшлі на лузе ўдубянелага. Як пра тое жахлівае лета, калі збажына пасля граду была нібы пацягнута, з зямлёй змяшана вялізнай пружыноўкай. Як пра тую, другую грымотную ноч, калі пярун ударыў на лузе ў будан, забіўшы адной стралою дванаццаць касцоў...

Ды наш «будан» — мы ўспамінаем пра гэта ўголас — ізаляваны ад зямлі гумовымі скатамі, да таго ж ён не працякае, і мы яшчэ — хоць і не вельмі — маладыя. Мы, вядома, не толькі маўчым ды курым: і смешнае ўспамінаецца, і песня просіцца з душы... Хоць гром лютуе, ірвучы на кавалкі неба, хоць не гаснуць маланкі, а лівень лажыцца на нас непрадзьмутай сцяною

імклівай і шумнай вады, якой не будзе ні канца, ні краю...

Так, ні канца, ні краю. Пра гэта бессаронна цікае нам, направа ад руля, гадзіннік з асветленым цыферблатам. Гадзіну адлічыў, другую... Хутка поўнач.

Тады толькі лівень пачаў аціхаць.

— Нехта ходзіць...

— Ды што ты?

— Ну, браце Юрка, слых у цябе — ідэальны.

— А вы прыслухайцеся самі... Во!..

Адчыняю пярэднія дзверцы і, высунуўшы галаву пад дождж, гляджу назад, дзе паляна і, пад абрывам, рака.

У зіхаценні апошніх маланак на фоне неба чорным, мокрым рыцарам з'яўляецца закапюшонены коннік, а збоку, каля пярэдніх конскіх ног, купінаю чарнее куды больш празаічны і варты жалю «друг чалавека».

Гэта — Арцём, ляснік, і ягоны памочнік, калматы, маўклівы Званок.

— Э-гей! — крычу я, але «рыцар» ужо і сам пачынае злазіць з каня. Падыходзіць.

— Ну, як вас тут, не заліло? Лінуў дык лінуў, халерыя на яго! Дзірка прарвалася ў небе...

— Давай, Арцём, сюды, у церамок.

— Ды мне тут у маім балахоне сушэй, чым вам. А ўжо ж і дажджу во няма. Вылазьце.

І праўда — дажджу больш няма і, здаецца, не будзе.

Пацвярджаючы гэта, калматы Званок моўчкі прасунуўся ў наш кружок каля машыны і з асалодай, рыўком страсянуўся, сыпануўшы навокал процьмай халодных кропель.

— Пайшоў, халерыя!..

— Вогнішча, хлопцы!

Паліва мы нарыхтавалі яшчэ ўдзень, ды вунь якую горбу. Але куды ты ткнешся да яго цяпер з запалкаю... Што ж, абліваем ламачча бензінам і, насуперак усякай макрэчы, полымя выбухае радасцю перамогі.

Калі Андрэй адкаркоўваў бутэльку «сучка», Арцём, таксама прысеўшы каля раскладзенай на газеце закускі, сказаў:

— Ледва дастаў. Каб не Петрык, так і прыехаў бы я з пустымі рукамі. Усё падчысцілі — і соль, і мыла, і гарэлку. «Вайна!..» Ды што ты, браце, хочаш — людзі напалоханыя. Яно ўжо, скажам, гадоў

колькі? Семнаццаць ад партызанкі прайшло, а многія -— хто і дзіцем быў тады — памятаюць.

— Ну, Арцёме, бяры, брат, ды цюкнемся.

— Будзьце, хлопцы, здаровы! Як там яно ні было, а во сядзім ды выпіваем...

Ён тыцнуў белую пластмасавую чарачку пад свой шырокі нос і аддаў яе Юрку пустую.

— Каму гэта, вядома, хочацца,— зноў пачаў тое самае, жуючы.— Ды яшчэ каб праз каго, а то ж ізноў праз таго самага шалудзьку. Аданавар гэты — ён жа тая самая халерыя, што і Гітлер...

— Нічога, Арцёме,— усміхнуўся Андрэй.— Трэба будзе, дык пойдзем.

— Яно, вядома, пойдзем, куды ж дзенемся.

— Ведаеш, Юра, — сказаў я,— Арцём Сцяпанавіч — адзін з першых у нашай ваколіцы партызан.

— Ат, першы,— нібы адмахнуўся Арцём.— Разбярэшся там, хто з нас быў першы. Тут першы я, там першы ён. У многіх тады іншых думак не было. А калі ўжо гаварыць пра першых, дык во яны, кансамольцы! — Ён тыцнуў шчопцямі з кавалачкам агурка ў Андрэя.

Андрэю было васемнаццаць, калі яны, група вясковых камсамольцаў, выйшлі вясною сорак другога года ў пушчу. Туды вунь, у гэтую мокрую цемру за Нёманам. А праз тыдзень пачалася першая прачоска. Эсэсаўцы, рэгулярныя карнікі — супроць сяк-так узброеных, неабстраляных дзецюкоў. Смяртэльны жах і бясконцая — калі лічыць яе не на мірныя дні, а на безліч ваенных гадзін,— без сну, без яды і вады мітусяніна, уцяканне. Пажары лясных хутароў і першыя трупы: на дрэвах, у п рысаку родных хат... Тады быў і зацверджаны іх малады, паэтычна прыгожы патрыятызм, зацверджаны першымі стрэламі па ворагу, першымі пападаннямі, першымі ранамі і першай ахвярай...

Пра гэта я гаварыў Юрку трохі раней. І мне цяпер двойчы прыемна... Наогул радасна — за Беларусь, за двух яе партызангвардзейцаў. Няхай любуецца мой сібірак, што там і нарадзіўся, што сюды прыязджае куды ахвятней, чым у Сочы якія ці ў Ялту. Дык вось табе, хлопча, зямля тваіх бацькоў, вось яна — наша лясная ды палявая старонка, наш бацька Нёман і наша вясёлае вогнішча!.. І Юра, якому ў вайну было дзесяць — чатырнаццаць год, начытаны, з тонкаю душою Юра глядзіць і слу-

хае з вельмі прыкметнай цікаўнасцю ў вачах.

— Таксама, браце, як цяпер падумаўшы, смеласці трэба было,— гаворыць Андрэй.— Вырашылі мы пусціць эшалон гэты якраз там, дзе яны менш за ўсё спадзяюцца: каля самага маста, каб з насыпу высокага кульнуўся. Паўзём. А восень — цёмна, гразка!.. Іван Капуста — хлопец быў! — паўзе спераду, я за ім... Душа, браце, пяе на найвышэйшым напружанні асцярожнасці. А потым я дагнаў Івана ды цап за бот, каб спыніўся. А ён, браце, са страху, ад нечаканасці — шануючы вас — калі вухне!.. Я, браце, ну хоць ты ўдушыся ад рогату — не магу... Ён у злосць... А ўжо насып вось-вось, перад намі...

— Тады ж цябе там, мусіць, і ранілі, і пабілі вас там нешта многа... Ці не там?

Арцём з другой, суседняй брыгады: за даўнасцю можна і пераблытаць.

— Не, браце, тады мы справіліся чыста. І эшалон той пусцілі, і вярнуліся. Хоць дыхту нам трохі далі таксама.

Паўза. А потым не вельмі каб ахвотная даведка:

— Ранілі мяне, Арцёме, каля Войнавага хутара, на днёўцы... Можа, хлопцы, яшчэ па адной?

Зноў паўза, трэск агню і вялае закусванне.

— Было,— гаворыць пасля Арцём.— Было, як ты кажаш, і страшна, было і весела...— Ён хрыпавата смяецца.— Раскажу я вам, хлопцы, бо і самому, бачыце, смешна!.. Паехаў я са сваім аддзяленнем у Бабровічы, млын той багаты разбамбіць, што немцам меле, халерыя на яго. Заведуюшчы там зладзюга, падла, ажно вочы круцяцца. «Напішыце мне, — кажа, — таварыш начальнік, што вы ў мяне не дзве тоны мукі ўзялі, а тры. Мне — для адчотнасці». Узялі мы там усё, што змолана было,— вазоў, здаецца, з сем... Не, браце, восем! І паехалі. А хлопцы мае, гляджу ў дарозе, як цюцькі, п'яныя, амаль усе. І сам я не разбяруся, варона, як ён іх там напаіў? Той халерыя — «для адчотнасці». Ну, браток, і намэнчыўся ж я з імі тады! Тут трэба ціха, а яны... Мала ім, што спяваюць, дык яшчэ дужацца шчапіліся на дарозе, Сашку Тамашыку руку вывіхнулі... А ўжо сюды, да Нёмна пад'язджаючы, каля саменькіх Вербалозавіч, Рэдзька Хведар, гугніла, убачыў, што нейкі дзядзька-пагарэлец вязе настрамак нажабраванай саломы. «Ці пацэлю я,— кажа,— яму ў дугу?..» Ну, тут ужо я яго прыпёр: «Такую тваю, рас-

такую, застрэлю!..» Затвор ягоны ў кішэню сабе палажыў. А ён, халерыя, кажа: «Страляй! Я ракам на дарозе стану, а ты мне,— кажа,— пацэль!» От дзе мармоліна!.. «А не пацэліш,— кажа,— дык ты тады станавіся!..» Ну, я яму толькі па карку заехаў тады. Дзеці ж у цябе, дурыла ты, думаю, маці старая, жонка, дый сам ты хлопец як хлопец, калі не п'яны...

Мы смяёмся. Але мне і шкада адначасна, і крыўдна як быццам, што ўсё гэта сёння — так спрошчана, нават міжволі прыніжана, так не ў тон таму сапраўднаму, прыгожа гераічнаму, пра што я гаварыў Юрку перад гэтай сустрэчай, сам-насам. Не такога хацелася б для яго — каб пачуў... Ну, хоць не толькі ўжо аднаго такога!

І таму я з прыемнасцю заўважаю, што і Андрэй таксама не вельмі здаволены нашай гаворкай. Бо вось ён звяртаецца да Арцёма:

— Ты, браце, раскажы, як вы Баравічка з нямецкай бальніцы ўкралі.

— Ага, укралі,— згаджаецца Арцём.— Трох нас паслаў тады камбрыг: Гоцку, Мяжэвіча і мяне. «Не дазволю,— кажа,— каб мой найлепшы разведчык у фрыца смерць пакутную прыняў...» Яны яго падстрэлілі і ўзялі. А там у нас, у гарнізоне,

быў сувязны. Нават у бальніцы той самай рабіў. Дык ён выйшаў ажно да першай хаты, чакаў нас. І ноч такая адпаведная была — хоць пальцам у вока. Прыйшлі мы, вартавога цюкнулі, сувязнога гэтага для адводу звязалі, нават хустачку ў рот яму ўперлі. А самі — за Баравічка, да саней яго вынеслі ціхенька і — алёп!.. Халерыю ты зловіш, а не нас! Дый з кулямётам мы былі. Гоцка Косцік насіў тады «Дзегцярова».

Як гэта проста ўсё, як звычайна, Арцём!.. Штосьці сёння не клеіцца ў нас. Намякнуць, каб ты расказаў, як тут твой «кляты» ўзвод (ужо не аддзяленне, а конны ўзвод, якім ты пасля камандаваў) тры дні недалёка адгэтуль трымаў на Нёмане абарону, як немцы не прайшлі, нягледзячы на мінамёты і танкеткі? Што ж, ты і з гэтым таксама згодзішся: «Ага, не прайшлі... Мы іх тры дні трымалі і не пусцілі...»

Ёсць чалавеку пра што расказаць, ёсць што ўспомніць і чым, не прыхарошваючы, пахваліцца. А ён вось зусім празаічна гаворыць, прыўзнімаючыся на калені:

— Давайце, хлопцы, мо трохі паспім? А то будзем заўтра носам, халерыя на яго, кляваць увесь дзень. Галля насцелем, ды ля агню... Ляжаць усё ж такі лепш, чым сядзець у машыне...

І мы рыхтуемся да сну. Бо ўжо навокал вогнішча сырая цемра пачынае так прыкметна шарэць, што заўважаюцца не толькі блізкія дрэвы, але і цярплівы леснікоў верхавік, які тым часам спіць па-свойму, на нагах, сяды-тады гайдаючы страмёны партызанскага, даўно старэнькага сядла.

Ляжым на лісцяной, раней падсушанай каля агню пасцелі. Рэбры прыходзяцца напоперак галін. Мулка, вядома, але ляжым. Гамоніць роўным, пругкім гулам полымя, часамі трэсне, нібы раскалоўшыся, сучок. Зверху — не-не дый ападзе з ліста якая-небудзь зусім лішняя кропля, лузганучы па плашчы або да злосці спалохаўшы тваё вуха.

«Ужо гэты дык мог бы,— нібы нават капрызна думаю я пра Андрэя.— У яго ж не толькі ёсць аб чым расказаць, але і можа ён, калі ў часіну ціхай шчырасці, удвох, утрох... А зрэшты, чаму яна, тая часіна, павінна была прыйсці да нас іменна сёння, цяпер? Таму, што я хацеў бы вельмі, каб Юра пачуў?.. Я раскажу табе многае сам. Бо мне наогул трэба вельмі многае і вельмі добра расказаць пра такіх вось, як гэтыя, шчырых работнікаў

нашай вялікай справы. Каб не пайшло ў нябыт, каб не развеялася, пашумеўшы мясцовай легендай, каб не зацерлася ў памяці пакаленняў тое, як і тут, над нашым Нёманам, палымнела чырвонай стужкаю на аўчыннай кубанцы, грымела помстаю і маладым, пераможным смехам беларуская партызанская слава...

Не трэба толькі шумных слоў, не трэба імі абражаць непаказную, народную сціпласць сапраўдных людзей...»

Успамінаю, што было днём, як ён ляжыць на высокім абрывістым беразе — разам з намі, ды трохі наводшыбе — наш малады яшчэ Андрэй. Задуманы.

Усе мы маўчым, хто — курачы, хто так. Глядзім на ціхую ў гэтай глыбокай завадзі ваду, у якой хвалююча, успамінам маленства адбіваецца нагрувашчанне белых аблокаў і мяккая, сакавітая просінь. Глядзім на луг за ракою, дзе стагі ўжо шарэюць, выгараючы на сонцы, а пакоша пацягнулася вясёленькай атавай. Глядзім час ад часу і на аблокі ўгары, на іхнім, як і належыцца, месцы... На фоне гэтай белалілова-блакітнай прыгажосці, лена плануючы, пераваліваюцца з крыла на крыло чатыры буслы. Не, больш. Далей яшчэ вунь. І лічыць не хочацца,— так многа.

Пленум нейкі ці трэніроўка перад адлётам... У нас тут, за лесам, цянёк. А за ракою, на лузе,— яшчэ ўсё сонечна: недзе далёка за намі сонца толькі што пачынае ісці на пасадку. У велічным спакоі працавітых дзён, у плённай жніўеньскай спеласці.

«Пра што ён думае?» — гляджу я на Андрэя спадылба, падпёршы падбародак пастаўленымі адзін на адзін кулакамі.

На тым баку стаіць над самай вадою бярозка. Адна, нібыта выбегла з дзявочай чарады, каб паглядзецца ў такое вялікае, чыстае люстра. Маладая, а колькі на ёй залатога лісця!..

«Пра што ж ён думае?.. А, ведаю!»

Пытанне гэтае і мой адказ — цяпер ужо не поўнасцю такія, як былі тады, удзень. Я гавару фактычна: «Пра што ён думаў?» І да ранейшых здагадак, неразрыўна сплятаючыся з імі, далучаюцца новыя.

Успамінаю словы, сказаныя тут, пры вогнішчы: «Ранілі мяне, Арцёме, каля Войнавага хутара, на днёўцы».

За звычайным, нібы і сапраўды толькі даведачным гучаннем гэтых слоў мне цяпер уяўляецца не тое, як яны, хлопцы, прарываліся з варожага агнявога кальца, як чатыры жыцці абарваліся, кожнае жудасна

і прыгожа па-свойму... Бачу чамусьці другое,— ужо аголены лістападам бярозавапярэсценькі гушчар і дол, нібыта для прыхільнай цішыні, багата высцелены жоўтым лістам. Тры буданы, у адным з якіх ляжыць паранены ў нагу дзяцюк. Два іншыя буданы — пустыя: атрад пайшоў на заданне. А з Андрэем астаўся кульгавы Петрык. І цяпер толькі ясна зрабілася, які гэта добры хлопец. І даглядае цябе, нібы маці, і ў душу не лезе. Нібыта вы тут удвох і нібыта адзін ты ляжыш на саломе, накрыты нядаўна чужым, а цяпер ужо толькі народным, ласкавым кажухом. І непрывычны боль першай, няўмелымі рукамі перавязанай раны не такі для цябе невыцерпны, як боль па сябрах...

На змярканні параненаму чуваць было, як недзе — то бліжэй, то зноў далей — шамацела лісце пад нагамі ў кагосьці... Можа, Петрык кульгае, так цяпер жаласна для цябе, а ўжо ж даўно, ад роду заграбаючы правай нагою? А можа нават дзік за ветрам, не чуючы, падышоў?.. Ды вось шамаценне тое пачулася бліжэй. І Петрык, якога дагэтуль нідзе не было, мужчынскім галасам крыкнуў: «Стой! Хто ідзе?» Андрэева рука сама знайшла на саломе пакарбаваную ручку нагана. Дарэмна — галасы

свае: Петрыкаў і яшчэ нечы, так трывожна знаёмы... Вось зноў шамаціць лісце. У светлым трохкутніку выхаду з'яўляецца цёмны, гледзячы знізу, магутны сілуэт.

— Сынок, ты тут?

Эх, бацька, бацька!.. Няўжо гэта той самы ты, што, пілуючы на прыгуменні дошкі, стаяў на сталюгах і зверху пасмейваўся з сыноў? А потым, як Бульба, дужаўся з імі і рад быў, як сам казаў, у дзве столкі: што і хлопцы выраслі, дый ты яшчэ не ўломак, нават большага гэпнуў... А цяпер вось маўчыш, пазіраючы ў змроку на меншага. Што маўчыш — каб не плакаць?..

— Пайду я ўжо, мусіць,— глуха азваўся ён, пасядзеўшы побач.— А ты папраўляйся. Я мацеры так і скажу, што ўсё добра. А ты папраўляйся...— Пашамацеў саломай, устаў.— Прымаразкі бяруцца...

— Вы, можа, боты мае абуйце,— сказаў няпэўна сын.— У кутку вунь там. І анучы, здаецца, у ботах.

— Хэ, тожа мне салдат!.. Пайду. Ну, будзь здароў!..

Пайшоў. У чужую вёску, у чужую хату. Яшчэ ўсё босы, па пякучай шэрані. І без шапкі. Такі, як выбег з пажару...

І хада яго доўга, бясконца доўга шамацела ў бярэзніку насцілам лісту.

І сёння вось шамаціць — праз дзевятнаццаць год...

...Тады ж, калі мы ляжалі на беразе, Арцём спытаўся ў Юркі:

— Дык вы з Сібіры? Ад белых, можа, мядзведзяў?

Той засмяяўся.

— Ну, ад мядзведзяў — не, а вось алені дык ад нас ужо недалёка, адзін чыгуначны перагон.

— Алені — яны, відаць, такія, як ласі?

Спытаўся Арцём не таму, што нібыта не ведае, а хочучы нешта сваё расказаць. І расказаў, як летась увосені сустрэўся на сцежцы з ласём. Сахаты пары шукаў якраз і быў, вядома, вельмі злосны...

— Гэты во выручыў,— паказаў Арцём на Званка.— Каб не ён, дык невядома, што і было б. То маўчыць усё, а то дык калі кінецца на гэтага ласяǃ.. А лось — такая вунь, хлопчыкі, звярына! — унурыўся ды на яго! А конь мой — дарма, што ціхі — на дыбы, крутнуўся на месцы, халерыя, ды ў гушчар. Як я там толькі рук ды галавы не адарваў, уцякаючы?.. І партызанку — хлопцы ж ведаюць — і фронт прайшоў, а дальбог жа ж ніколі, здаецца, так не спалохаўся!..

Успамінаю, як быў забіты над Нёманам

храбры нямецкі маёр. Трохі вышэй ад гэтага месца, на лузе.

Перад пачаткам блакады нейкі тройчы ардэнаносны франтавік яшчэ загадзя, напярэдадні падскочыў на матацыкле да той «фарфлюхтэр флюс»[1], з намерам паглядзець, чаго тут і каго тут так баяцца тылавыя пацукі, адкормленыя зондэрфюрары і розны неарыйскі паліцэйскі зброд... Пад'ехаў на матацыкле з каляскай, сам за ручным кулямётам, а Фрыц у касцы — за рулём. Спыніўся на высокім беразе, глядзіць цераз бінокль на някошаны луг за ракою, заліты нізенькім сонцам, на котлішчы і зямлянкі двойчы ўжо спаленай партызанскай «Масквы»... «Фарфлюхтэ вюстэ!»[2]. А заўтра мы пройдзем у вашы бандыцкія логавы!..

Бінокль яшчэ быў ля вачэй, калі па абодвух ваяках паласнула аўтаматная чарга.

З кустоў на тым баку, толькі праз момант, патрэбны каб распрануцца, выйшаў голы мужчына і, з пісталетам у зубах, саджонкамі пайшоў напоперак быстрай плыні.

[1] Праклятае ракі *(нямец.)*.
[2] Праклятая пустыня *(нямец.)*.

Жывы быў толькі матацыкл: ён усё тыркаў, гатовы зноў сарвацца з месца.

А ўжо адтуль, дзе маёра чакалі, у адказ на чаргу прыйшла першая міна — на выручку. Яна разарвалася, праўда, далёка на лузе, аднак і марудзіць нельга было. Упяўшыся, чалавек крануў з месца нагружаны шэра-зялёнай падлай матацыкл, дакаціў яго да абрыву: ныра́й!.. А сам — з трафейным кулямётам у левай руцэ, над сабою, і з пісталетам зноў у зубах — паплыў назад.

Другая міна разарвалася ў вадзе. Ды ён ужо вылез на бераг. Адтуль — з іх боку — пачуўся трэск матацыклаў... Трэці выбух узрыў лугавую макрэчу якраз на ягонай дарозе ў лес. Чацвёрты ахнуў правей... Ды чалавек ішоў — не бег. Нават і апрануцца збольшага паспеў — трохі адразу, у кустах, а то дык на хаду, пакуль схаваўся ў першым бярэзніку...

Так, гэта быў Арцём.

У тыя дні душа яго была ахоплена страшэнным болем...

Ціха ўстаю. Не разбудзіў нікога. Толькі Званок, не паднімаючыся, спакойна гля-

дзіць на мяне і прыязна матлошыць па траве хвастом. Вогнішча хоча галля. Прыношу з горбы абярэмак і кладу. Праз нейкі момант, сабраўшыся з духам, полымя прабівае яго, уздымаецца з радасным гоманам.

Днее. Нібы добрыя вочы з-пад злосных брывей, з-пад хмарнай навісі цёпла глядзіць зара. Хмары паднімуцца, сонца ўстане. Будзе яшчэ адзін ціхі, пагодлівы дзень. Як гэта проста ўсё — дзень пасля ночы — і як гэта радасна.

Дзень пасля ночы. А ноч перад днём? Тая ваенная, навальнічная ноч...

Успамінаюцца словы: «Было і страшна, было і весела...» Гэта, Арцём, гучала ў цябе... ну, проста як адгавор. Бо страшнае тваё няможна часта згадваць уголас.

...Новая хата ў адной з наднёманскіх вёсак. Садок на градах, у агародчыку кветкі. І часта тварык дзіцячы за чыстай, вялікай шыбінай,— як толькі хто стукне брамкай. У хаце на сцяне — выцвілы здымак пад шклом — партызанская конніца, цэлы ўзвод, і камандзір у кепачцы, Арцём Маляўка. Побач — тры ружы з лісцем — дзіцячая вышыўка «ланцужком». А над усім гэтым — восем фотапартрэтаў. Цьмяных, з бязлітаснай рэтушшу, перазнятых ды па-

вялічаных з маленькіх, пяцімінутных здымкаў мясцовага аматара ці валачашчага партача. Бацька і маці, таксама, як яны, старая цётка, малодшыя Арцёмавы сястра і брат, першая жонка з дзвюма дзяўчынкамі.

Усе яны загінулі тут, у роднай вёсцы.

Дзевятага фотапартрэта няма. Мішку яшчэ не здымалі, здаецца, ці можа прапаў яго здымак. Пяць год было сыну. Казалі, ён уцякаў. Таму і магіла яго была за гумнамі.

Была. Бо летась іх з чатырох магілаў перанеслі ў адну, над якою паставілі помнік. Дзвесце шаснаццаць чалавек. Так падлічылі раней, па памяці, кожны сваіх. А Мішку адкапалі аднаго.

Бацька сам яго пераносіў. І сам расказваў мне, што ў той магіле наводшыбе разам з астанкамі сына быў яго мячык.

«Чырвона-сіні, вялікі. Нібы сягоння помню, як я яго купляў... Палажыў яму мячык той зноў...»

Бачу самотную хату над возерам, безыменнага дзядзьку-палешука. «Такыі, таварышу, раны нэ хочуць гаіцца...»

Адны не хочуць, а другія і зусім не гояцца. Колькі іх прынесла нам вайна?.. А ўсё ж: «Як трэба будзе, дык пойдзем,

нікуды не дзенемся». Гэта — шэра, ды гэта затое не фраза. За ёю — вера, якую ўжо гартавалі ў агні.

Зноў Арцёмава дабрадушная ўсмешка: «Разбярэшся там, хто з нас быў першы...»

І сапраўды — што назваць пачаткам яго, Арцёмавай, партызанскай біяграфіі? Ці майскі вечар у сорак другім годзе, калі ён, сям'ю пакінуўшы, пайшоў з групай аднавяскоўцаў у гэты вось лес — ужо не з сякерай, без воза, а на вялікія гістарычныя справы? Ці тую восенскую ноч, калі ў акенца яго хаты пастукаў самы першы ў нашых ваколіцах партызан? Ці той чэрвеньскі дзень жахлівага, незразумела ганебнага адступлення, калі ён, шэры ды ціхі бядняк, падняў на дарозе і, азірнуўшыся вакол сябе, панёс у зараснік першыя тры вінтоўкі?..

«У многіх тады іншых думак — не было».

Якія словы патрэбны, каб як след расказаць пра цябе, пра ўсіх такіх герояў -— радавых і сапраўды незамянімых?

«У мяне ёсць таксама медалі,— казаў ён учора, зусім прастадушна здаволены.— Адзін «За адвагу», а другі партызанскі, жоўценькі. А ўжо за фронт нічога не далі. Я там шафёрам быў. На міну раз, халерыя, наскочыў. У Германіі. Толькі пыл і дым,

слупам ахнула ўверх,— больш нічога не помню. І галава цяпер часта баліць...»

І ў параўнанні з суседзямі трохі больш сена карове — прывілегія лесніка.

Больш ты як быццам нічога не хочаш. А пра мінулае нават расказваць не любіш. «Што я — адзін такі?» Гэта — не словы твае, я такога не чуў, гэта — думка, і думка глыбока народная. Гордасць і боль прыкрыкваючы ты нават смяешся і цягнеш наверх, каб весялей было, тую, не вельмі часам і прыгожую партызанскую будзёншчыну, якое яшчэ ўсё баяцца і тыя, што пішуць, і тыя, што вучаць пісаць...

— Сонца ўсходзіць.

— А, гэта ты, Арцём. Здароў!

Стаім на беразе, глядзім на ўсход, дзе — перад сонцам — учарашняя, «Андрэева», бярозка. А далей пушча, думаю, дзе на лядах — рады сасонак. Толькі адну чамусьці бачу, буйным планам, з кроплямі серабрыстай расы, што вось-вось зазвоняць, як тыя мае, над Бярозай... У гушчары, над зарослаю рэчкай — цыбатае, бурае ласяня цягне губамі і плямкае, нібы жуе, аерыну, пакуль што толькі гуляючы. Хоціць яму і матчынага малака. А ласіха стаіць па чэрава ў вадзе. Напілася і, не спяшаючыся, угматвае, смачна жуе вялікія

плывучыя лісты лілеі, разам з якімі да пысы яе асуджана гайдаецца-плыве пяшчотна белая, з сонечным «сэрцам» кветка... Хутка сонца паднімецца, і Нёмнава быстрая вада, у якую глядзіцца бярозка, заблішчыць, ажыве, заіграе...

Хораша, Юра, у нас — учора ты нездарма захапляўся!..

Арцём закурвае.

— Ну, што? — пытаецца з падморгам і прыцішана.— Будзіць іх будзем, рыбу чысціць ды есці варыць, ці пойдзем, можа, закінем, пакуль яны спяць?..

Паэтычная, родная проза!..

2

УСМЕШКА

Толькі што адшумела навальніца, і па вуліцы вёскі бягуць вясёлыя мутныя раўчукі.

Я стаю каля варот бацькоўскага двара, і мне вельмі хочацца зняць свае модныя туфлі, прайсціся па быстрай дажджавой вадзе, памясіць нагамі цёплую, пухкую гразь...

Мяркуючы па тым, што я яшчэ не зрабіў гэтага, а толькі раздумваю — я ўжо даўно не малы. Ды я не адчуваю чамусьці ні цяжару гадоў, ні адказнасці за свае паводзіны: я проста рад, можа, нават не менш, чым рады бываюць у такі час малыя.

На захадзе з-за хмар выглянула сонца.

З узгорка ўніз па вуліцы ідзе белы, зусім сухі і чысты бычок, а на бычку сядзіць гадоў пяці-шасці дзяўчынка, што таксама не была пад дажджом.

Бычок ідзе паволі, нават салідна, упарта і горда несучы наперад свой шырокі пародзісты лоб з тупымі шэрымі рожкамі.

Дзяўчынка сядзіць на бычку не так, як хлопцы, а бокам, спіной да мяне, нібы знарок схаваўшы свой твар, напэўна, шчаслівa і смешна сур'ёзны, свае, вядома ж, загарэлыя ножкі.

Сонца прасвечвае цераз мокрае, бліскучае лісце бяроз, і на мелкай гразі, нядаўна затупанай слядамі каровіных капытоў, на гаманлівай вадзе і на шэрых штакетах за раўчуком ляжыць рухавая сетка ценю. Калі бычок са сваёй амазонкай уваходзіць у гэты цень, па іх гуляюць сонечныя зайчыкі.

На ўсходзе, куды накіравалася, яшчэ не ўсё аддаўшы, цёмна-сіняя хмара, красуецца вясёлка. Пад вялізную арку яе ідзе вясковая вуліца, а па вуліцы, нібы ў краіну казачнай радасці, едзе светлагаловая дзяўчынка, гулліва пастукваючы пяткамі па баку свайго верхавіка.

Трохі воддаль за імі ідзе, таксама босы, бацька дзяўчынкі. Ідзе і ўсміхаецца, бо думае, відаць, што дзіця — заўсёды дзіця, заўсёды радасць, ці хлопец гэта ці дзеўка.

Але дзяўчынка тым часам праехала міма мяне і там, дзе шумлівы, пеністы раўчук ад плота разліўся на сярэдзіну вуліцы, па-

чала раптам з’язджаць з хрыбта свайго бычка і, пакуль я сабраўся бегчы ёй на дапамогу, з’ехала і шлёпнулася, села ў мелкую ваду!..

Пакуль мы з бацькам малое падбеглі туды, паспела адбыцца самае цікавае, самае вясёлае ў гэтай гісторыі.

Белы бычок прыгнуў лабастую галаву, наблізіў вільготную казытлівую пысу да твару свае сяброўкі і панюхаў яго, а дзяўчынка працягнула загарэлыя рукі, узялася за рогі бычка, адкінула назад светлавалосую галаву і, смеючыся, устала.

— Ой, татачка! — гаварыла яна і, не могучы дакончыць, звонка смяялася і паўтарала:— Ой, татачка!.. Ой!..

І мы смяяліся ўтрох,— так весела, так непаўторна молада, што я не вытрымаў больш і... прачнуўся.

ТЫ НЕ ЗНІКАЙ

Яны не могуць нацешыцца адна адной — дачка і маці...

Не бачыліся тры гады... Не — больш за тысячу дзён і начэй! Роўна столькі, колькі іх горад быў пад ворагам.

Ваенны год на службе лічыцца за тры. Салдату. Дзецям і маці, якія ў той час былі разлучаны, трэба лічыць прынамсі яшчэ раз утрая. Час чакання, тугі, невядомасці...

І вось яны разам.

Яшчэ ўсё худыя Зініны ручкі — на маміных плячах, а носік раз по разу цёпла торкаецца то ў адну, то ў другую маміну шчаку.

Можа, залішне гэтых пястотаў, можа, маці дарэмна штодня адзявае малую сама? Бо Зіна ж вырасла за гэты час на першакласніцу.

— Ой, успомніла я, успомніла, мама!..

— Што? Ды не вісні ты, стой сабе хораша. Што ж ты ўспомніла?

— Яшчэ калі цябе не было, калі ты была ў э-ва-ку-а-цы-і... Бачыш, я ўжо гэтае слова адразу кажу! Калі мы толькі з бабуляй жылі. Калі яшчэ ў Мінску былі фашыс-ты... Мама! Ну, мама!..

— Што? Што, золатка маё?

— А гэта ва ўсіх мам і ва ўсіх дочак вочы такія самыя?

— Ну, не заўсёды.

— Дык чаму ж у нас з табою такія самыя сінія?

— Гавары ты, дачушка, адно. Ісці ўжо трэба, а ты... І я цябе люблю. Ну добра, хопіць. Дык што ж ты сніла, калі мяне не было?

— Я цябе сніла, мама. Не адзін раз, а многа! Але адзін раз так: здаецца, я цябе бачу... Здалёк, не блізка бачу. Але ведаю, што гэта — ты. Як толькі ты ідзеш — і я іду. Як толькі я пабягу да цябе — і ты бяжыш. А потым я крыкну: «Ма-ма!..» І ты адразу знікаеш... Ой, а слёзы твае так казычуць,— я зараз чыхну... А можа я не адзін раз так сніла, а многа?.. Ну, мама!..

Яны не бачыліся многа-многа год.

МАЛІТВА

Дзве з іх сёстры: ціхая, светленькая Люда, якой чатыры гады, і двухгадовая Аня-Пампушка. Жывуць яны з мамай і татам. Трэцяя і сярэдняя па гадах, чарнавокая Волечка — сірата, жыве толькі з мамай, у крайнім ад дзвярэй пакоі.

Тройка наша — і звонкая, і свавольная. Апроч калідора і кухні, таксама агульнай, яны то паспяваюць быць адразу ва ўсіх трох пакоях абедзвюх кватэр, то могуць часам і заціхнуць так, нібы іх і зусім нідзе няма...

Дарослым гэта здаецца тады падазроным, і малых пачынаюць шукаць.

Сёння мамы знайшлі іх у куткавым пакойчыку, дзе на паліцах многа кніг, каля акна пісьмовы стол, а за сталом схавана паўлітровая бутэлька сіняга чарніла.

Вечарамі, прыйшоўшы з работы, і ноччу, калі ўсе спяць, Людзін і Анін тата сядзіць за тым сталом і піша. Піша, піша, а потым

дастане з-за стала тую бутэльку, наліе з яе ў чарніліцу, а бутэльку зноў схавае за стол. Там яе дзеці не знойдуць.

Пакойчык быў часцей за ўсё замкнёны. Аднак сёння, як толькі малыя пасля вялікага шуму раптам неяк заціхлі, адна мама шапнула другой:

— Тут! Вось паглядзіце, тут!

І паказала на белыя дзверы пакойчыка.

Мамы падкраліся, рраз! — і туды!

Тройка сядзела на падлозе вакол вялікай сіняй лужыны і, дзелавіта мачаючы ў чарніла скамечаныя абрыўкі газеты, старанна абмазвала голыя ручкі, тварыкі, валасы...

Спачатку быў, вядома, крык і плач. Пасля пайшло адмыванне і хныканне. Тады мамы смяяліся... не, яны рагаталі! — і дзяўчаты пачалі смяяцца таксама. Нарэшце іх, на першы раз сяк-так адмытых, Людзіна і Аніна мама павяла ў свой большы пакой.

Волеччына мама была ўжо там...

— Вось,— сказалі мамы.— А Дзед Мароз якраз сёння прыходзіў паглядзець, якія вы — ці харошыя. Няхай паглядзіць!..

Белы, барадаты, з кіёчкам — Дзед Мароз стаяў на стале, зверху, з-пад абажура, на яго лілося святло, а ён — увесь, як сня-

жок, блішчасты! —- глядзеў на свавольніц моўчкі...

Так... Прыходзіць ён толькі тады, калі бывае ёлка. Прыходзіць цішком і ноччу, калі ўсе спяць. Прынясе падарункі, а сам схаваецца за зялёнымі лапамі і стаіць. Стаіць — пакуль і свята адшуміць, і гліца асыплецца на падлогу. Тады з засохлай елачкі здымаюць цацкі, дрэўца выносяць на двор, з Марозавай барады вытрасаюць гліцу, а самога яго і цацкі ў кардоннай скрынцы ставяць на шафу, у самы куток. Дзеда яшчэ і накрыюць чым-небудзь ад пылу. І дзеці забываюцца пра яго — аж да другой зімы.

А тут ён узяў ды прыйшоў!..

І глядзіць. І маўчыць...

— Ну што?— пытаюцца мамы.— Сорамна? Няхай вось Дзед Мароз паглядзіць, ці варта вам, такім, прыносіць падарункі.

Хвіліна сумная, цяжкая...

— Пойдзем? — спыталася адна мама.

— Хадзем,— кіўнула галавой другая.

А дзверы яны прычынілі няшчыльна. Прытаіліся на калідоры і чакаюць, слухаюць.

Калі мамы, не могучы больш трываць ад смеху, адчынілі дзверы і ўвайшлі — уся не-

дамытая і зноў заплаканая тройка стаяла над белым Дзедам каля стала і вельмі шчыра ды вельмі сур’ёзна малілася:

— Дзядуля, прыйдзі на елачку!.. Мы будзем харошыя. Ты прыйдзі!.. Мы больш не будзем мазацца. Прыйдзі!.. Дзядуленька, скажы, ці прыйдзеш?..

Старэйшая з іх, Людачка, гаварыла пасля свайму тату, што Дзед Мароз:

— Во гэтак во кіўнуў галавой і сказаў нам: «Угу!..»

І, вядома ж, прыйшоў.

ЧЫМ НАКАРМІЛІ МІШУТКУ

Люда наогул любіць і ўмее прыдумваць.

Яшчэ калі яна была зусім маленькая, трохі больш за паўтара года, і тата, стоячы на верандзе, трымаў яе на руках, Людачка заўважыла, як пад застрэшкам у павуціне б'ецца і ные муха.

— Пуця!— сказала яна, працягнуўшы заслінены пальчык.— Пуця гу-та-та!..

А «пуці» было не да гушкалкі.

Потым неяк, гадоў яшчэ праз паўтара, глянула малая раненька ў акно і ўсцешылася:

— Ой, мама, а сняжок які за ноч падрос! Большы яшчэ, як учора!..

Цяпер ужо. Людачцы пяты год.

Сёння нядзеля, і тата не пайшоў на работу. Люда прачнулася, бачыць — Пампушка яшчэ спіць, мама ўжо кудысьці пайшла, а тата сядзіць ды чытае.

І Люда задумалася, падпёршы кулачком і пасля сну не вельмі румяную шчаку.

— Ну, што?— спытаўся, пачакаўшы, тата.— Што, мая цёця-маркоця?

— Тата, а Маша ж з’ела ўсю пахлёбку!..

— Якая Маша? Якую пахлёбку?

— А там, што мама ўчора нам чытала: пра Машу і пра трох мядзведзяў.

— Ну і што?

— Маша з’ела ўсю пахлёбку, а чым жа мядзведзіха накарміла тады малога Мішутку?

— Т-ак... Тут, брат, і сапраўды задача...

— А я, тата, думала, думала і прыдумала!

— Ну?

— Вось паслухай. Маша пайшла тады ў лес па грыбы?

— Ну, скажам, па грыбы.

— І назбірала грыбоў?

— Трэба думаць, што назбірала.

— А потым яна спалохалася мядзведзяў і ўцякла праз акно... А грыбы ж свае яна забылася!.. Ага! І Мішуткава мама падсмажыла іх маленькаму... Праўда?

СУМНАЯ КАЗКА

Людзін і Анін тата сёння вельмі рад.

У школе, дзе ён працуе дырэктарам, адбываецца цікавая сустрэча. Сустрэча школьнікаў малодшых класаў з вядомымі дзіцячымі пісьменнікамі.

Але гэта яшчэ не ўсё.

У першым радзе за партай сядзіць яго першакласніца — Людачка. Ціхая, светлая, любая. Яму гэта добра відаць з-за стала прэзідыума, дзе ён прысеў з шаноўнымі гасцямі. Як хутка ідзе час: учора, здаецца, хадзіць вучылася, а ўжо і ў форме з белым фартухом, і глядзіць так разумна ды ўважліва — ну, не зморгне…

Ды гэта яшчэ не ўсё!..

Побач з Людай сядзіць Аня. І гэтай хутка будзе пяць год. Ужо і выцягвацца Пампушка пачала. І не сядзіцца ёй, як усюды.

А тым часам у залу, на мноства і светла- і цёмнавалосых галовак з трыбуны безу-

пынна сыплецца гарохавая траскатня даклада:

— ...Тыдзень дзіцячай кнігі мы сустракаем сёння ў абстаноўцы небывалага ўздыму нашай прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры. У цеснай сувязі з гэтым...

Тата чуе ўсё гэта ўрыўкамі. Бо ён прывык ужо і слухаць і думаць адразу. А яшчэ і таму, што ён усё глядзіць у залу, непакоіцца за парадак і цішыню. Няёмка — і госці такія, і дакладчыца з самога аблана!..

— ...Вялікі пралетарскі пісьменнік Аляксей Максімавіч Горкі, звяртаючыся да нашай моладзі, справядліва заўважыў, што...

«Ах ты, божа мой!— думае тата.— Не хапала клопату, дык і Пампушку яшчэ ўзяў!.. Дырэктар, называецца! А ўсё яна, узорная мама: «Вазьмі, вазьмі, няхай малая развіваецца...»

А гэтай ужо зусім не сядзіцца. Не толькі круціцца ва ўсе бакі, але і шэпчацца, і хіхікае — на вялікае гора старэйшай сястры. Людачка то злосна тузае яе за рукаво і нешта шэпча, то разгублена глядзіць у прэзідыум, змагаючыся з жаданнем гукнуць: «Ну, тата, ну супакой ты яе!..»

Салідная, поўная дама — дакладчыца — на нейкі момант спыняецца, каб акуратна

прыгубіць вады, і зноў працуе — натхнёна і мужна:

— Выдатны савецкі педагог і пісьменнік, стваральнік навукова абгрунтаванай методыкі выхаваўчай работы з дзіцячым калектывам, Антон Сямёнавіч Макаранка, маючы на ўвазе...

«Ах, які сорам!..»

Стары, паважаны, любімы пісьменнік сядзіць ажно неяк панура, нават пачырванеўшы, як быццам з натугі. І не здагадаешся, не ведаючы, што хай ён толькі ўстане, ды надзене акуляры, ды пачне чытаць — нарагочуцца і дзеці, і дарослыя!..

А ў зале такі шум...

«Ах, які сорам!..» — чырванее малады дырэктар. А больш за ўсё — за сваю, за Пампушку. Ну ж і не ўрымсціцца, распуста!..

І тата нават патрос на Аню пальцам, пагразіў ёй: «Ну, глядзі ж!..»

Пасля, калі закончылася ўсё — і вершы ды апавяданні з трыбуны, і звонкі смех ды дробныя, шумныя воплескі, калі пайшлі і паважаныя госці, і дзеці,— тата, ужо на вуліцы, прыступіў да свае «распусты»:

— Дык чаму ж гэта ты паводзіла сябе так дрэнна, га?

А яна глядзіць на яго хітрымі шэрымі

вочкамі з-пад залацістых брывей і — эх вы, чырвоныя шчокі ў белай пуховай шапачцы! — пытаецца:

— А чаму тая цёця чытала такую сумную казку, га?

Тата праз нейкі момант думае, што ж адказаць. І педагогам быць яму цяпер — не хочацца...

АБРАЗЫ ЦІ ПАРТРЭТЫ?

Хата «пана Дзядзюлі» прасторная, светлая, з пабеленай перагародкай.

Праз тры акны большай палавіны відаць адразу лес і возера — рыжы гушчар сасновых стваловў, маладая трава, вечназялёныя лапы і вялікая, спакойная вада.

На белай пярэдняй сцяне вісяць два каталіцкія абразы. На адным з іх Езус у цярновым вянку, а на другім — божая маці з Езусам, калі ён быў яшчэ зусім малы.

У хаце Люда, Аня і Волечка.

Першая з іх вось-вось скончыць першы клас, другая, Волечка, пойдзе ў школу гэтае восені, ну, а Пампушцы толькі шэсць.

Малым загадана трымацца зусім ціха, і яны пакуль што трымаюцца...

Бо там, за белай перагародкай, ляжыць хворы гаспадар гэтай хаты, сам «пан Дзядзюля», стары, зусім адзінокі ўдавец. Каля яго, на крэсле, якое ледзь ліпіць ад стара-

сці, асцярожна сядзіць Людзін і Анін тата. Ён наймае дачу. Для сваіх і для Волечкі з яе мамай, бо хата ў «пана Дзядзюлі» — пяцісценка.

— Ой, паночку,— чуваць хрыпаты, але яшчэ бадзёры, нават агрэсіўны голас гаспадара.— Што цяпер за дачы, і што цяпер за дачнікі!.. Пшэпрашаёнц вас, адна нудота. Тыя разы прыедзе да мяне пан Казік з Варшавы, спачатку пацёнгам, а потым вузкакалейкай, ды я яго яшчэ на станцыі, за паўтара кіламетры, сустрэну, дык ён мне два злоты дасць. Ганарова, не токма што!..

Тата прыехаў з дзяўчаткамі на сваёй машыне. Вунь ён стаіць на вуліцы, іхні «масквіч» — сіні, каля самага плота.

— Вы нам, таварыш Дзядзюля,— гаворыць тата,— чамаданаў падносіць, вядома, не будзеце. Мы і самі не ўломкі, дый не паны.

— Ой, пане дырэктожа, якое цяпер панства! Пшэпрашаёнц пана, смех адзін — дый годзе. У мяне вунь летась жыў з сям'ёю пан Іван Пятровіч, дацэнт, дык той мне ўвесь лужок скасіў! Ха-ха-ха!

У хаце — хоць і прасторнай і светлай — стаіць нейкі невыказны ды непаўторны дух неабжытасці, сумнай і затхлай даўніны...

Люда, найбольш паслухмяная і сталая, стаіць каля акна і глядзіць на траву — і бліжэй, перад вокнамі, і далей, у лесе, над возерам. Тут будзе зараз многа-многа кветак. Як яна будзе іх збіраць!..

А Волечка і Аня, седзячы на старой скрыпучай канапе, глядзяць на абразы.

— У нашай бабулі,— шэпча Пампушка,— багі не такія. Яны меншыя, і яны вісяць у кутку. А гэта, Волечка, партрэты.

За сцяной тым часам перайшлі да торгу.

— Мне дзіўна, таварыш Дзядзюля,— гаворыць тата,— што за зіму ў вас так падскочыла цана. Летась вы бралі семсот пяцьдзесят за сезон, а цяпер сіганулі адразу да тысячы...

— Ой, паночку, каму трэба, хто хоча, каб дзеткі свежым паветрам падыхалі, той нідзе не падзенецца — заплаціць! Што цяпер гэтыя тысячы? Пшэпрашаёнц пана, патруха! А час які?.. Тыя разы пан Казік...

Чарнавокая Волечка глядзіць на боскую матку з Езусікам на руках і шэпча:

— Ах, зануды якія! Самі вунь як разадзетыя, у каронах, а дзіцятка — босае!..

ПЕРШЫ СНЕГ

Як ён ішоў

Паклікала Снежка Снежку — і давай уперабежку! Ад хмаркі ды да хмаркі: «А дзе ты? Ку-ку!..» Нібы тыя камарыкі куццю таўкуць. Белым пухам ад хмараў — да самае зямлі. Садзяцца на папары, на лузе, на раллі, у садзе за адрынаю, на градах, прыгуменні... І сыплюцца, і сцелюцца пярынаю — па саменькія калені!..

А пакуль сабе перабежка — за Снежкаю Снежка, пакуль яны і сыплюцца, і сцелюцца бясконца, спіць усенька па працы, і ў адной толькі хатцы свеціцца самотнае аконца.

Лямпачка ля ложка, у куточку. І, прылёгшы побач на падушцы, бае мама хворанькай дачушцы — каратае беленькую ночку:

— Паправішся, паправішся, няўжо ж, і вырасцеш вялікая. І ў школу пойдзеш, а што ж! У новенькай сукенцы. Будзеш і прасці, маленькая, ты ж ужо добра смыкаеш. Дам табе вераценца. А правенькае!..

Спі, Марыся, заплюшч вочкі — і галоўка перастане...

А за вокнамі — дзе ні глянеш — беленькая-беленькая ночка...

— Снег ды снег, а табе не відаць... Праўся — тата зробіць санкі, валёначкі абуеш і — эх! — гуляць: тэп, тэп па снезе да Тацянкі!.. Смяешся!.. Праўда, а што ж! Ужо й да свят дзянькі палічаны. Куплю табе свечак на ёлку, няўжо ж,— прадам толькі асмычыны. Прывязе яе тата — у снезе, у снезе! Ледзьве з ёю ў хату ўлезе!.. Кучаравая, зялёная!.. Паставім на ўслоніку ці на лаве. А коцік наш — мурр, мурр з печкі — уталопіцца на свечкі... А што, коце-варкоце, дзівіся!—засмяецца Марыся. Смяешся!.. Праўда, праўда, дочка. І галоўка перастане...

А за вокнамі — дзе ні глянеш — беленькая-беленькая ночка. Перапырхваюць зорачкі-Снежкі, як камарыкі, перад аконцам, перапырхваюць і сцелюцца бясконца... Эх, сыплюцца!.. Уранні сцежкі паміж нашымі гумнамі, хатамі прабіраць будзем лапатамі.

Пра «козачку»

Сплю я, а нехта торкае:

— Уставай, уставай, Рыгорка! Снегу

сёння, унучак!.. Вох, вох... А я зноў занямог... А каб яе, з той «казою»!.. Ды ўставай жа ты, бо лазою як сцебану зараз... Ну! Снеданне гатова, а ён, як пан, да відна. Гаспадар — адно слова, і сораму няма!..

Устаў я ды да акна. А там, мае ж вы браточкі, беленькая зіма! Што нарабілася за ночку!..

— Стане, унучак, дарога санная, і добрыя людзі, як дым, адзін за адным — па дровы! А мы з табою, сам знаеш — з «казою» ды на каўзачку... Што стары, што малы — адно слова. Ой, даў я табе патачку! А сам, глядзі: вох, вох — як на злосць, занямог... А ўсё гэта, я ж і кажу, праз тваю, брат, «казу»...

Дзед не пра тую, што ме-ке-ке з барадою, а пра «козачку» — санкі, якія зімою памагаюць саням дзеравякі вазіць урасточку. Ну, а ўвечары іх на аборачку, завалок на горачку і — эх! — пайшоў!.. Хоць усенькую ночку!..

— Ой, дзядуля,— кажу я.— І так усе хлопцы смяюцца: «Адкуль тыя ахі ды вохі бяруцца?» А ты ўсё вох ды вох. Не ад «козачкі» ты занямог!..

Гэта яшчэ да марозу было, як хадзілі мы ў лес. Сяк ды так — упрасіў я дзядулю з печы. Вохкаў ён, вохкаў, і ўсё ж такі злез,

усцягнуў свой кажушок на плечы, сякеру ўзяў, рукавіцы, башлык. І паджгалі мы ў лес пехатою.

— Прывык ты, жаба, прывык... Бяда дый годзе з табою,— пачаў дзядуля яшчэ з сяла.— Прычапіўся ты з гэтай «казой», як смала...

А я сабе следам за дзедам тапчу і маўчу. Мне б толькі тую «казу» да марозу, на горачку яе за нашай хатаю! Знайсці б толькі бярозу палазаватую — я больш нічога не хачу!..

І знайшлі мы яе, і давай, і давай!.. Ай-я-яй!.. І гахкалі, і кракталі, а ўсё ж такі досталі — два палазы і пяць вязоў — усё, што трэба на «казу»!..

Мы іх парылі дома, і гнулі, і секлі пасля, і дзяўбалі, а тады яшчэ ў кузню яе зацягнулі ды як след падкавалі. Гатова!

Дзед і кажа:

— Вазіся здаровы! Дзяры маміны боты. Толькі ў цябе і работы. А я тым часам — вох, вох — зноў занямог... А ўсё гэта, я ж і кажу, праз тваю, брат, «казу»...

Гэта было яшчэ з восені, калі мы палазы тыя з лесу прыносілі. А сёння я ўстаў, да акна — ах, мае ж вы браточкі! Беленькая зіма! Што нарабілася за ночку!.. Паглядзеў я ды ціхенька з хаты.

— А ты куды?— запынiла мама.— Голы? Ну ж i заўзяты! Сёння кажушак надзень, аблавушку. Лета, цi што?

А дзядуля таксама:

— Рукавiцы вазьмi. А ў кажушку яно, брат, зiмою смялей. «Каза» там, глядзi, на адрыне. Пачакай, мо адзiн не вярнi, памагу. Яшчэ колы там скiнеш... Вох, вох, не магу...

А я:

— Не трэба, дзеду! Ты шапкi свае не бяры! Бо пакуль ты ў адрыну, я не толькi што «козачку» скiну, а разоў мо са тры з нашай горачкi з'еду. Сядзi, дзядуля, не трэба «вох, вох»!..

Сказаў, а сам за парог.

— А няўжо ж, зашпiлюся! — крычу знадворку маме. А сам — гоп, гоп i смяюся. Ах ты, белы сняжок пад нагамi!..

Зняў я з адрыны «казу», на аборачку i па-ва-лок на горачку. Сеў, умасцiўся i — эх! — пусцiўся!

Ой, бяроза ды лаза!
Ой, каза мая, каза!
Толькi боты задзiрай,
Толькi добра пазiрай,
Каб не трапiў на ухабу!
А яна iдзе, гудзе!..
Не аддам за вашу бабу
Майго дзеда — ого, дзед!..

ВАЯКА

Хутка растуць не толькі чужыя дзеці.

Вось і гэты ваяка — ці даўно ён зрабіў першы крок, на другім паваліўшыся?

Ці даўно ён грозна крычаў на пеўня, сам мала што большы за яго:

— С-ся-галь мась!!.

Той, вядома, не хацеў рабіць «шагам марш», а толькі трохі адбягаўся ад Коркавай палкі.

Дый палка не вельмі слухалася ваякі — часта ляцела зусім не ў той бок, куды трэба.

Зрэшты, тады двухгадовы Юрась і сам, часамі ў найбольш адказны момант, забываўся, што яму, чалавеку, трэба быць мужным. Пазалочаны, сіняхвосты кукарэка, страхата для ўсіх суседніх пеўняў, станавіўся ў позу бясстрашнага абаронцы курэй і, задраўшы сваю чырвоную бараду, абураўся на Юрку:

— Дык што ж гэта ты? Ко-ко-ко!..

А чалавек — чамусьці раптам пакінуўшы сваю палку — паварочваў назад і бег да бабулі, што сядзела на ганку, бег і, растапырыўшы пальчыкі, шчабятліва прасіў:

— Баба, місянькі, місянькі, місянькі!..

Цяпер, калі яму ўжо тры гады, Юрка ведае, што вісянькі — гэта вішні, а місянькі — гэта Мішкі-мядзведзі.

Як ён іх любіць — мішак! І ў кніжках, і плюшавых, і гумовых...

Аднак найбольшы любімец Юрася — маленькі гумовы Мішка, у сіняй куртачцы і ў чырвоных шараварах, з рукзаком і кіёчкам — Мішанька, якога тата купіў у далёкім лясным раймагу...

Ох, і балбатуны ж мы, дарослыя!.. Мішанька сам прыйшоў да Юркі з лесу, каб дружыць. Ён уцякаў ад воўка, і Юрась яго абараніў...

У той залаты вераснёўскі дзень яны ездзілі ў пушчу, ажно на кірмашы былі ў адным лясным раённым гарадку. А едучы назад, спыніліся і на паляне пры дарозе распалілі вогнішча. І тата, і мама, і Люда, і Анечка — усе збіралі сушняк. Юрась, вядома, з татам. І вось, калі яны зайшлі ў лес, з-пад елачкі на сцежку выйшаў да іх маленькі Мішка з рукзаком... Ах, колькі радасці было!.. А тата яшчэ сказаў, што

гэта за Мішкам гнаўся воўк і трэба яго адагнаць.

Тата ўзяў з багажніка машыны стрэльбу... Не, Юрась не баяўся! Ні крышачку!.. Ён сам тады стрэліў на воўка. Праўда, стрэльбу трымаў тата, але ж Юрка разам з ім сам націснуў пальчыкам на спуск, і калі стрэльба бухнула, нават і вочак не заплюшчыў!

О, Юрась цяпер храбры!

Ён ужо нават і іншых у крыўду не дасць.

А найбольш ён бароніць, вядома, сваю маму.

Праўда, цяпер яны бываюць разам трохі менш, чым раней, бо мама ходзіць на работу. Затое ўжо калі спаткаюцца, калі прылягуць разам на адной падушцы — ну ж і нагалубяцца, і нагаворацца!..

Найбольш, вядома, у Юркі пытанняў. Тысяча і адно — за дзень! Прычым самы шырокі абсяг — пачынаючы з таго, чаму ў суседнім пад'ездзе рыжы кот — без хваста, і да таго, чаму сонца заўсёды гарачае...

А ёсць і такое:

— Мама, хочаш, я табе са свае галавы раскажу?

— Хачу.

Загарэлыя ножкі з абабітым левым каленам перастаюць «стрыгчы».

Пачынаецца казка.

— Ідзе па лесе воўк!.. Ідзе... Ідзе...

— Ой, я баюся! — туліцца мама ў падушку.

Чорныя вочы сына глядзяць на яе — з поўнай верай у гэты страх. А потым Юрась абнімае сваю матулю, цалуе і весела кажа:

— А ты не бойся! Я таго воўка застрэліў! А гэты мой — на-ма-лё-ве-ны!..

МЫ З ІМ СЯБРЫ

У выходныя дні — з дванаццаці да дзвюх гадзін — хворых дзяцей у бальніцы адведвалі родныя.

Леў Аркадзевіч Міленькі, па прафесіі няўлоўны гаспадарнік, а па натуры сангвінік з выдатным апетытам, прыйшоў у дзіцячае аддзяленне да пляменніцы Раечкі.

Яна ляжала на першым ад парога ложку, у паласатай фланелевай піжамцы, пастрыжаная пад хлопчыка, чорненькая, з жывымі карымі вачыма...

— Ну, дзень добры! — сказаў таварыш Міленькі, пагладзіўшы малую па галаве.— Ты адна ў палаце, а ўсе дзяўчаткі гуляюць?.. Ты думала, што як не можа прыйсці да цябе сёння мама, дык гэта ўжо і ўсё? А ты думала, што ў цябе ёсць яшчэ і дзядзя Лёва?..

Пастрыжаная пад хлопчыка чатырохгадовая істота, прыўзняўшыся на локці, глядзела на госця моўчкі.

— А наогул дык твой дзядзя маладзец,— гаварыў ён на ўсю палату гучна і з качарыным сытым пасіпваннем.— Ён жыве ў Барысаве і думае, што гэта не семдзесят кіламетраў ад Мінска, а семсот, і што ў яго няма службовай машыны, а толькі балагольскі конь і воз, як у твайго, Раечка, дзядулі, каторы — мой тата. І калі дзядзя Лёва ўбачыць сваю сястру і пляменніцу раз у год, дык ён лічыць, што ён харошы чалавек. І Раечка цяпер думае, што навошта ёй такі дзядзя... Ты думаеш так? Ты маўчыш і не кажаш, што ты думаеш. Ну, адкрыем, калі так, свой партфель і зноў будзем дружыць. Вось гэта мандарынкі. Калі іх можа цяпер дастаць кожны і вельмі лёгка, дык яны, вядома, вельмі нясмачныя. Ну, а тут паглядзі!..

Тут былі шакаладныя цукеркі ў розных паперках і каробка пячэння.

— Ну, ты будзеш дружыць з дзядзем Лёвам?

Карыя вочкі пахітрэлі. Г алоўка кіўнула на згоду.

— І вельмі добра! — усцешыўся дзядзя.— Ты сядзь. Вось так. І еш. А я пасяджу. І мы пагаворым.

Белыя зубкі надкусілі сонечную лупіну, а пальчыкі спрытна ўзяліся здымаць яе,

агаляючы церпка-салодкую, духмяную смакату.

— О, на здароўе! — шырока ўсміхнуўся румяны, поўны, чыста паголены дзядзя.— Еш і «Мішка на север», і «Вясна», і «Дзетачка», і пячэнне «Пясочнае»... Ну, а што ты маўчыш? Смачна?

— Угу,— пачулася з поўнага роціка.

— Ну, а дзякуй хто дзядзю Лёву скажа?

— Дзякуй...

— На здароўе. Расці вялікая і разумная. З дзядзем Лёвам можна дружыць? Хе-хе-хе!..

Ды тут з калідора прачыніліся дзверы, паказаўся жаночы твар, пачуўся голас:

— Таварыш Міленькі!..

— Ну? — азірнуўся дзядзя Лёва.

— Калі мы з вамі чакалі на ліфт, вы казалі, што ідзяце да пляменніцы Раечкі.

— Ну, а калі вы паехалі ліфтам першыя, а я паехаў другі раз, дык я, прабачце мне, па-вашаму, маленькі, сам не траплю?

— Ой, таварыш Міленькі, пакіньце жартаваць! Гэта палата — сёмая, а Раечка сядзіць у шостай і плача...

Дзядзя Лёва закрыў свой рот, падціснуў губы і ўтаропіўся на тое, што сядзела ў ложку і спрытна распраўлялася з другой

ці трэцяй мандарынкай. На коўдры перад ім, як на прыполе, былі рассыпаны цукеркі ў рознакаляровых паперках і ляжала раскрытая каробка пячэння.

— Слухай, ты! Ты — не Раечка?

— Не, дзядзя, я Юрка.

— Ну, а чаму ты ясі не твае мандарыны?

— Вы, дзядзя, мне далі. І я сказаў вам «дзякуй».

— Ты сказаў мне «дзякуй»? А што мне скажа Раечка?.. Яна мне скажа: ты, дзядзя, стары дурань!.. Гэта давай сюды. І гэта давай... А гэта... Ну, тваё шчасце!..

Таварыш Міленькі згроб сваёй вопытнай рукою ўсю раскошу ў гаспадарніцкі выносілівы партфель і, не сказаўшы больш ні слова, пайшоў з палаты.

Юрка астаўся зноў адзін. Ён з'еў апошнюю дольку мандарынкі і толькі хацеў засумаваць, што вось і не ідуць усё... Ды тут адчыніліся дзверы і — урра! — увайшлі мама з татам.

Першай навіною, якую ён ім расказаў, зноў жыва аплятаючы ўсякую смакату, быў, безумоўна, дзядзя Лёва. Ён і вясёлы, ён і добры, ён і Міленькі, ён і прыйдзе яшчэ раз!..

— Дудкі, браток! — смяяўся тата,—

Двойчы так не памыляюцца. Твой дзядзя больш не прыйдзе.

Але сын быў упарты.

— Не, тата, прыйдзе. Мы з ім цяпер сябры! Ён сам сказаў: «Давай дружыць». Сам сказаў ды не прыйдзе?..

І верыў Юрачка доўга, пакуль не паправіўся.

СОНЕЙКА

Такое ёсць у Рубенса.

Тоўсценькі, гарэзлівы рагатунчык з карціны «Вакх», у тон сытай, хмельнай весялосці дарослых, вось ужо больш трох стагоддзяў робіць сваю «непрыстойную» справу — струменіць проста на ўдзячнага гледача.

Такое было нядаўна на кінаэкране.

Дацкі хлопчык,— сынок вясёлага, мудрага бедняка Жывадзёра і брацік мілай Дзітты — дзіця чалавечае,— выбегшы на парог старой хаціны, вітае сонца серабрыстай дужкаю... Зноў жа на радасць вельмі шматлікаму гледачу.

Такое было...

Ды навошта апраўдвацца?

Вось і цяпер, пагодлівым вясновым вечарам, у адной з легкавых машын, што — як кажа захоплены ёю вадзіцель-аматар — пчолкай ляціць над бясконцым асфальтам шашы, пяцігадовы пасажыр чамусьці пера-

стаў глядзець у акно... Пяшчотна шаргануўшыся ўжо трохі загарэлай шчочкай аб бацькава рукаво, хлопчык штосьці шапнуў. Такое штосьці, ад чаго машына амаль адразу спынілася.

І вось ён — мільённы ці мільярдны, як там хочаце, але ж заўсёды і ва ўсім прыгожы маленькі чалавек — стаіць на зялёнай абочыне, пад ахутанай сонцам бярозкай, і вельмі засяроджана «працуе пад Рубенса»...

У лесе перад ім кукуе зязюля, нібыта адлічвае час. Яна — трохі воддаль. А зусім, зусім, здаецца, блізка — настройваецца на вячэрнія песні сам салавей. З нядбайнасцю вялікага, сапраўднага майстэрства, з бязгрэшнаю, без усякай позы, свабодаю творчай адзіноты.

— Тата!

— Ну што, стары? Паехалі? Што загледзеўся?

Задуманы сын не спяшаецца.

— Тата.

— Ну чую. Што?

— А чаму іх... во гэтых, жоўценькіх, так многа-многа? Гэтых вунь, што як сонейка!..

Загарэлая рука маленькага чалавека, якую бацькам доўга хацелася б называць

толькі ручкай, працягваецца і паказвае на шчодра рассыпаныя па зеляніне абочыны кветкі самай звычайнай курынай слепаты.

— Чаму, тата? Чаму?

Бацька прывык да гэтых бясконцых пытанняў, і ён адказвае, гаворыць першае, што прыйшло ў галаву:

— Каб хораша было.

А сам міжвольна ўспамінае сынаў сон. Яшчэ зімовы.

Калісьці,— скажам, год ці нават больш таму назад,— прачнуўшыся і пачуўшы: «Што ж ты сёння сніў?», Юрка і маме і тату адказваў даволі стандартна, нават як быццам з адценнем падхалімажа: «Цябе». І ўсміхаўся пры гэтым так хітра і міла, што і такі адказ падабаўся. Ды такое бывала раней.

Гэтай зімою, калі ён увечары доўга не засынаў, мама, вядома ж, хвалявалася: «І яшчэ ты не спіш? Ну, я табе!..» І далей ішла якая-небудзь пагроза, сама па сабе даволі суровая, аднак, амаль заўсёды платанічная. А ўсё ж Юрка моцна заплюшчваў вочы і на нейкі час заціхаў. А потым аднойчы здзівіў, насмяшыў сваю маму яшчэ адным доказам самастойнасці:

— Ну і чаго ты на мяне злуеш? Я ж нічога не чапаю. Паляжу, падумаю і засну.

Бацька, калі ён апошні раз у даны дзень праходзіў каля сынавага ложка, абавязкова спыняўся над ім, затрыманы або ружовым вухам, што агеньчыкам віднелася паміж беллю падушкі і коўдры, або ўсмешкай свайго наследніка, які тым часам, моцна заплюшчыўшы вейкі, рабіў выгляд, што спіць. Крадком ад мамы, нібыта строгай да іх абодвух, яны яшчэ раз ціхенька развітваліся...

Вітацца ўранні — таксама здорава.

— Ну, як жывеш? Што сніў?

Пытанне такое, на дзіва, абодвум не прыядалася, тым больш што адказы бывалі часам пацешныя.

Аднойчы Юрка сказаў:

— Налавіў многа-многа божых каровак! Поўную ручку!.. Во так, во!— паказаў ён, прагна сціснуўшы кулак.

— І выпусціў?

— І выпусціў. Во так, во,— раскрыў ручку, і яны па-ля-це-лі!..

Гэты зімовы сон і ўспомніў бацька цяпер, стоячы са сваім Юркам на лясной, залітай вячэрнім сонцам абочыне.

Потым, пад лёгкі, пагоністы гул іхняй «пчолкі», разам з малым нястомна гледзя-

чы ў акно, даўно дарослы, ужо трохі сівы і трохі прыцёрты жыццём, чалавек разпоразу, да шчаслівай, ледзь не балюча шчаслівай усмешкі ўяўляў загарэлую і падрапаную катом ручку, што раскрываецца і выпушчае на волю жаўтакрылыя, стракаценькія істоты з казачнай назвай — божыя кароўкі. Уражаныя такой нечаканасцю, яны спачатку нейкі момант думаюць, а потым, паверыўшы шчасцю, распроствоюць верхнія шалупінкі і ніжнія банцікі сваіх крыльцаў і — адна за адной — узлятаюць з маленькай цёплай далоні.

І — як ні дзіўна — здаюцца бацьку вельмі падобнымі да тых несамавітых жоўтых кветачак на бязмежнай зеляніне абноўленай маем зямлі, якія нагадалі сыну сонца.

3

МОЙ ЧЭХАЎ

Ёсць і такая задума: напісаць гісторыю мае дружбы з кнігай. Не напісаўшы, цяжка пераканаць каго-небудзь, што гэта будзе цікава. А пісаць пакуль што не хочацца: яшчэ ўсё баюся, што не здолею адшалушыць ад значнага, патрэбнага для іншых, толькі сваё, асабістае, вузка прыватнае.

Цяпер вось дакранаюся да той задумы з першым, можа, наймацнейшым хваляваннем. Хачу пісаць пра Чэхава. Пра пачатак нашай дружбы, пра маю сардэчную любоў. I не баюся, што я не першы, нават не тысячны,— да гэтай крыніцы з гаючай вадою ніколі няма чаргі: усе падыходзяць адразу...

Успамінаю цень нарачанскай сасны, прымятую траву з затоенымі ў ёй ненадакучліва мулкімі шышкамі, ласкавы плёскат

хвалі пад узгоркам берагу, звонкі смех загарэлай малечы... Як тут добра прылегчы над кнігай! Наш польскі госць і друг Леан Кручкоўскі ляжыць у тым самым цяньку і таксама чытае. Я ведаю — што. Нават як быццам прадбачу і тыя ягоныя словы, якія праз пару месяцаў буду з прыемнасцю перакладаць:

«Шчаслівыя хвіліны! Яшчэ том Чэхава ў рукі — і чаго ж болей трэба, каб стаць багацейшым на пэўную частку чалавечага вопыту, ведаў, мудрасці?..»

Мала бываў я на шырокім свеце, многае назіраў мімаходзь.

За нямецкім калючым дротам, у бараку палонных французаў бачыў на дзвярах спіс кніжак іхняй бібліятэкі. І пастаяў перад ім, бо з невымоўна прыемным пачуццём заўважыў у тым французскім спісе родныя імёны: Гогаль і Чэхаў.

З іншым трохі, але таксама па-зямляцку радасным пачуццём давялося нядаўна, спыніўшыся перад адным з кніжных магазінаў Рыма, распазнаць на стэндзе, сярод залітых сонцам каляровых вокладак, «Вайну і мір» і зборнік чэхаўскіх навел.

Зрэшты, і не бачачы ўласнымі вачыма, не так ужо цяжка ўявіць шматтысячную, а то і шматмільённую армію жыхароў Зям-

лі, закаханых у творчасць Чэхава — кожны па-свойму.

Дык маю ж права на гэта і я? Не, не тое пытанне — так яно не толькі не гучала, але і не ўзнікала ў душы. Я любіў і люблю яго, не пытаючы ні права, ні дазволу. Без рэўнасці да іншых, хто яго любіць таксама. І гэта — самая чыстая, самая высокая, самая няздрадная любоў, часціна той магутнай сілы, што яднае людзей добрай волі.

Мой Чэхаў.

Маю права сказаць так, не баючыся найбольш з'едлівага скептыка. Мой — у тым сэнсе, што і я знайшоў сцяжыну да гэтай крыніцы адзін, самастойна, што ад маёй юначай закаханасці з першага позірку, ад самотнага захаплення яго першымі старонкамі — адтуль для мяне пачалося і сталае, мудрае — наш.

А раней было — мой.

Раскажу пра майго.

Не пажоўкла ад часу адна з першых старонак гісторыі мае дружбы з кнігай. Успамінаў яе днямі, гаворачы з дачкоюшкольніцай, з непакоем — ці не зарана? — даючы ёй Дастаеўскага... Цяпер успомніў тую старонку яшчэ раз, ужо апошні раз

перад тым, як замацаваць і гэты неадчэпны ўспамін на паперы.

Калі мне было пятнаццаць, увосені трыццаць другога года, пралез я даволі шчасліва ў адну бібліятэку. У мястэчку Турэц на Навагрудчыне, дзе я год перад гэтым скончыў польскую сямігодку. Бібліятэка была прыватная, з пераважнай большасцю кніг на яўрэйскай мове. Плаціць за карыстанне кнігамі трэба было нямала. І заклад быў таксама вялікі. Аднак маці дазволіла мне гэтую раскошу — і не таму, што я быў меншы ў хаце і найбольш слухмяны, а з любасці яшчэ і да кніг, якія я часта чытаў ёй уголас. Словам, восень тую пражыў я шчасліва, аддаючы кожнай кнізе, звыш грашовай даніны, яшчэ і восем гразкіх або падмарожаных кіламетраў — чатыры туды і чатыры дахаты. Часта і многа — апавяданне ці пару раздзелаў рамана — прачытваў прыхваткам у дарозе...

Як жа не ўспомніш такое, калі цяпер дзяўчынка зойдзе ў твой кабінет, паглядзіць на паліцы з сотнямі жывых імён на любой стракатасці пераплётаў і скажа з наіўна-пацешным сумам чатырнаццацігадовай асобы: «Эх, пачытаць няма чаго!..»

У той бібліятэцы былі:

Горкі — раннія апавяданні і вершы,

«Маці» без першых і апошніх старонак, чацвёртая частка «Жыцця Мацвея Кажамякіна»;

«Сон Макара», «Сакалінец», «Лес шуміць» і сёе-тое яшчэ Караленкі;

«Белыя ночы», «Нетачка Нязванава», «Сяло Сцяпанчыкава» Дастаеўскага;

паасобныя апавяданні Скітальца, Касаткіна, Маміна-Сібірака;

быў другі том «Анны Карэнінай»;

былі ўспаміны жонкі «славутага» Захер-Мазоха і іншыя не менш пікантныя кнігі, якія і я цяпер не дазволіў бы чытаць падлетку, аднак, якія не зрабілі мне, здаецца, шкоды, бо я на ўсю душу зачараваны быў велічнай музыкай класікі.

Гэта не былі, безумоўна, мае першыя рускія кнігі. Калі мы ўлетку дваццаць другога года вярталіся ў бацькава Загор'е з Адэсы (бацька там трыццаць год працаваў на чыгунцы), у нашым няхітрым багажы сямейным скарбам з савецкага горада ў глухую заходнебеларускую вёску ехалі ўслед за трыма хлапчукамі Пушкін, Лермантаў, Жукоўскі, Крылоў і яшчэ некалькі кніг, якімі азначан выток мае жыццедайнай сыноўняй любві да вялікай рускай літаратуры.

Бывалыя і пакалечаныя томікі з той

местачковай бібліятэкі ўспамінаю са шчырай удзячнасцю. Не ў крыўдзе я, вядома, і на гаспадароў гэтай прыватнай асветніцкай установы — за тую дзелавітасць, з якой яны дралі з мяне матчыны залатоўкі, і за Талстога, і за Мазохаву жонку аднолькава. У дні вайны ад рук фашыстаў загінулі ў нашым мястэчку ўсе адзінапляменнікі вясёлага мудраца Шолам-Алейхема, сярод якіх былі не толькі мае добрыя знаёмыя, але і сябры маленства. І няма ў каго сёння спытацца, каб удакладніць: тыя дватры дзесяткі і выпадковых, і характэрных па тэматыцы кніг — ці не маюць яны дачынення да бібліятэкі, якая на пачатку стагоддзя была заснавана ў недалёкім старадаўнім гарадку Міры самім Горкім?.. Не, гэта не легенда. Яшчэ жывуць прадстаўнікі той мірскай інтэлігенцыі, перадавая група якой пісала ў свой час Аляксею Максімавічу з просьбай дапамагчы ў арганізацыі бібліятэкі, на што нястомны Буравеснік адгукнуўся пісьмом і пасылкамі кніг. І пісьмо тое, і бібліятэка не захаваліся. А мне чамусьці здаецца, мне прыемна думаць, што іменна з той, з мірскай, з «горкаўскай» бібліятэкі маглі быць і былі тыя кнігі рускай класікі, з якімі я так своечасова, так удзячна сустрэўся на парозе сталасці.

Чаму я ўспомніў пра ўсё гэта?

Таму, што там, у той бібліятэцы без шыльды, у тым местачковым доміку з крывым, дзіравым ганкам быў сярод іншых кніг і томік Чэхава.

Блакнот, у якім я тады запісваў усё, «што ўражала розум і сэрца», захаваўся. У ім запісаны смешна і міла нязграбным, як само цыбатае юнацтва, хуткапісам тры назвы:

«Ведзьма», «Белалобы», «Ванька».

З гэтага ён і пачаўся — мой Чэхаў.

Не памятаю, якія яшчэ апавяданні былі ў тым томіку, апроч названых. Думаючы цяпер, чаму іменна толькі яны, гэтыя тры, пакінулі наймацнейшае ўражанне, спыняюся на трох, найбольш характэрных элементах: адчуванне красы прыроды, любасць да жывой істоты, дружба з чалавекам. Можа, не вельмі ўдалы ён, такі падзел, аднак за кожным з гэтых трох пунктаў, а яшчэ лепш — за ўсімі імі адразу, стаіць ён — цудоўны свет непаўторных па сіле і чысціні перажыванняў маленства і юнацтва.

Значна пазней, у суровую восень сорак другога года, зроблен наступны запіс:

«Чытаў хлопцам «Ведзьму», асабліва захапляючыся класічнымі малюнкамі завірухі за вокнамі самотнай хаткі. Яскрава ўявіў самога Чэхава на бязмежжы аснежаных прастораў Расіі, пад словы песні «Извела меня кручина», і грудзі напоўніліся шчасцем творчых пакут...»

Я пакрывіў бы душою, каб сказаў, што ў пятнаццаць гадоў, чытаючы «Ведзьму» ўпершыню, захапляўся толькі апісаннямі прыроды.

Кудлатая рыжая галава і вялікія, даўно не мытыя дзякавы ногі, што не ўмяшчаліся пад зашмальцаванай коўдрай, здорава закранулі ў хлапечай душы тое самае, што разбудзіў і напаіў іскрыстай пеністай радасцю ні з кім не параўнаны ў сіле смеху Гогаль. Гогаль — з яго Наздровым, Манілавым, Шапонькам, з яго адпушчаным для пафарбоўкі даху міргарадскага суда пакостам, які канцылярысты з'елі з цыбуляй... А кіеўская бурса, а дзяк у гасцях у Салохі, а... Ды, божа мой, часта падумаеш цяпер: рэдкая птушка даляціць да палавіны Гогаля!..

А тут жа да яго, ужо вядомага і так любімага, далучыўся з такім задушэўным, хоць ціхім і стрыманым смехам яшчэ адзін — Чэхаў!..

А потым у Чэхава, побач з дзячком — і такім, і не такім, як гогалеўскі,— была яшчэ і дзячыха-ведзьма, здаровая, прагная прыгажуня, што тамліва чакала здаровай сілы кахання, той сілы, дзеля якой можна забыцца «на цюкі, на паштовыя цягнікі... на ўсё ў свеце». Куды там Гогаль з яго панначкай, што спакусіла Андрыя!.. Тут, у Чэхава, зусім інакш, чым ва ўсіх, каго я чытаў перад гэтым, была закранута тая слодыч «забароненага плода», што хвалюе нас у юнацтве непаўторна па сіле і свежасці ўспрымання.

Тым больш характэрным застаецца тое, што наймацнейшым у «Ведзьме» было для мяне адчуванне красы прыроды. Не выпадкова ж і запомнілася з тых дзён такое моцнае, такое простае, такое чэхаўскае апісанне завірухі, што лютуе за акном:

«А ў полі ішла сапраўдная вайна. Цяжка было зразумець, хто каго зжываў са свету і дзеля чыёй пагібелі заварылася ў прыродзе каша, але, мяркуючы па несціханым, злавесным гуле, камусьці даводзілася вельмі туга».

Гэта — далёка не ўсё, што адбывалася за акном, ды мне здавалася і здаецца, што ў карціне завірухі іменна гэтыя штрыхі найбольш істотныя, найбольш чэхаўскія.

Як млечны шлях, які «вырысоўваецца так ясна, нібы яго перад святам памылі і пацерлі снегам»; як тая птушка, што спявала ў гушчары «так старанна, нібы ёй давалі за гэта богведама якую плату»; як тое шкельца, што... Ды, божа мой, хочацца ўсклікнуць зноў: рэдка каму ўдаецца даляцець да палавіны чэхаўскага стэпу!..

Так усклікнуць я мог бы пазней, калі ўжо далёка-глыбока забраўся ў раскошны свет ягонай творчасці. А тады, хлапчуком, я толькі рот разявіў, толькі затрымцеў ад першага захаплення.

І не выпадкова, відаць, колькі б разоў ні перачытваў я Чэхава, у тых пачуццях, у той цудоўнай музыцы, што абуджаецца ў душы ад ягонага ўспрымання прыроды, першай струной звініць пачуццё ўпершыню перажытай радасці — сустрэчы з чароўным чэхаўскім светам.

Цяпер — пра «Белалобага».

«Нарэшце, шчанюк змарыўся і ахрып: бачачы, што яго не баяцца і нават не звяртаюць на яго ўвагі, ён стаў нясмела, то прысядаючы, то падскокваючы, падыходзіць да ваўчанят. Цяпер, пры дзённым святле, лёгка ўжо было разгледзець яго. Белы лоб у яго быў вялікі, а на лбе бугор, які бывае ў вельмі дурных сабак; во-

чы былі маленькія, блакітныя, цьмяныя, а выраз усёй морды надзвычай дурны. Падышоўшы да ваўчанят, ён выцягнуў наперад шырокія лапы, палажыў на іх морду і пачаў:

— Мня... мня... нга-нга-нга!

Ваўчаняты нічога не разумелі, але замахалі хвастамі».

Відаць, таму, што мяне перавезлі з горада ў вёску пяцігадовым хлопчыкам і пазнаваць прыроду я пачаў з некаторым спазненнем, паасобныя малюнкі яе адбіліся ў памяці з асаблівай сілай.

Рэчы для звыклага вока надзвычайна простыя: рамонкі на чыгуначным адхоне, васількі, калоссе, а над усім гэтым белыя кубкі ізалятараў на слупах, што бягуць насустрач нашаму таварняку з расчыненымі дзвярамі... Яшчэ прасцей: чатыры курыцы, выпушчаныя з падпечка на хату. То сястра, то кума, то суседка — хто ні прыходзіў да нас, каб сустрэцца з маёй маці, што вось і вярнулася пасля столькіх гадоў,— кожная што-небудзь прыносіла. Так яны і з'явіліся ў нашай хаце, чатыры курыцы, да якіх я прыглядаўся, для зручнасці прылёгшы на падлозе. Стракатая, белая, чорная, жоўтая... І ўсе з чырвонымі грабян-

цамі! А як яны стукаюць дзюбамі ў падлогу! А калі сонца засвеціць з акна,— якія ж яны ненаглядныя ў сонцы!..

Потым былі галубы, аднаго з якіх, сірату, я выкарміў сам. Быў сабака, з якім я дружыў дзесяць год і пахаваў якога, урачыста ўзрушаны. Былі каровы, якіх мы, праўда, білі попускам кіямі, але і напасвалі, нібы перапрашаючы за тыя здзекі, з асаблівай стараннасцю. Быў конь, з якім так добра было і маўчаць, і пагутарыць за плугам або ў лесе. Значна пазней, калі ён вынес цябе, партызана, з-пад куль, хацелася прытуліцца шчакой да ягонай цвёрдай шчакі, заглянуць у глыбокае, сіняе, ціхае вока...

Гэта ўсё было — кожнае захапленне ў свой час, гэта і сёння жыве, як дома, у найбольш утульным куточку душы.

З асаблівай прыемнасцю прачытаў я днямі простыя, мудрыя і такія вясёлыя словы Астапа Вішні:

«Ездзілі на паляванне. Гэта — не ўпершыню і не апошні раз. Нічога!

І як радасна, што я нічога не забіў!

І як радасна, што я яшчэ паеду (абавязкова!), каб што-небудзь забіць!

І як радасна будзе, што я нічога не заб’ю».

Гэты дзённікавы запіс азначаны датай: 23 студзеня 1952 года.

На паўтара года пазней і я меў шчасце пазнаёміцца з гэтым цудоўным сынам любай Украіны, быць у яго кабінеце, здзіўляцца процьме карцін і малюнкаў, падараваных яму сябрамі, па-блазенску, глыбока ў душы пабойвацца яго сабакі, што лез, мармычучы, да рук, каб палажыць і мне на далоні цяжкую, шакаладнага колеру, галаву. Як супрацоўнік «Маладосці», дзён некалькі перад гэтым я папрасіў Вішню даць нашаму часопісу якую-небудзь гумарэску. А ў прызначаны тэрмін атрымаў з яго рук зусім не сатырычную, а проста сонечную замалёўку. І так здзівіўся гэтаму, і так расчуліўся, калі ён, як спачатку здавалася, сатырычна-калючы стары ў парусінавым кіцелі, сівы, ссутулены, па-бацькоўску абняў мяне на развітанне.

Тады яму ішоў ужо сёмы дзесятак. А колькі ж па-дзіцячы пяшчотнага, чыстага было ў яго душы, добра знаёмай з бурамі і болем. Цяпер, калі ўжо і да мяне прыйшлі гады найбольш адказнай сталасці, і я з ціхай радасцю чую яго пасмяротны і несмяротны голас. І думаю, што вельмі добра таму, хто не растраціў пачуццяў, так шчодра адпушчаных нам пры ўступ-

ленні ў жыццё. І ў голасе Вішні мне чуецца нешта ад Чэхава, тое, чым падтрымаў ён нас у самым дарагім.

Таму і з'явілася гэтае адступленне.

Ну, а пры чым тут сабачка, у якога на лбе — адзнака дурасці, белы бугор? Да чаго тут і тое: «Мня... мня... нга-нга-нга»?

Ды да таго, што ў неабдымным свеце, які я люблю, на які я прагна і нястомна гляджу вось ужо больш за сорак гадоў,— у тым невымоўна прыгожым свеце гэты, так небывала пераказаны шчанячы брэх звініць для мяне напамінкам пра тыя восенскія вечары, калі я чыстай душою падлетка ўспрыняў яшчэ адно радаснае адкрыццё: у гэтым свеце ёсць цудоўны, родны чалавек, што ўмее так многа бачыць і так весела любіць!..

Неўзабаве пасля гэтага ён прывёў мне сваю непараўнальную Каштанку, з яе трывогай, што гаспадар можа знайсці і з'есці схаваную за шафай курыную лапку. Ён паказаў мне свайго Івана Іванавіча, цыркавога гусака, што так і не дажыў да вясны, не пахадзіў па сонейку, па траўцы. Нібы казачны маг-чараўнік, ён ціхенька прывёў мяне ў тую канюшню, дзе возчык Іона дзеліць няўцешную тугу з худой, таксама ўшчэнт падбітай памочніцай...

Цяжка ўстрымацца і не выпісаць яшчэ адзін абзац, які, як і ўсё чэхаўскае, не сцёрся і не сатрэцца ад бойкага абароту.

«Так вось, брат кабылачка... Няма Кузьмы Іоныча... Не захацеў з намі жыць... Узяў і памёр дарэмна... Цяперака, скажам, у цябе жарабятка, і ты гэтаму жарабятку родная маці... І раптам, скажам, гэтае самае жарабятка памерла... Хіба ж не шкада?»

«Взял и помер зря...» У перакладзе гэта не гучыць так поўна і абаяльна. Гэтаму «зря» — няма цаны!

Не ацаніць яго, не ахапіць за раз, не нацешыцца ім — тым чароўным светам пачуццяў дружбы з жывымі істотамі, якія адкрыўся мне ў творчасці Чэхава, пачынаючы іменна ад таго няўдалага шчанюка, што так па-новаму забрахаў у аснежаным лесе, каля воўчай бярлогі, над якой пераляталі час ад часу смарагдовыя ў сакавіцкім сонцы пеўні-цецерукі...

Ванька Жукаў...

Калі я быў яго аднагодкам — пасвіў каровы. Увосені, пасля атавы, мы ганялі іх па-тагачаснаму вельмі далёка: на сенажаці, пад самы лес, кіламетраў за пяць ад дому. На прыволлі заліўных лугоў цячэ ціхая, паўнаводная Вуша, што паблізу ўпа-

дае ў Нёман — недзе вунь там, на даляглядзе, дзе таксама сінее лес, што называецца Налібоцкай пушчай. Над Вушай у гэты час збіраліся статкі з шасці навакольных вёсак. Пастухі часта біліся, ішлі вайной вёска на вёску. Наша вёска лёгка пабівала дзве суседнія, Чыжыноўцы і Маласельцы, бо былі яны невялікія, не маглі выставіць больш-менш прыстойныя арміі, а аб'яднацца так і не здагадаліся. На роўных сілах былі мы з вёскамі Трошчыцы і Пясочная. Затое пабойваліся Скорыч. Бывала так, што, правёўшы адпаведную дыпламатычную работу, мы аб'ядноўваліся з песачлянамі і хмарай ішлі на скарычан, у той бок, дзе былі Нёман і Налібокі.

Цяпер, выступаючы ў ролі летапісца тых падзей, я бяру на сябе, шчыра кажучы, мнагавата. Мы аб'ядналіся, мы пайшлі... А сам хадзіў я тады толькі ў абозе: разам з іншымі жэўжыкамі падносіў каптаны і торбы старэйшых.

Не памятаю дакладна, як гэта здарылася, але ў тую восень было ў нас і перамір'е са Скорычамі, нават даволі доўгае. Іхні статак даходзіў, пасучыся, да нашага, і каровы з абедзвюх вёсак мірна абгрызалі няскошаныя надрэчныя ўзмежкі. А пастухі раскладвалі вогнішчы, гулялі ў самароб-

ныя карты, курылі цыгаркі з махоркі, пераважна крадзенай у бацькоў і для эканоміі прыпраўленай сухім вішнёвым лістам, вудзілі рыбу. З моста, што крута горбіўся над бродам. І займаліся гэтым пераважна «абознікі».

Аднойчы я быў сярод іх героем дня. Апроч пячкурыкаў, што лёгка лезлі ў бутэльку ад малака, нейкім цудам злавіў і я — ды з моста, у такой неспакойнай кампаніі — самую сапраўдную плотку!.. Слоў не хапала, каб выказаць радасць. Ды ўсё ж галоўнае — не ў плотцы.

Дзякуючы ёй, гэтай срабрыстай дуроніцы з чырвонымі вачыма і плаўнікамі, якая да вечара на трэску высахла ў пастушынай кішэні, я пасябраваў з адным датуль незнаёмым скорыцкім хлапчуком. Ён быў таксама «абознік», маіх гадоў, але замарана маленькі, вельмі бедна апрануты, нават без вудачкі, хоць для снасці гэтай намі купляўся толькі зазубень, кручок, цана якога вагалася тады ад аднаго да двух курыных яек. Хлопчык быў сірата, бязбацькавіч,— такіх мы бязлітасна звалі байстручкамі,— пасвіў чужыя каровы. Не памятаю, як яна пачыналася, наша дружба, што і пра што мы гаварылі. Нават імя яго згубілася назаўсёды, аднак у памяці моцна

і ярка заселі тры акалічнасці: хлопчык усё дрыжаў ад холаду, мяне чамусьці клікаў «Вана», а плотку называў «плёткай», і трэцяе, найбольш істотнае — увечары, калі я дома расказваў пра яго, узяў ды раптам разрумзаўся. За гэта мяне высмеялі, але маці назаўтра палажыла мне ў торбачку больш, чым заўсёды, нават не намякнуўшы, навошта.

Потым зноў былі бітвы са скарычанамі, а тады — зіма, калі мы хадзілі ў розныя школы, вясна і лета, калі мы пасвілі паблізу ад родных вёсак. Наступнай восенню не спатыкаліся, а выраслі — не пазналі адзін аднаго... Словам, ад гэтай кароткай дружбы застаўся толькі ўспамін.

Плотка, якую я злавіў з моста,— першая ў маім жыцці «вялікая рыбіна», але радасць, якую я з-за яе перажыў, была мне ўжо знаёма па адной з прачытаных да таго часу кніг: «Дзіцячыя гады Багрова-ўнука».

А радасць дружбы, якую я адчуў тады ўпершыню так моцна, не ведала раўназначнага рэха ў любімых кнігах датуль, пакуль я, праз цэлых шэсць год пазней, не прачытаў апавядання «Ванька».

Праўда, я ўжо тады, у тым жа трыццаць другім годзе, адчуў на сабе першы і вельмі

моцны ўплыў Льва Талстога з яго мастацкай і немастацкай пропаведдзю любві да брата-чалавека. Аднак у Чэхава было нешта якасна іншае — у яго была не проста любоў, без разбору: я палюбіў не якоганебудзь шаўца Аляхіна, што біў свайго маленькага вучня, і не шаўцову жонку, што «ўзяла селядца і ягонай мордай пачала мне ў рыла тыцкаць», а іменна і толькі Ваньку Жукава. Ён, дарэчы, вельмі ярка нагадваў мне тады, пры першым чытанні, і нагадвае дагэтуль таго «абозніка» — пастушка, а пачуццё любві да пакрыўджанага, прыгнечанага чалавека,— такое па-чэхаўску чыстае, без найменшага адцення фальшу пачуццё,— якое я так моцна перажыў над старонкамі гэтай навелы, шчасліва і непарыўна знітавана для мяне з тым здаровым і непасрэдным, высока чалавечым успрыняццем свету, з якім мы ўступаем у жыццё.

Чэхаву я абавязаны вельмі многім, але тут прыгадаю адно.

Антон Паўлавіч першы з найбольш любімых пісьменнікаў унёс папраўку ў маё юнацкае безагаворачнае захапленне Талстым — не толькі непараўнальным мастаком, але і філосафам. Праўда, папраўкі такія ўносіла перш за ўсё само жыццё з пан-

скім прыгнётам і народным рэвалюцыйным адпорам, сама заходнебеларуская рэчаіснасць, у якой я жыў і шукаў сваю сцежку. А вось першай чэхаўскай папраўкай быў іменна «Ванька». Пазней, улетку трыццаць восьмага года, калі ў мае рукі ўпершыню трапілі «Дуэль», «Маё жыццё», «Печанег» і іншыя творы так званага другога перыяду чэхаўскай творчасці, пераацэнка вартасцей пайшла ў патрэбным кірунку значна хутчэй. Чэхаў, вядома, не замяніў мне Талстога, а толькі цудоўна дапоўніў яго, дапамог палюбіць той ачышчанай, сталай любоўю, якая і мне, як паветра і сонца, патрэбна для жыцця і барацьбы.

Не памятаю, дзе ён, Чэхаў, гаварыў, што любоў да чалавека трэба насіць не толькі ў сэрцы, але і ў галаве.

Не ведаю... лепш будзе сказаць — не думаў ніколі над тым, скрозь сэрца ці скрозь розум прапушчана яго любоў, скажам, да Ліпы з мёртвым сыночкам на руках, калі яна ідзе пад зорным вясновым небам... Аднак такога глыбокага, чыстага, невымоўна паэтычнага выяўлення любві да простага, пакрыўджанага чалавека няма, здаецца, ні ў аднаго з пісьменнікаў.

Упершыню я адчуў гэта ў невялікім апавяданні пра долю шавецкага вучня.

...«Чэхаў — непараўнальны мастак... Іменна так: непараўнальны... Мастак жыцця.

Ён — адзін з тых нямногіх пісьменнікаў, якіх можна многа, многа разоў перачытваць,— я гэта ведаю з уласнага вопыту».

Следам за Львом Талстым так гаварылі, гавораць і будуць гаварыць мільёны ўдзячных чэхаўскіх чытачоў.

Успамінаю міжвольна знаёмага — даволі развязнага і пуставатага, як мне часта здавалася, чалавека. Куды там яму да ціхай, сардэчнай радасці, якую дае нам добрая песня!.. А ён аднойчы за сталом, нібы стаміўшыся ад свае пашлаватай балбатні, папрасіў: «Заспявайма». І, спяваючы, стаў зусім іншы, нават неяк па-людску прыгожы. Вярнуўся чалавек да самога сябе, атросся ад наноснага, нібы памыўся ды пачысціўся дзеля вялікага свята.

За гэтым — у цеснай сувязі — другі ўспамін, другі вобраз. Друг мой прыехаў рэдкім і чаканым госцем ажно з Урала. Ён хадзіў са мной па ўсіх тэатрах і музеях, аглядаў новы горад, быў задаволены, шчыра здзіўляўся. А потым гэты не літаратар, а інжынер, закаханы ў сваю энергетыку рабацяга, сказаў:

«Давай, брат, сёння нікуды не пойдзем, а сядзем ды пачытаем Чэхава».

І мы чыталі, удвух, пры настольнай лямпе, у вельмі ж нейкім утульным паўзмроку пустога пакоя. Узялі з паліцы першы, які трапіў пад руку, том, зачапіліся за першае апавяданне... І як жа нам было добра! Як ён пахарашэў, раскрыўся для мяне яшчэ адным кутком свае душы, мой малады далёкі друг!..

Чэхава нельга начытацца.

Я, напрыклад, чытаю-перачытваю яго вось ужо хутка трыццаць год. Тэрмін, здаецца, зусім дастатковы для самай грунтоўнай праверкі пачуццяў.

Спачатку, у давераснёўскіх умовах, пошукі ягоных кніг часта нагадвалі нялёгкі хлеб следапыта. Тройчы ўздымалася хваля вялікай удачы: у трыццаць другім годзе, на пачатку знаёмства, у трыццаць восьмым, пра што я ўжо таксама гаварыў, і трэці раз, у дні вайны, калі я ўпершыню сустрэўся з цудоўнымі пісьмамі Чэхава — брату Сашу і Горкаму.

Старажылы Мінска, сябры кнігі, памятаюць, як увосені сорак чацвёртага года на жудасных руінах вызваленага горада-партызана з'явіўся першы вішнёвы томік поўнага падпіснога збору твораў Чэхава — яшчэ адно прыгожае сведчанне нашай непераможнасці.

Вось тады я наіўна падумаў, што прачытаю, нарэшце, Антона Паўлавіча ўсяго...

На працягу васьмі наступных гадоў былі прачытаны, па часу іх выхаду, усе дваццаць тамоў. А яшчэ праз два гады я меў гонар рыхтаваць да выдання «Выбраныя творы» Чэхава на беларускай мове.

Дзве рэчы ўразілі мяне тады, здаецца, з новай сілай.

Аповесць «У яры» — велічная карціна жыцця рускай вёскі ў эпоху станаўлення капіталізма, рэдкаснай сілы згустак, зарад высокай паэзіі — аповесць гэтая, калі я пераклаў і перапісаў яе на машынцы, заняла... толькі 49 старонак!..

І другое: рэдагуючы пераклады сяброў і двойчы на працягу паўгода чытаючы карэктуру, я канчаткова пераканаўся, што Чэхава начытацца — нельга. Ён вечна новы і новы, не разгаданы да канца.

Нельга таксама і сказаць пра яго адразу ўсё, што хацеў бы і мог бы сказаць.

Гэтым разам мне радасна было расказаць пра пачатак маёй закаханасці — з першага позірку і назаўсёды.

НА ТЫМ БАКУ ПЛАНЕТЫ

Спачатку былі два акіяны: блакітны над намі і сіні — глыбока ўнізе.

У гэтай велізарнай, блакітна-сіняй ракавіне сям-там адсвечвалі перламутрам воблакі, а над імі разразала прастору сярэбранае крыло самалёта, што злёгку пагойдвалася, нібы ад радасці за чалавекатворцу.

У падвешанай калысачцы зусім па-хатняму спаў маленькі амерыканец. Бацька ягоны — доўгі, стракаты ад жоўтых вяснушак, які ў Парыжы заходзіў у наш самалёт па-цыркавому пацешна абвешаны клункамі і малечай,— сядзіць побач з мамай, таксама светла-рыжанькай і шчуплай, як падлетак. На каленях у гэтай пары — вясёлае мноства дзяцей. З-за белых, зачахлёных спінак сядзенняў віднеліся профілі і патыліцы таямнічых лэдзі і джэнтльменаў, бязлітасна тоўстых або падкрэслена худых. Стройненькая, чарнявая сцюардэса з мі-

лым французскім какецтвам дэманстравала нам сваё веданне рускай мовы: «Чай? Кофэ? Шампан? Я люблю вас! Спасибо!..» Старая чэшская бабічка ў квяцістай вясковай хустцы спачатку снавала з заклапочаным выглядам па даўжэзным праходзе, а потым спыталася ў тых, што гаварылі па руску: «А дэ сэ ту заходзі?..»

Вышыня — толькі сем з палавінаю кіламетраў. Але і так парою весела здавалася, што мы стаім на месцы, мы сабе тут жывём, а недзе ўнізе пад намі — круціцца Зямля.

У праймах паміж хмарамі, што ішлі нібы крыгі па шырачэзнай рацэ, паказаліся сурова і халодна белыя горы Грэнландыі. Праз нейкі час на сінім дне нашай ракавіны пачалі з'яўляцца айсбергі — смарагдовыя лодкі з белымі ветразямі, што, нібы чайкі, прадвяшчалі блізкі прычал. І сапраўды — вось паказаўся шэры россып астравоў, пасля — шэра-зялёны мармур мацерыка ў бясконцых латках азёраў. Лабрадор. Спакваля, чым далей на поўдзень, часцей заўважаецца след чалавека — спачатку толькі стрэлы дарог, а потым і палі, і будыначкі паселішч.

Прыкметна ідзём на зніжэнне. Насустрач нам з зямлі люстэркамі пабліскваюць

дахі фермаў, пафарбаваныя алюмініевай пудрай. Вясёлы, ужо суцэльны вітраж рознакаляровых і розных па форме палеткаў, над якімі, цягнучы невады сваіх ценяў, паўзуць чароды белых воблакаў. Прывольна разлілася магутная рака. Паказаўся жывы, вялізны макет шчодра зялёнага, акуратна спланаванага горада.

Ніжэй, ніжэй, ніжэй... І вось яна — зямля, на якую мы ступаем з завоблачнай вышыні.

Адно з самых першых уражанняў:

Ах, як добра падумаць і пра Радзіму сваю, і пра блізкіх упершыню ў жыцці з другога боку планеты!..

Бывалыя людзі, члены нашай турысцкай групы, казалі, што Канада вельмі нагадвае Англію. Гаварылася пра гэта і ў вялікім прамыслова-партовым Манрэалі, з яго шматпавярховым, разрэкламленым цэнтрам, з яго катэджамі і зелянінай на заможных ускраінах, з яго ракою Святога Лаўрэнцыя, па якой глыбока ў кантынент заходзяць акіянскія караблі. Успаміналі нашы бывальцы пра «горды Альбіён» і ў ціхай, багатай паркамі і вадою Атаве —

горадзе банкаў, касцёлаў і дзяржаўных устаноў. Успаміналі і ў невялікім, яшчэ больш зялёным і ціхім Стратфардзе...

Аднак той самы Манрэаль вельмі выразна напамінае і пра Францыю,— мовай мноства жыхароў, мовай газет, рэклам, радыё, тэлебачання, архітэктурай. Ёсць тут нават і свой Нотр-Дам, раскошная копія парыжскага арыгінала. Наогул, і ў Манрэалі, і ў іншых мясцінах правінцыі Квебек ёсць многае, што чалавеку, які пабываў хоць у адным толькі Парыжы, настойліва напамінае Францыю.

У Таронта, калі мы аглядалі яго гандлёвы цэнтр з амаль «дарослымі» небаскробамі, гасцінныя гаспадары, жартуючы, але з прыкметнай гордасцю гаварылі: «А гэта наш Уол-стрыт, а гэта — Брадвей, а гэта...» Словам, калі ўлічыць яшчэ аўтамашыны, рэкламы амерыканскіх фірмаў, паласатыя сцягі на некаторых будынках і іншыя, хоць бы знешнія адзнакі,— і ў Таронта, і ў іншых мясцінах Канады многа чаго нагадвае ЗША.

Можна сказаць, што і англічанін, і француз, і амерыканец адчуваюць сябе тут, як дома. Асабліва, кажуць, амерыканец. Пасля другой сусветнай вайны янкі з кожным годам усё больш адчувальна ўзмацняюць

свой уплыў і на эканоміку, і на палітыку галоўнага брытанскага дамініёна...

Нейкія спецыфічна канадскія рысы жыцця, культуры, побыту заўважыць тут вельмі цяжка. Магчыма, для гэтага патрэбна не дзесяць турысцкіх дзён, а значна даўжэйшы час больш спакойнага ды грунтоўнага назірання, не тэндэнцыйна абмежаваныя паслугі мясцовых гідаў, а асабістае добрае веданне англійскай мовы. І першага, і асабліва другога мне, як і многім у нашай групе, вельмі адчувальна не хапала...

Калі гаварыць пра пейзаж паўднёва-ўсходніх раёнаў Канады, дык у правінцыі Квебек ён нагадвае нашу Гомельшчыну — яе раўніннае прыволле, лагодны, паступовы пераход да чыста ўкраінскай прыгажосці. З акна аўтобуса і на фермах, дзе мы бывалі, прыемна было любавацца пірамідальнымі таполямі, дубамі, клёнамі, алешнікам і вербамі над вадою. Толькі трохі дзічэй, чым у нас, толькі сям-там на зеляніне выступае густая кароста вечнай, ледніковай камяністасці. Замест залатой збажыны, зялёна-стракатых прастораў бульбы і кукурузы — тут, у гэтых жывёлаводчых раёнах, відаць пераважна яшчэ няспелы (у канцы ліпеня) авёс ды бясконцая цімафееўка. На адкосах дарог густа цвіце блакіт-

ны падарожнік, жоўтае купалле, сям-там дзікія ружы. Многа вады,— то азёры, то рэкі. І рэдкія фермы.

Далей на захад, у правінцыі Антарыё, асабліва на Ніягарскай паўвыспе, пейзаж амаль украінскі — сады і вінаграднікі. Зблізку мы аглядалі іх на адной украінскай ферме каля Гамільтона, дзе залацісты рыслінг і буйныя чарэшні каля белай хаты добра напомнілі нам залатое, песеннае наддняпроўе. А як сумавалі па ім нашы гасцінныя гаспадары, што ў далёкім юнацтве ўцяклі сюды, за акіян, ад суровай дарэвалюцыйнай галечы!..

Такіх тут многа, і не сказаць пра іх,— значыцца, не сказаць пра Канаду, хоць бы пра знешні яе каларыт, вельмі многага.

Апроч былых каланізатараў, якія за даўнасцю год называюцца законнымі ўладальнікамі гэтай багатай зямлі, апроч новых прэтэндэнтаў на гаспадаранне яе лёсам, ёсць у Канадзе шмат імігрантаў, у тым ліку славян.

Тры асноўныя стыхіі — англійская, французская і амерыканская — не столькі суіснуюць тут на працягу стагоддзяў, колькі змагаюцца за непадзельнае панаванне. Нягледзячы на тое, што французская мова побач з англійскай з'яўляецца тут дзяр-

жаўнай, французскі ўплыў на жыццё Канады непараўнальна слабейшы за ўплыў англійскі і амерыканскі, якія, калі браць справу ў нацыянальным, моўным аспекце, утвараюць амаль адно цэлае.

ІміграНты-славяне, каб захаваць свой нацыянальны воблік, увесь час жывуць у змаганні з англасакскім міжкантынентальным шавінізмам. Лепшая, прагрэсіўная частка іміграцыі прымае актыўны ўдзел у агульнапралетарскім змаганні за правы працоўнага чалавека, у агульнанароднай барацьбе за мір. Тут вельмі многа былых прышэльцаў з усходняй Еўропы, многа і наогул, і адносна да насельніцтва іх «новай бацькаўшчыны». Яны жывуць, працуюць там ужо блізу стагоддзе, даўно і трывала стаяць на перадавых пазіцыях, ведучы за сабою другіх, і таму, бясспрэчна, маюць права з законнай гордасцю называць і сябе будаўнікамі эканомікі Канады, гаварыць і пра свой дабратворны ўплыў на яе культуру...

Недаравальна было б не ўспомніць чалавечым словам пра народ, які ўжо не толькі даўно не лічыцца гаспадаром гэтай зямлі, але і згадваецца ў нейкім музейна-запаведніцкім плане...

Індзейцаў турыстам паказваюць тут з

сур'ёзнасцю і пашанай куды меншай, чым мы, напрыклад, паказваем белавежскіх зубраў.

У першы наш заакіянскі дзень, адразу пасля Нотр-Дам і шлюзаў на рацэ Св. Лаўрэнція, нас павезлі, як сказана было гідам, у індзейскую вёску Канавагва.

У гэтым крыкліва-экзатычным паселішчы, дзе больш за ўсё было відаць ларкоў з тамагаўкамі, вігвамчыкамі з кары, маскамі, лукамі і іншай сувенірнай дробяззю, нас урачыста сустрэў дзівосна прыбраны ў пер'е правадыр адпаведнага племені, ён жа па сумяшчальніцтву і «файерпокер», ахоўнік вогнішча, нешта накшталт шамана.

Спачатку ён вельмі ахвотна, нібы забыўшыся пра ўсю дыпламатычную значымасць моманту, і сам, і ў абдымку з некаторымі турыстамі пазіраваў перад усімі фотаапаратамі, а потым пачаў маліцца.

Падпаліў у нейкіх начоўках кару, патупаў вакол дыму, шастаючы бубнам, падобным на мандаліну, поўную гароху, пагудзеў нешта, а тады накрыў сваё вогнішча чорнай, па ідэі — бобровай шкурай. Ідучы насустрач пажаданню гіда, ён растлумачыў містэрам турыстам сэнс малітвы (за наша, вядома, здароўечка), у перамешку з англійскай мовай сказаў некалькі фраз па- іракез-

ску, а потым... потым стаўся нечаканы цуд. Свядома ці несвядома грозна-ўрачысты правадыр і ўсёмагутны шаман прараніў адно слова... па-польску: «дзенькуе»!..

Наша вясёлае меркаванне, што гэты падазрона нясклёпіста вахлакаваты Манцігома Ястрабіны Кіпець хутчэй за ўсё — адэскі ці бабруйскі сваячок Астапа Бэндара, так сказаць, пацярпела папраўку. Манцігома, калі я загаварыў з ім па-польску, развёў у зямляцкай усмешцы сваё чырвонае, выпасенае на турысцкай наіўнасці мурло і ахвотна прызнаўся, што ён — адзін з самых прамых ды законных нашчадкаў славутага кантара з Ломжы...

У гэтай пацешнай, непрыдуманай навеле пра яшчэ адну форму бізнеса ёсць свой падтэкст — і глыбокі, і сумны...

Я ўспамінаў ці, лепш сказаць, па-новаму перажываў яго ў Стратфардскім музеі, перад палотнамі Эміліі Кар, напісанымі на індзейскія матывы, з жыцця плямён, ізаляваных у рэзервацыях.

Асабліва запомніліся дзве сасны на вырубе,— старыя, самотныя сосны і надпіс, што прымушае задумацца: «Праклятыя людзьмі, але любімыя богам». Аўтарскі

жаль і горкі роздум над лёсам відаць быў і ў стылізаваным пад народную разьбу вобразе маці-індзіянкі, што ратуе ў сваіх — якіх жа бездапаможных! — абдымках дзіця, сімвал народнага мастацтва, асуджанага на пагібель...

Хто яго ведае,— ці ратуючы гэтае мастацтва, ці проста, як той Манцігома, толькі што з большым культурным шыкам, робячы на ім фестывальны бізнес,— тут жа, пад дахам музея, працаваў нейкі другі мастак. Здаравенны, таленавіты джэнтльмен у беленькай нейлонавай кашулі і «пад бабачкай», ён з-за вуха, з поўнай абыякавасцю да прысутных, лупіў спецыфічнай сякерай па здаравеннай калодзе канадскага дуба, высякаючы «тотам» — бажышча.

Паблізу ад гэтага джэнтльмена працавала не менш шыкарная лэдзі — вырэзвала з дрэва маскі, без слоў і жэстаў, а толькі стусікамі візітных картачак ці то адказваючы на магчымыя пытанні зацікаўленых, ці то зусім па-дзелавому прапануючы ім свае паслугі.

Сімпатычная работніца музея з важнай аб'ектыўнасцю не зусім яшчэ дарослай міс тлумачыла турыстам, што лэдзі мастач-

ка — індзіянка па бабулі ці нават як быццам па маме...

Больш індзейцаў нам не давялося ўбачыць.

Зрэшты, поўдзень правінцыяў Квебек і Антарыё, у якіх мы былі, — гэта толькі маленькая частка Канады. Тут, у найгусцей заселеных і найбольш культурных раёнах краіны, індзейцы, як нам вядома было, жывуць у асобых паселішчах, куды, як з галантным жалем паведаміў містэр гід, турыстаў звычайна не возяць...

Яшчэ ў маленстве, ад самога Марка Твэна мы чулі, што ў землякоў яго быў звычай называць свае новыя гарады імёнамі гарадоў еўрапейскіх.

А ўсё ж, і ведаючы гэта, прыемна было з Таронта за нейкіх пару дзесяткаў мінут прыляцець у Лондан, а з Лондана, аўтобусам, таксама менш чым за гадзіну, прыехаць у Стратфард...

Гэта — дваццацітысячны гарадок з тэкстыльнай, мэблевай і харчовай прамысловасцю, з невысокімі дамамі і ўтульнымі катэджамі ў шчодрай зеляніне, з раскошна ідылічнымі сажалкамі, каля берагоў якіх белыя і чарнашыія лебедзі злосна шчы-

каюць турыстаў за надакучлівыя фотаапараты. Атмасфера тут настолькі ўжо англійская, што і гасцініца, у якой мы размяшчаліся, называецца «Віндзор», і ў вестыбюлі яе, на самым алтарным месцы, дыміць цыгарай за шклом бравы сэр Уінстон Чэрчыль.

Але Стратфард, канадскі Стратфард, славен не гэтым. Пачынаючы з пяцьдзесят трэцяга года, тут кожнае лета, з канца чэрвеня да палавіны верасня, адбываюцца шэкспіраўскія фестывалі, слава якіх пераступіла ўжо цераз абодва акіяны.

Душой гэтай справы быў і застаецца прагрэсіўны канадзец англійскага паходжання, вялікі энтузіяст Шэкспіра і шчыры друг нашай краіны Том Патэрсан — журналіст і грамадскі дзеяч. Іменна ён, з групай сваіх калег, работнікаў мастацтва, прымаў нас у гэтым арыгінальным тэатры з гасціннасцю сапраўды сяброўскай.

Першыя чатыры сезоны фестываль праходзіў у часовым памяшканні, пад брызентавым дахам, і тэатр у той час насіў імя «тэатра пад тэнтам». Але гэта былі не першыя і не найбольшыя цяжкасці...

У пачатку пяцьдзесят другога года група стратфардскіх шэкспіраўцаў сабрала 125 долараў і, узброіўшыся ўсім гэтым

тэатральным фондам, Том Патэрсан паехаў у Нью-Йорк — на пошукі «зорак», якія згадзіліся б паслужыць высакароднай справе. Вярнуўся з пустымі рукамі. Тады сябры звярнуліся ў Лондан (у той, заакіянскі), да славутага тэатральнага дзеяча Тайрана Гатрые. «Неверагодная мара», як называлі многія ўсю гэтую задуму, пачала нечакана здзяйсняцца. Гатрые загарэўся ідэяй стварэння новага шэкспіраўскага тэатра, згадзіўся стаць яго галоўным рэжысёрам, ад яго і Патэрсана спакваля пачалі загарацца іншыя — і ў Англіі, і тут, у Канадзе. Знайшліся празорлівыя ўкладчыкі і сапраўдныя работнікі мастацтва, і ўжо ўлетку наступнага года ў старым стратфардскім парку, растрывожыўшы лебядзіную ціш, заігралі традыцыйныя трубы, абвяшчаючы пачатак першага спектакля.

Новы гмах тэатра пабудаваны ў пяцьдзесят шостым годзе.

Здорава ён выглядае — заліты сонцам, лёгкі і светлы, на першы погляд вельмі падобны да вялікага цырка ці, яшчэ больш, да круглага павільёна на нейкай вясёлай, паўднёвай выстаўцы.

Настрой своеасаблівай радаснай устрывожанасці пачынаецца ўжо тады, калі на

балконе, які апярэзвае гмах паўкругам, з'яўляюцца фанфарысты, што старадаўнімі гукамі рэнесансавай музыкі замяняюць — і ў пачатку, і ў антрактах — сучасныя званкі.

Праз светлае прасторнае фае ты ўваходзіш у глядзельную залу. Вялікая, больш за дзве тысячы месц, яна ўзвышаецца амфітэатрам з трох бакоў. З чацвёртага боку ў гэты раскошны амфітэатр лёгкім узвышэннем з прыступкамі ўкліняецца адкрытая сцэнічная пляцоўка. Па шэкспіраўскай традыцыі — з елізавецінскімі балконамі і арыгінальна прымітыўнымі ўваходамі і выхадамі для артыстаў. Калі адны з іх выходзяць на пляцоўку ці на балкон праз дзверы, так сказаць, звычайныя, дык другія з'яўляюцца на сцэну з тунельных праходаў пад амфітэатрам і туды ж бягуць у роспачы або ў ваяўнічым запале. А трэція дык наогул вылазяць на белы свет з-пад зямлі... Так, напрыклад, група афінскіх рамеснікаў з камедыі «Сон у летнюю ноч» — усе тыя пацешныя Пігвы, Мілягі, Дудкі і Рылы павылазілі адзін за адным, нібы з хатняга паграбка, прыпадняўшы века патайнога ўваходу на самым цэнтры пляцоўкі, параіліся наконт самадзейнага спектакля, размеркавалі ролі і зноў палез-

лі ў сваё падполле, па-гаспадарску зачыніўшы над сабою дзверы.

І самае цікавае — усе гэтыя далёкія сярэдневяковыя ўмоўнасці не здаюцца тут дзіўнымі,— так уражае, так, можна сказаць, зачароўвае непаўторны каларыт эпохі, то суровае, то паэтычна-вясёлае асяроддзе, куды вас адразу ўводзяць і выдатнае афармленне і таленавітая ігра.

Дарэчы, спектаклі пачынаюцца заўсёды... стрэлам за сцэнай, ад якога ўсе — хоць бы і пяты ці дзесяты раз — нечакана весела разгамоньваюцца. На нейкі момант — таму, што тут жа трэба ўставаць і ва ўрачыстым маўчанні праслухаць велікабрытанскі гімн.

І яшчэ раз дарэчы,— стратфардскі тэатр з'яўляецца, на думку знаўцаў, узорам вельмі ўдалага спалучэння шэкспіраўскіх традыцый з сучасным тэхнічным абсталяваннем. Аб гэтым сведчаць і дасканалая акустыка, і багата абсталяваныя майстэрні, і зручныя артыстычныя прыбіральні, і ўтульны кафетэрый.

Мы паглядзелі ўвесь рэпертуар сезона: «Сон у летнюю ноч», «Караля Джона» і «Рамэа і Джульету».

Не ведаючы мовы, вельмі цяжка захапляцца, асабліва тымі п'есамі, якія ты даў-

навата чытаў або, калі прызнацца шчыра, і не чытаў зусім. Прападае, не даходзіць да цябе ўся раскошная сіла шэкспіраўскага слова — і звонкае яго гучанне, і багаты гумар, і водар падтэксту. Сядзіш, злуешся то на сябе, за невуцтва, то на лёс, што не заўсёды табе спрыяў, то на самога Шэкспіра, што мала і ў ягоных п'есах дзеяння: выйдуць людзі ці выбегуць, пастануць у позы і толькі бясконца гавораць штосьці — то па аднаму, то па двух, то гуртам...

Так было ў мяне з «Каралём Джонам», якога я перад тым і не чытаў, і не бачыў на сцэне. Так было, пакуль не дайшло да першай сцэны чацвёртага акта, дзе суровы Х'юбарт, выконваючы каралеўскі загад, не змог асляпіць юнака Артура. Высокі драматызм і чалавечнасць тэксту ў спалучэнні з таленавітай акцёрскай падачай зрабілі сваё,— разам з усёй канадска-амерыканскай аўдыторыяй і я ад душы біў брава і чарадзею аўтару, і сімпатычнаму падлетку Гэйварду Марзе — Артуру.

Трохі лягчэй было без мовы са шматфарбнай, дасціпнай камедыяй пра дзівосы адной летняй ночы. А ў яшчэ лепш вядомай, шмат разоў бачанай, найжурботнейшай у свеце аповесці пра каханне пачалі нават заўважацца недахопы ігры. І амеры-

канка Герыс у ролі Джульеты, і італьянец Джэрусі — Рамэа ігралі без асаблівага бляску. Ён быў проста цьмяны і вялаваты, а яна, замест пяшчотнай абаяльнасці, дэманстравала даволі развязную настойлівасць з нейкім надрыўным крыкам... Нельга сказаць, што мне было вельмі прыемна заўважаць плямы на фестывальных «зорах», але ж не варта замоўчваць і таго харошага, патрыятычнага пачуцця, з якім тады падумалася пра нашых айчынных Джульет і Рамэа.

Аднак не лішнім будзе яшчэ раз і з прыемнасцю падкрэсліць, што наогул ігру акцёраў ва ўсіх трох спектаклях можна без перабольшання назваць і добрай і выдатнай.

Яшчэ больш прыемна было, калі ўсе гэтыя шэкспіраўскія дамы, рыцары і каралі, рамеснікі, эльфы і феі сышлі з падмосткаў і балконаў свайго сярэдневякоўя і сталі — на творчай сустрэчы з намі, а потым на хатніх прыёмах — проста цікавымі і мілымі людзьмі.

На творчую сустрэчу з намі ў рэпетыцыйнай зале тэатра, апроч драматычных акцёраў, сабраліся музыканты фестывальнага аркестра і артысты аперэты.

Трэба сказаць, што стратфардскія фес-

тывалі не абмяжоўваюцца толькі шэкспіраўскімі спектаклямі. Так, сёлета, апроч пастаноўкі трох вышэйназваных п'ес, у фестывальны комплекс уваходзілі спектаклі аперэты, фестываль кінафільмаў, сімфанічныя канцэрты з удзелам Леапольда Стакоўскага, семінар шэкспіразнаўцаў і міжнародная канферэнцыя кампазітараў.

Сустрэчай нашай кіраваў цяперашні мастацкі дырэктар фестывалю, адзін з самых таленавітых канадскіх рэжысёраў Майкл Ленгхам. З прыемнай прастатой і шчырасцю ён расказаў, як цёпла яго сустракалі нядаўна на нашай савецкай зямлі, пазнаёміў нас коратка з гісторыяй фестывалю і яго перспектыўнымі планамі. Пасля на невялічкую эстраду ўзышоў любімец публікі, малады барадаты прыгажун, аўстраліец Гары Мосфільд, барытон. Адзін і з залам бліскуча і іскрыста весела ён выканаў некалькі новазеландскіх і канадскіх народных песень. Прыйшла чарга да гасцей. Калі раней, са словам у адказ дырэктару, цікава выступіў адзін з нашых вядомых вучоных, чалавек абаяльна культурны і сціплы, дык мастацкія магчымасці групы прадставіла эстрадная от сабе балерынка, жанчына больш пажы-

лая, чым энергічная. Як на нашу савецкую шчодрасць, атрымалася да няёмкасці скупа... Сімпатычны Майкл зноў узышоў на эстраду і, з той самай сваёй непасрэднасцю, нават з рукамі ў кішэнях штаноў, расказаў, што ён, салдат другой сусветнай вайны, пакутаваў разам з рускімі ў канцэнтрацыйным лагеры, што ён быў і застаецца пад абаяннем гэтых сапраўдных людзей — верных сваім высакародным ідэалам, мужных, простых і таленавітых. Пабываўшы ў СССР, ён яшчэ раз пераканаўся ў гэтым, і ён, адкрыта кажучы, не можа сабе ўявіць, каб савецкія людзі ды не маглі заспяваць... Абяззброеныя такім уступам, мы пачалі самадзейнічаць. Поспеху, праўда, было не вельмі каб шмат, але ж атмасфера стала яшчэ больш цёплай і непасрэднай.

У доме Майкла Ленгхама нас прымала яго вясёлая гаспадынька, артыстка Гелен Бернс, якую мы перад гэтым бачылі ў ролі энергічнай афінскай прыгажуні Герміі. А ў віхрастым Хрыстоферы, які на пару са сваім сябруком дапамагаў маці разносіць у шумным натоўпе гасцей бакалы і бутэрброды, госці-турысты весела пазналі яшчэ адну фестывальную «зорку» — хлоп-

чына на мыліцы каля анжэрскай сцяны ў адной з масавых сцэн «Караля Джона».

У сям'і прэзідэнта фестывальнага савета старая, сівая лэдзі, падобна да ўсіх у свеце добрых, ціхенькіх бабуль, з мілай, хатняй усмешкай расказала нам, што другі яе сын — недзе ў нас, «у Саўет Раша», дзе яго, яна верыць, прымаюць таксама палюдску...

Праз некалькі дзён, калі мы згодна з планам павінны былі накіравацца з Канады ў ЗША, у Таронта да нас прыехаў адзін з шэкспіраўцаў, які прывёз нам прывітанне са Стратфарда, «у дагон», і мілы «звышпланавы» падарунак,— на мясцовай кінастудыі нам паказалі два кінафільмы: «Чалавек з вінтоўкай на плячы», нямую, вельмі дасціпную карціну ранняга Чапліна, і сатырычную камедыю геніяльнага Чарлі «Кароль у Нью-Йорку».

Палерма як горад я амаль не запомніў. За гэтай назвай перад вачыма памяці стаіць пакрытая маладымі дрэвамі зялёная раўніна на паўночным беразе агромністага возера Антарыё і велічная, родная постаць Кабзара, што задуменна глядзіць

на сонечнае серабро і золата лагодных хваль, за жывым бязмежжам якіх яму бачыцца Дняпро і прасторы духмяных стэпаў.

Шаўчэнкаўскі запаведнік Палерма.

1 ліпеня 1951 года тут быў пастаўлены першы на амерыканскім кантыненце помнік геніяльнаму песняру Украіны, падарунак прагрэсіўнай украінскай іміграцыі ад Маці — Савецкай Радзімы.

Больш правільна будзе назваць гэты помнік падарункам для ўкраінцаў, беларусаў і рускіх — для ўсіх, чыё сэрца і на далёкай чужыне б'ецца сыноўняй любоўю да родных народаў, да краіны бацькоў, што стала радзімай сапраўднага чалавечага шчасця.

І гэтым яшчэ не будзе сказана ўсё...

Штогоду ў дзень адкрыцця помніка тут адбываюцца мнагалюдныя шаўчэнкаўскія мітынгі,— патрыятычна ўрачыстыя і паўкраінску звонка вясёлыя.

У тую нядзелю, калі мы прыехалі ў запаведнік, тут адбыўся так званы акруговы пікнік таронцкіх украінцаў, а фактычна — мітынг дружбы, на які сабралася тысячы тры народу.

На зялёнай паляне і ў засені дрэў, каля

ўласных машын, сямейнымі ды зямляцкімі групамі размясціліся яны навокал — рабочыя, фермеры, інтэлігенцыя з блізкіх і не вельмі блізкіх ваколіц. Бліжэй да радыёфікаванай эстрады, на якой ужо выступаў прамоўца, стракаты натоўп быў значна гусцейшы. На пікніку, як мы пераканаліся даволі хутка, былі не толькі ўкраінцы, беларусы і рускія, але і іншыя прадстаўнікі прагрэсіўнай часткі славянскай іміграцыі — палякі, балгары, славакі, сербы, македонцы...

Было тут таксама нямала і прагрэсіўных канадцаў. Пад вечар, выступаючы на ўрачыстым сяброўскім абедзе, вядомы канадскі пісьменнік Д. Картар пранікнёна сказаў пра значэнне і гэтага запаведніка, як месца падобных сустрэч, і самога Шаўчэнкі, як цудоўнага сімвала рэвалюцыйнай дружбы для ўсіх людзей добрай волі, якія хочуць разам адстайваць мір і будаваць шчаслівае жыццё.

— Дзве назвы — Стратфард і Палерма, два імёны — Шэкспір і Шаўчэнка,— як гэта цудоўна гучыць, дарагія сябры, як добра верыць, што такія сустрэчы, як сёння,— толькі пачатак нашай вялікай, магутнай дружбы!..

Так гаварыў ён, аўтар і ў СССР вядомых раманаў «Будучыня за нас» і «Сыны без бацькоў», цяжкахворы калека, моцны, прыгожы духам чалавек. Так гаварыў, разумна і весела, уздымаючы ў натоўпе ўсплёскі маладога смеху, сусветна вядомы змагар за мір Д. Эндзікот. Так гаварылі іншыя іх суайчыннікі — паэт У. Макдональд, старшыня прафсаюза электрыкаў Канады К. Джэксан, вядомы ўкраінскі культурны дзеяч, літаратуразнаўца і выдатны перакладчык Шаўчэнкі на англійскую мову Джон Вір (Іван Вявюрскі)... Так гаварылі савецкія госці — маскоўскі хірург Т. Бялова, армянскі эканаміст М. Шахбазян, беларускі паэт П. Панчанка...

Так гаварылі мы, кожны па-свойму, на розных мовах і ўсе — пра адно.

Гэта непераможнае адно гучэла ў душы невымоўна светлай і велічнай музыкай на працягу таго незабыўнага дня.

Пад помнік Кабзара паложана зямля з гары Чарнечай. А побач з музеем яго імя, адкрытым на год пазней, схіліліся тры славутыя вярбы, галінкамі прывезеныя сюды з-пад дняпроўскай хвалі. Колькі пяшчотнай любві, паэтычнага пачуцця, нязмернай адданасці свайму роднаму ба-

чыцца тут на кожным кроку!.. Моўчкі, усхвалявана ходзіш па залах невялікага музея. І ён арганізаваны тут, у канадскім Палерма, пры братняй дапамозе савецкага Кіева. Па экспанатах успамінаю кіеўскі і Канеўскі музеі. А вось і непаўторна сваё, мясцовае. Пад шклом — драўляная ступа, гэблік, рыдлёўка, рэшата, піла, сякера... Прылады працы, з якімі сюды, яшчэ на схіле мінулага стагоддзя, дабіраліся з-за акіяна «людзі ў кажухах»... Так пагардліва называлі бязмоўных і безабаронных шукальнікаў хлеба махляры і крывасмокі, што прывозілі іх сюды на палубах і ў трумах грузавых параходаў, а потым былі панамі іх працы і жыцця на новай, таксама як і старая, няшчодрай на ласку зямлі... А вось вялікі разгорнуты альбом з мноствам подпісаў. Гэта — памятная кніга мужных і светлагаловых сыноў імігранцкай кажушнай галечы, гэта подпісы тых украінскіх, рускіх і беларускіх хлапцоў, што выязджалі адгэтуль, з Канады, на дапамогу іспанскім рэспубліканцам. Больш за тысячу іх змагалася ў батальёне імя Мекензі — Папіна (правадыроў канадскага паўстання ў 1837 годзе), у амерыканскіх батальёнах імя Лінкольна і Вашынгтона, у Балканскім батальёне імя Дзіміт-

рава, а найбольш — у XIII інтэрнацыянальнай брыгадзе імя Дамброўскага, дзе была Шаўчэнкаўская сотня. З пашанай і захапленнем думаецца тут і пра тых, што са славай хадзілі на Франка, адкуль многія не вярнуліся, і пра тых, што ў дні другой сусветнай вайны самаахвярна, ад працы рук сваіх, дапамагалі роднаму савецкаму народу...

Усплываюць на памяць словы з адной канадскай газетнай нататкі: «Даклад яго, расказ пра тое, што ён бачыў сваімі вачыма і чуў сваімі вушамі ў дарагіх нашаму сэрцу мясцінах, даў нам магчымасць услухацца ў біенне сэрца сваёй Маці і паглядзець у яе светлыя, бясстрашныя вочы».

У гэтай сувязі з прыемнасцю ўспамінаю моцных духам і па-братняму шчырых сяброў — беларусаў, украінцаў, рускіх... У далёкім мінулым — сыны вясковай і гарадской беднаты, за дзесяткі гадоў самаадданай барацьбы некаторыя з іх сталі тут сапраўднымі гвардзейцамі прагрэсіўнага руху, выдатнымі грамадскімі дзеячамі і вядомымі журналістамі. З імі мы мелі прыемнасць знаёміцца ў Рускім Народным Доме і ў рэдакцыі «Вестника», у рэдакцыі «Украинського життя» і ў шаўчэнкаўскім запаведніку, у кніжным магазіне

«Тройка», у рускай пачатковай школе і ў гасцінных катэджах рабочых ускраін Таронта, дзе мы так многа, шчыра гаварылі, смяяліся, спявалі родныя песні...

Колькі сілы бывае ў насычанай глыбокай праўдай прастаце і колькі прыгажосці ў сарамлівай усмешцы, у няўмелай і грубаватай часамі ласцы чалавека з мазольнымі, непаслухмянымі пальцамі!..

Стары рабочы, што пры цары яшчэ прыехаў сюды з Палесся, тамадзіў за адным сталом. Сумленна стомлены з выгляду чалавек, ён не званіў па графіне, не надзяляў прысутных правам на тост, а толькі ціха запрашаў, з харошай бацькоўскай усмешкай:

— Ешце, хлопцы, і піце... Ну, на здароўе, калі так. Дык давайце хоць пасядзім тут разам ды паглядзім адзін на аднаго...

Калі мы неслі кветкі да помніка вялікаму Тарасу, на дарожцы парка нас затрымаў старэнькі дзядзька-садоўнік, хоць у канадскім касцюме, але з запарожскімі вусамі, прывітаўся і пачаў уласнаручна прышпільваць да нашых грудзей па ружы. Хораша гэта: пяшчотная кветка,— чырвоная, белая, жоўтая,— агеньчык шчасця ў карэлых ад працы руках старога, роднага чалавека!..

А як прыемна, што ружы з нашага поля не вянуць і на чужой, далёкай зямлі!

Работніца Наталка з дымнага антарыйскага Гамільтона, чарнявая маладзіца ў гуцульскім уборы, выйшла ў круг, прывычнай рукой паправіла мікрафон і, як зара, прыгожа і проста ўсміхнулася:

— Дарагія савецкія госці і ўся наша мясцовая, так сказаць, рэгулярная публіка! Пачынаем канцэрт...

Далейшыя яе словы патанулі ў дружным рогаце больш шасцісот чалавек, што яшчэ ўсё сядзелі за бяседнымі сталамі або ўжо стаялі густым натоўпам на вызваленай ад сталоў і крэслаў частцы вялікага павільёна. Спадабалася ўсім і гэта спрытна-нечаканае «рэгулярная публіка», а яшчэ на дадатак і тое, што з чародкі дзяцей раптам выскачыла маленькая, светлавалосая дзяўчынка і, падбегшы да мамыканферансье, аберуч учапілася за яе ўзорыстую спадніцу. Малую ўгаварылі, пагладзілі і адвялі. Мама Наталка пачала аб'яўляць праграму.

Яна — не толькі канферансье. Бойкае слова і звонкі голас — душа вядомага на ўсю славянскую Канаду трыё «Верхавіна». Абапал Наталкі стаяць дзве Марыі — старэйшая, салідная, і «маладэсэнька та

гарнэсэнька» Марыйка з чорнымі, глыбокімі вачыма.

Як хораша, як па-новаму гучаць тут і дасціпныя каламыйкі, і «Падмаскоўныя вечары»!..

Яшчэ раз па-зямляцку стала шкада, што няма тут сёння Алеся і Алёнкі Цехановічаў, з якімі мы пазнаёміліся напярэдадні, у гасцях. Ён — адзін з лепшых канадскіх тэнараў, закаханы ў Казлоўскага, яна — таксама спявачка і маці маленькага Сашкі. Абаіх сюды прывезлі дзецьмі перад самым вызваленнем Пружаншчыны, і абоім так хочацца на радзіму...

Шкада таксама, што распушчаны на лета хор таронцкага Народнага Дома. Кіраўнік яго, сціплая, з добрай усмешкай дзяўчына, вельмі, кажа, ахвотна пачаставала б нас і «Рэчанькай», і партызанскімі сёстрамі — соснамі...

Што ж, пасля «Верхавіны», па прапанове ўсё той жа Наталкі, мы ўсёй сваёй шматсоценнай самадзейнай стыхіяй спяваем «Рэве та стогне...» Як стэп, раздольна і, як гімн, урачыста гучыць яна тут, дзе за вокнамі зорнае неба над хвалямі возера, экзатычная назва якога хвалююча звінела нам — Антарыё! — яшчэ ў індзейскіх, купераўскіх снах маленства.

На гэтым хочацца і закончыць.

Праўда, пасля дзесяці канадскіх дзён, падчас якіх мы былі фактычна дэлегатамі, пасланцамі дружбы ад таварыства СССР — Канада, было ў нас яшчэ сем дзён турысцкіх — у ЗША.

Аднак паспешлівае азнаямленне з фордаўскім заводам у Рывер Руж, трыма рознымі выстаўкамі — аўтамабільнай, тэхнічнай і гандлёвай, трыма карціннымі галерэямі, дзе ўсё найлепшае прывезена з Еўропы, і трыма такімі гарадамі, як Чыкага, Вашынгтон і Нью-Йорк,— азнаямленне вельмі павярхоўнае, без сустрэч і гутарак з людзьмі, не дае мне ні магчымасці, ні права рабіць пэўныя, больш-менш цікавыя і патрэбныя абагульненні.

У апошнюю нашу амерыканскую ноч, калі мы падняліся на сто другі паверх славутага «Эмпайр стэйт білдынга» і ўбачылі ва ўсе бакі бясконца вялікі, фантастычна расквечаны стройнымі і мітуслівымі агнямі Нью-Йорк, адна з нашых спадарожніц сказала:

— Пасля Ніягары, таварышы, гэта — найбольшае ўражанне з ЗША.

Ніягарскімі вадаспадамі мы пачалі падарожжа па захадзе штатаў. І відовішча гэта было сапраўды незабыўнае. Асаб-

ліва, калі мы, па-маладому рагочучы, пераапрануліся ў спецыяльную, непрамакальную вопратку, ліфтам спусціліся пад высачэзны абрыў, з якога зусім побач з нашымі коўзкімі падмосткамі ў бездань абрынаўся шалёна вясёлы і грозны каскад пранізанай сонцам вады.

Ідзеш пад гэтым непаўторным ліўнем, вядзеш перад сабою і за сабою сто вясёлак, і ў гэтым шуме вечна маладое радасці хочацца звонка смяяцца, спяваць, пісаць выдатныя вершы!.. І падумаць толькі, што так адбываецца тут безупынна, заўсёды!..

Словы бывалай спадарожніцы можна прыняць, вядома, толькі ў адносным разуменні, з агаворкамі. А ўсё ж сказана трапна!

Бо як падлічыш, узважыш усё, што за семнаццаць дзён пабачана, адчута на другім баку планеты, дык ні самы вышэйшы з усіх небаскробаў, ні самы большы шум вады (Ніягара — па-іракезску — вялікі шум) не засланілі ў душы ні малога Стратфарда, ні яшчэ меншага Палерма.

...Добра быць пасланцом такой Радзімы, як наша, на сабе адчуваць, як яе любяць і паважаюць разумныя, чыстыя сэрцам людзі.

Добра вяртацца з дарогі, і не проста дахаты, а ў дом такі, як наш — савецкі!

Гэтыя думкі хвалявалі душу ў незабыўна радасны час вяртання, калі на змену бязмежнай і бяссоннай ночы за акном самалёта спачатку з'явілася першая зорачка, потым — над чорным, хмарным дном — зара і нарэшце — вялікае, роднае сонца.

З М Е С Т

1

2

3

Брыль, Іван Антонавіч.

Працяг размовы (апавяданні, замалёўкі, нарысы). Мінск, Дзяржвыд БССР, 1962.

На белорусском языке

Брыль Иван Антонович

Продолжение разговора

Государственное издательство БССР

Минск 1962

Рэдактар *О. Крайко*

Мастак 77. *Калінін*

Мастацкі рэдактар *Л. Прагін*

Тэхнічны рэдактар *Г. Калечыц*

Карэктары *М. Аўрамава, А. Сачкова*

АТ 09621. Здадзена ў набор 6/111 1962 г. Падп. да друку 7/VI 1962 г. Тыраж 7000 экз. Фармат $60X84^1/_{32}$

Фіз. друк. арк. 7. Уч.-выд. арк. 6,59. Зак. 897.

Цана 20 кап.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа

Галоўвыдата Міністэрства культуры БССР,

Мінск, Чырвоная, 23.

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

Свае водгукі і ўражанні аб гэтай кнізе просім дасылаць на адрас: г. Мінск, Ленінскі праспект, 79, Дзяржаўнае выдавецтва БССР, рэдакцыя мастацкай літаратуры.

20 к.

Дзяржаўнае выдавецтва БССР
МІНСК 1962